Учреждение образования
«Брестский государственнй университет имени А.С. Пушкина»

ЖУРНАЛИСТИКА
СЛОВЕСНОСТЬ
КУЛЬТУРА

Материалы
Международной заочной
научно-практической конференции
Брест, 1 марта 2017 года

Научное электронное издание

Брест
БрГУ имени А.С. Пушкина
2017

УДК 070+81:005.745
ББК 76.0+81.0$_{я}$431
Ж 92

Рекомендовано редакционно-издательским советом
Учреждения образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

Рецензенты:
заведующий кафедрой стилистики и литературного редактирования
Института журналистики БГУ, доктор филологических наук, профессор В.И. Ивченков;
заведующий кафедрой зарубежной журналистики и литературы
Института журналистики БГУ, доктор филологических наук, профессор Т.Н. Дасаева

Редакционная коллегия:
доцент кафедры русской литературы и журналистики БрГУ имени А.С. Пушкина,
кандидат филологических наук, доцент С.С. Клундук;
доцент кафедры иностранных языков по техническим специальностям БрГТУ,
кандидат филологических наук, доцент Н.Н. Домбровская;
доцент кафедры журналистики БрГУ имени А.С. Пушкина,
кандидат филологических наук, доцент И.В. Сацута;
преподаватель кафедры журналистики БрГУ имени А.С. Пушкина Е.В. Дебелая

Под общей редакцией
заведующего кафедрой русской литературы и журналистики БрГУ имени А.С. Пушкина,
кандидата филологических наук, доцента Л.В. Скибицкой

Ж **Журналистика** – словесность – культура : материалы Междунар. заочной науч.-практ. конф., Брест, 1 марта 2017 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол.: С. С. Клундук [и др.] ; под общ. ред. Л. В. Скибицкой. – Брест : БрГУ, 2017. – 373 с.

Данное научное электронное издание включает материалы Международной заочной научно-практической конференции «Журналистика – словесность – культура» (1 марта 2017 г., Брест). Проблемное поле издания составили актуальные вопросы современной журналистики и филологии. Тексты статей сопровождаются аннотацией и ключевыми словами на русском (белорусском) и английском языках.

Издание адресовано преподавателям и студентам учреждений высшего образования, журналистам-практикам. Ответственность за содержание статей несут авторы.

УДК 070+81:005.745
ББК 76.0+81.0$_{я}$431

© УО «Брестский государственный
университет имени А.С. Пушкина», 2017

СОДЕРЖАНИЕ

ЖУРНАЛИСТИКА – СЛОВЕСНОСТЬ – КУЛЬТУРА:
грани взаимодействия

Басава Г.І. Бар’еры і канфлікты ў міжкультурнай камунікацыі ва ўмовах глабалізацыі…… 7

Беценко Т.П. Канонические текстово-образные структуры как факты национальной фольклорной традиции в белорусском народнопесенном творчестве…… 14

Бут-Гусаім С.Ф. Мянушка як ацэначна-характарыстычны сродак у творах Міколы Сянкевіча і Анатоля Крэйдзіча……. 21

Гарбачык М.Р. Публіцыстычны тэкст: сутнасць, спецыфіка і функцыі…….. 26

Гоптова Л. Литературная и культурная жизнь белорусской эмиграции в межвоенной Чехословакии…… 29

Горностай Т.Л. Воспитание детей дошкольного возраста как ценность в культуре японского общества……. 35

Градюшко А.А. Региональная газета в условиях дигитализации медиапроизводства……. 40

Дамброўская Н.М. Асэнсаванне гістарычнага лёсу беларусаў у аповесці В. Адамчыка «Падарожжа на Буцафале»…….. 44

Десюкевич О., Курак А., Корчик А., Милькевич Н. Образ пожилых людей в белорусской журналистике…….. 48

Домбровский В.И., Сулейманова М.И. Фитнес-технологии в СМИ 53

Евсюкова О.Н. Ироничные высказывания как жанр современной словесности (к постановке проблемы)…….. 57

Епанчинцев Р.В., Зяблова А.В. История развития телеканала «Колыма-плюс»…… 60

Ермакович Л.И. Религиозный фактор в политической деятельности Льва Сапеги…….. 63

Исаева Е.В. Формы медиаобразования на уроках литературы в современной школе……..…….. 66

Касцючык В.М. Анамастычная прастора твораў Уладзіміра Глушакова…… 70

Клундук С.С., Якубук Н.Р. Спецыфіка публіцыстычнага дыскурсу друкаваных СМІ Брэсцкай вобласці…….. 75

Ковальчук О.Н. Общекультурный дискурс в «Журавлином крике» В. Быкова…… 81

Концевой М.П. Нелокальность региональных интернет-медиа….. 86
Крывалап А.Д. Эвалюцыя аўдыторыі медыя:
ад спажыўцоў да прасьюмераў……... 90
Кузьмінова А.Ю. Трансфармацыя тэлепрагляду:
спецыфіка камунікацыі ў мульціэкранным асяроддзі…….. 94
Левонюк А.Е. Картина мира в современной афористике…….. 99
Лещенко В.Л. Лингвостилистические особенности заголовков
текстов региональной прессы
(на материале издания «Вечерний Гродно») 103
Лысюк А.И. Интернет в контексте современных политических
противоборств…….. 107
Магерамова Ю.Ю., Аунбу А.В.
Специфические характеристики современного медиатекста
(на примере анализа телепередачи «Орёл и решка»……. 112
Макарэвіч А.В. Гісторыя прадпрымальніцтва ў Беларусі……. 116
Минчук И.И. Факторы выбора языкового кода
в белорусских телевизионных программах……... 119
Навасельцава Г.В. Паэтыка рамана Барыса Сачанкі «Чужое неба» 123
Нікановіч Д.А. Канкурэнтныя перавагі кантэнта прынт-медыя….. 127
Новоселова О.В. Факторы коммуникативной справедливости
медийных сообщений…….. 132
Петроченко А.Г. Коммуникационное измерение инновационного
проекта Республики Беларусь: региональный аспект…….. 136
Рамановіч П.С. Нацыянальна-дэмакратычны друк
у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)…….. 141
Рогалев В.А. Понятийный мир человека
в произведениях Памелы Трэверс о Мэри Поппинс…… 145
Roguska A. Media lokalne jako kapitał społeczny na podstawie badań
wśród studentów polskich i ukraińskich…… 149
Самусевіч В.М. Беларускі медыядыскурс
у працэсе фарміравання грамадскай думкі……... 163
Сацута І.У. Беларуска-ўкраінскі пратограф
кнігі К. Істоміна “Багавідная любоў”……..….. 168
Скибицкая Л.В. Публицистический дискурс
в структуре художественного текста……. 175
Скибицкая Л.В. Публицистический дискурс как способ
актуализации читательской рецепции художественного текста……. 180
Склейнис Г.А. Проблема соотношения публицистичности
и полемичности в русской литературе XIX в…… 185

Смаль В.Н. Жанровая и тематическая специфика
белорусской пьесы для молодежи…….. 188
Смаль В.Н. Литература как средство воспитания
гуманистических идеалов (на примере книги
А.М. Юдицкого «Беседа. “Встречи” и “Лица”: автографы»)……. 193
Смаль Вяч.М. Нацыянальны мастацка-публіцыстычны дыскурс:
вытокі, спецыфіка, традыцыі…….. 197
Смаль Вяч.М. Праблема рэцэпцыі тэмы рэпрэсій
у сучаснай беларускай літаратуры……. 205
Соколовская М.Г. Гендерные стратегии
в политических интернет-коммуникациях…… 212
Степанова А.П. Авторская сказка как литературный феномен
(на примере сказки Кэннета Грэма «Ветер в ивах»)……. 217
Ткаченко Ю.В. Культура и искусство в отражении радио:
практика приднестровских радиостанций……. 222
Харитонова С.В. Журналы для детей:
эстетико-педагогический аспект……. 227
Чернова Г.С. Ф. М. Достоевский
об общественной роли журналистики…… 232
Шевцова А.К. Лингвокогнитивная структура телеинтервью
в британской и русской культурах……. 237
Шелоник М.И. Трагические мотивы в рассказах А.П. Чехова
и «Солнце мертвых» И.С. Шмелева……... 242
Шепилева О.Е. Изменение семантической валентности слова
(наблюдения за поведением слова *пасхальный*)…… 247
Шибут И.П. Особенности построения
коммуникативного сообщения для современных медиа…….. 251
Яўдошына Л.І. Лінгвістычны аналіз
артыкула У. Караткевіча “Родная мова”…… 257

ЖУРНАЛИСТИКА – СЛОВЕСНОСТЬ – КУЛЬТУРА:
взгляд молодых исследователей

Атрощенко В.В. Интервью в современных СМИ…….. 261
Бугаева М. Фанфикшен: жанровая переакцентуация…… 265
Вовк Ю.Б. Жанровая модель рекламного текста
в периодической печати Брестчины……... 269
Герасимов Г. Региональная газета г. Вааса «Pohjalainen»
в контексте СМИ Финляндии……. 273

Гопта И. Проблематика истории Беларуси
в словацкой историографии и исторической периодике…….. 277
Гусева А.В. LINGUA BRSU:
факультетский блог в поисках медиаидентичности……. 284
Дисковец А.В. Пространственная организация
пьесы В. Сигарева «Пластилин»……. 288
Драгобецкая В. Рок-поэзия: генезис и функционирование…… 396
Дыдышка Т.П. Анамастыкон аўтабіяграфічнай прозы
Георгія Марчука і Аляксея Філатава…….. 300
Егоров К.А. Картина мира Л. Андреева
в социально-литературном дискурсе..... 305
Кароза Т.В. Буктрэйлеры ў школьнай практыцы
выкладання літаратуры……... 310
Картавцева А.В. Сравнительный анализ региональных
и всероссийских СМИ, освещающих вопросы искусства…… 315
Ковпанько Н.А. Жанровые разновидности очерка в региональной
периодической печати (на материале прессы Брестчины)……... 319
Кунахавец-Плявака А.І. Аб асновах эканамічнага менеджменту
мясцовага друку…… 323
Лощаков К. Фольклорные и мифологические мотивы
в цикле романов о дозорах С. Лукьяненко…… 327
Любчанка А.А. Экзістэнцыяльныя ідэі ў творчасці В. Гамбровіча. 330
Ноздрин-Плотницкая А.Л. Влияние жанровых приоритетов СМИ
на мировоззрение зрителя……... 335
Папоў А.С. Лексіка-фразеалагічная спецыфіка публіцыстычных
тэкстаў брэсцкіх газет……..... 339
Питкевич П.А. Альманах кинематографической прозы
как феномен гибридизации жанров современных видов искусства... 343
Попов А.С. Публицистический дискурс жанра «устной истории»... 348
Семенюк К.О. Жанр письма в системе
нестандартных аналитических жанровых моделей печатных СМИ... 352
Струг В. І. Жанраўтваральная роля онімаў у кантэксце навукова-
папулярнай літаратуры сучасных берасцейскіх аўтараў…… 356
Тарасова Е.В. Феномен страха в «военных» рассказах А. Бирса 360
Яковчук А.В. Социальная проблематика современной женской
прозы в жанре фэнтези: гендерные особенности…….. 365
Янукович О.В., Макаревич А.В. Инновационное развитие
Республики Беларусь……... 370

РАЗДЕЛ І. ЖУРНАЛИСТИКА – СЛОВЕСНОСТЬ – КУЛЬТУРА: ГРАНИ ВЗАИМОДЕЙСТВИЯ

УДК (81:008)

Г.І. Басава (Мінск, Інстытут журналістыкі БДУ)

БАР'ЕРЫ І КАНФЛІКТЫ Ў МІЖКУЛЬТУРНАЙ КАМУНІКАЦЫІ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

Ключевые слова: межкультурная коммуникация, глобализация, барьеры, конфликты, средства массовой информации, коммуникативная культура, стиль поведения.

Аннотация. Настоящие межкультурные отношения возможны только при условии понимания отличий не только своей, но и другой культуры. Очень важно развивать личность в контексте современной культуры, формировать у нее умение представлять родную страну в условиях межкультурной коммуникации, развивать коммуникативную культуру, осмысливать значение межкультурной коммуникации в процессе глобализации современного мира. Большую роль в этом процессе играют СМИ: их необходимо использовать для выработки общемировых ценностей и поиска оптимальных отношений между разными культурами.

У сучаснай сацыяльнай сітуацыі чалавечы капітал становіцца не менш, а можа, і больш значнай умовай развіцця грамадства, чым прыродныя багацці ці зручнае тэрытарыяльнае становішча краіны. Сярод фактараў, якія яго ствараюць, асобнае месца займае адукацыя як сістэма фарміравання інтэлектуальнага багацця нацыі, як адна з найважнейшых сфер вытворчасці інавацый і фарміравання ключавых кампетэнцый людзей. Сістэма адукацыі валодае шырокім наборам розных спосабаў і метадаў навучання міжкультурнай камунікацыі, найбольш эфектыўнымі сярод якіх з'яўляецца аналіз фактаў у выглядзе дыягностыкі канкрэтных сітуацый міжкультурных зносін і генерыравання ўсіх наяўных ведаў і навыкаў для пераадолення культурных непаразуменняў, стэрэатыпаў, бар'ераў, канфліктаў і г.д. Поспех акта міжкультурнай камунікацыі залежыць ад разумення ўдзельнікамі гэтых адрозненняў і ўсведамлення адзінства і мэтанакіраванасці ў дасягненні пастаўленай мэты. Прастора глабальнай культуры патрабуе агульных кодаў узаемадзеяння, г.зн. мовы, правіл паводзін, норм, каштоўнасцяў, усяго таго, што і ўтварае адзіную камунікатыўную прастору. Таму вельмі важна развіваць асобу ў кантэксце

сусветнай культуры, фарміраваць у яе ўменні прадстаўляць родную культуру і краіну ва ўмовах міжкультурнай камунікацыі, развіваць камунікатыўную культуру асобы. З гэтага вынікае, што ў працэсе міжкультурнай камунікацыі ўзаемадзеючыя бакі павінны зыходзіць з усведамлення далучанасці ўсіх да ўсяго, залежнасці адной культуры ад другой, разумення каштоўнасцяў іншых культур. Гэта забяспечвае ўзаемаразуменне, заснаванае на ўзаемапавазе, і не абмяжоўваецца толькі талерантнасцю ці цярплівасцю. Усведамленне гэтых аспектаў з'яўляецца асновай паспяховага і пазітыўнага міжкультурнага ўзаемадзеяння. Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыгрываюць сродкі масавай інфармацыі, якія неабходна выкарыстоўваць для выпрацоўкі агульнасусветных каштоўнасцяў і пошуку аптымальных суадносін розных культур. У сувязі з гэтым асабліва важным з'яўляецца фарміраванне навыкаў міжкультурнай камунікацыі, якія дазволяць індывіду ў іншай культуры ўбачыць не толькі тое, што адрознівае прадстаўнікоў розных культур, колькі тое, што збліжае і аб'ядноўвае іх. Гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі камуніканты навучацца інтэрпрэтаваць усё, што адбываецца ў працэсе міжкультурнай камунікацыі з пазіцыі іншай культуры, суадносіць існуючыя стэрэатыпы з асабістым вопытам і рабіць адэкватныя высновы. Гэта значыць, што эфектыўная міжкультурная камунікацыя не можа ўзнікнуць сама па сабе, ёй неабходна мэтанакіравана вучыцца. Сапраўдныя міжкультурныя зносіны магчымы толькі пры ўмове ўсведамлення адрозненняў і захавання не толькі сваіх, але і іншакультурных адметнасцяў і асаблівасцяў. Такім чынам, рэаліі апошняга часу сведчаць пра неабходнасць асэнсавання ролі міжкультурнай камунікацыі ў працэсе глабалізацыі сучаснага свету.

З пашырэннем міжкультурных кантактаў грамадству неабходны спецыялісты рознага профілю з высокім узроўнем сацыякультурнай кампетэнцыі, з навыкамі міжкультурнай камунікацыі, з развітым пачуццём эмпатыі і талерантнасці. Гэта тлумачыцца тым, што сучаснае грамадства характарызуецца памнажэннем, паскарэннем і глабалізацыяй камунікацыі. Рост камунікацыі дае новыя магчымасці, якія вызваляюць людзей ад папярэдніх абмежаванняў, механізмаў сацыяльнага кантролю і прымусу, ствараюць падставы для свабоднага развіцця асобы. Адсюль і супярэчнасць ролі і магчымасцяў сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі. Яны могуць садзейнічаць дыялогу і ўзбагачэнню культур, а могуць ператварыцца ў інструмент інфармацыйнага насілля. У значнай ступені гэта залежыць ад прафесійнай кампетэнтнасці журналістаў і спецыялістаў сродкаў масавай камунікацыі, істотнай часткай якой з'яўляецца кампетэнтнасць камунікатыўная.

Новыя формы тэлекамунікацый і з'яўленне міжнародных карпарацый, якія распараджаюцца сродкамі масавай інфармацыі, развіццё сучасных транспартных і электронных сродкаў сувязі спарадзілі немагчымыя ў мінулым культурныя патокі глабальнага маштабу, уключаючы рух аб'ектаў, знакаў і людзей як у рэгіянальнай, так і ў міжкантынентальнай прасторы. Тэхналагічная рэвалюцыя зрабіла магчымымі прамыя (непасрэдныя) кантакты мільёнаў людзей, прыналежных да розных культур. Міжкультурная камунікацыя грунтуецца на працэсе сімвалічнага ўзаемадзеяння паміж індывідамі і групамі, культурныя адрозненні якіх можна распазнаць. Успрыманне і стаўленне да гэтых адрозненняў уплываюць на выгляд, форму і вынік кантакту. Кожны ўдзельнік культурнага кантакту карыстаецца сваёй уласнай сістэмай правілаў, якія функцыянуюць такім чынам, каб дасланыя і атрыманыя пасланні маглі быць закадзіраваны і раскадзіраваны. Прыкметы міжкультурных адрозненняў могуць быць інтэрпрэтаваны як адрозненні вербальных і невербальных кодаў у спецыфічным кантэксце камунікацыі. На працэс інтэрпрэтацыі, акрамя культурных адрозненняў, уплываюць узрост, гендарная прыналежнасць, прафесія, сацыяльны статус камуніканта. Таму ступень міжкультурнасці кожнага канкрэтнага акта камунікацыі звязана з талерантнасцю, прадпрымальнасцю, асабістым вопытам яго ўдзельнікаў. У сучасных умовах працэсы глабалізацыі і міжкультурнай камунікацыі неаддзельныя адно ад аднаго.

Сярод фактараў, якія вызначаюць асаблівасці міжкультурнай камунікацыі ва ўмовах глабалізацыі, можна вылучыць наступныя:

– змяненне канцэпцыі прасторы і часу;

– рост культурнага ўзаемадзеяння;

– з'яўленне новых суб'ектаў (актараў) транснацыянальных сувязей;

– павелічэнне ўзаемазалежнасці і ўзаемаўплыву розных культур;

– рэлятывізацыя ідэнтычнасці чалавека [1, с. 10].

Вядома, што міжкультурныя кантакты спараджаюць мноства праблем, якія абумоўлены несупадзеннем норм, каштоўнасцяў, асаблівасцяў светапогляду партнёраў і інш. Яны не могуць быць элімінаваны ў працэсе інтэракцыі, таму паспяховасць узаемадзеяння залежыць ад дасягнення кансенсусу паводле правіл і схем камунікацыі, якія не нясуць пагрозы ўціску для інтарэсаў прадстаўнікоў розных культур. Непазбежнай становіцца адаптацыя традыцыйных мадэляў монакультурнай інтэракцыі да новага сацыяльнага асяроддзя на фоне захавання культурнай разнастайнасці свету. Складанасці, якія ўзнікаюць падчас зносін, у тым ліку прадстаўнікоў розных культур, атрымалі назву бар'ераў (праблем, якія ўзнікаюць у працэсе ўзаемадзеяння і якія зніжаюць эфектыўнасць камунікацыі). Існуючыя камунікатыўныя праблемы трансфармуюцца ў бар'еры пры іх

устойлівым узнаўленні на працягу пэўнага часу. Ускосным індыкатарам наяўнасці бар'ераў можа служыць іх адлюстраванне ў свядомасці ўдзельнікаў інтэракцыі. Увагі патрабуе вывучэнне бар'ераў камунікацыі прадстаўнікоў розных сацыякультурных сістэм, якія могуць выклікаць культурны і камунікатыўны шок. Асаблівасці нацыянальнай і этнічнай свядомасці прадстаўнікоў розных культур часта выступаюць бар'ерамі міжкультурных узаемадзеянняў. Цікавасць у гэтым кантэксце ўяўляюць наступныя аспекты свядомасці:

– тэндэнцыя да этнацэнтрызму – схільнасць негатыўна ацэньваць прадстаўнікоў іншай культуры скрозь уласную прызму стандартаў;

– стэрэатыпізацыя этнічнай свядомасці, якая праяўляецца ў фарміраванні спрошчаных вобразаў прадстаўнікоў сваёй і іншых культур;

– забабоны як вынік селектыўных (абраных) уключэнняў у працэс міжкультурных кантактаў, у тым ліку праз пачуцці, негатыўны мінулы вопыт і да т.п. Гэтыя з'явы асабліва важныя як патэнцыяльныя бар'еры міжкультурных узаемадзеянняў на першых стадыях інтэракцыі ў сітуацыі няпоўнай інфармацыі пра партнёраў.

Невербальныя паводзіны таксама выконваюць важныя функцыі ў працэсе міжкультурнай камунікацыі, аднак сімвалы, якія выкарыстоўваюцца, могуць мець рознае значэнне для яе ўдзельнікаў. Іх несупадзенне можа аказваць уплыў на эфектыўнасць інтэракцыі. Нягледзячы на відавочнае адрозненне невербальных паводзін прадстаўнікоў розных культур, яно не заўсёды ўспрымаецца як сур'ёзны бар'ер міжкультурных узаемадзеянняў. У большасці выпадкаў такое несупадзенне выклікае спачатку здзіўленне і неспакой, крыху шакіруе, здаецца дзіўным і незвычайным. Аднак з часам адбываецца прывыканне да іншай сітуацыі, узнаўленне (часта міжвольнае) знакаў, запазычаных у партнёраў.

Адрозненні каштоўнасных арыентацый удзельнікаў міжкультурнага ўзаемадзеяння, абумоўленыя дыферэнцыяцыяй сістэм каштоўнасцяў, могуць аказваць уплыў на яго эфектыўнасць. І асноўнымі бар'ерамі, якія зніжаюць эфектыўнасць інтэракцыі, з'яўляюцца адрозненні кагнітыўных схем, што выкарыстоўваюцца прадстаўнікамі розных культур. Найбольш ярка дыферэнцыяцыя мадэляў успрымання праяўляецца пры сутыкненні з іншым светапоглядам, светаадчуваннем і да т.п.

Узнікненне канфліктаў тлумачыцца самымі рознымі прычынамі. У прыватнасці, існуе меркаванне, што варожасць і прадузятасць паміж людзьмі адвечныя і карэняцца ў самой прыродзе чалавека, у яго інстынктыўнай «непрыязнасці да адрозненняў». Даследаванні абвяргаюць гэтую гіпотэзу, даказваючы, што як варожасць да іншаземцаў, так і прадузятасць супраць нейкай канкрэтнай народнасці не з'яўляюцца ўсеагульнымі. Яны

ўзнікаюць пад уплывам прычын сацыяльнага характару. Гэтая выснова ў поўнай меры адносіцца і да канфліктаў, якія носяць міжкультурны характар. Дыяпазон прычын узнікнення міжкультурных канфліктаў, як і канфліктаў наогул, гранічна шырокі: у аснове канфлікту могуць ляжаць не толькі недастатковыя веды мовы і звязанае з гэтым простае неразуменне партнёра па камунікацыі, але і больш глыбокія прычыны, якія да канца не ўсведамляюцца самімі ўдзельнікамі камунікацыі. Узніклыя канфлікты нельга разглядаць толькі як дэструктыўны бок працэсу камунікацыі, яны маюць таксама і свае пазітыўныя аспекты. Канфлікт можна патлумачыць як любы від процiборства або несупадзення інтарэсаў. Ён мае дынамічны характар і ўзнікае ў самым канцы шэрагу падзей, што развіваюцца, зыходзячы з наяўных абставін (становішча рэчаў – узнікненне праблемы – канфлікт). Узнікненне канфлікту зусім не азначае перапыненне адносін паміж камунікантамі; за гэтым, хутчэй за ўсё, паўстае магчымасць адыходу ад наяўнай мадэлі камунікацыі, прычым далейшае развіццё адносін магчыма як у пазітыўным, так і ў негатыўным накірунках.

У працэсе камунікацыі з прадстаўнікамі іншых культур даволі часта прычынамі напружанасці і канфлікту з’яўляюцца памылкі атрыбуцыі. Веданне або няведанне культурных асаблівасцяў, уключаючы рэлігійныя і ідэалагічныя аспекты, мае велізарны ўплыў на пабудову атрыбуцыі. Валоданне такой інфармацыяй дазваляе многае асэнсаваць, што з’яўляецца пажаданым і на што накладваецца табу ў канкрэтнай культуры. У жыцці “чыста” міжкультурныя канфлікты не сустракаюцца. Адносіны прадугледжваюць наяўнасць мноства ўзаемапранікальных канфліктаў, і было б памылковым лічыць, што ў аснове любога канфлікту паміж прадстаўнікамі розных культур ляжыць няведанне культурных асаблівасцяў партнёра па камунікацыі. Гэта спараджае пытанні ўлады або статусу, сацыяльнага расслаення, канфлікту пакаленняў і г.д. Сучасная канфлікталогія сцвярджае, што любы канфлікт можна ўрэгуляваць або значна аслабіць, калі свядома прытрымлівацца аднаго з пяці стыляў паводзін.

1. Спаборніцтва (“мае рацыю той, хто мацнейшы”) – актыўны, не накіраваны на супрацоўніцтва стыль. Гэтая манера паводзін неабходна ў такой сітуацыі, калі адзін з бакоў з вялікім запалам ідзе да сваіх мэт і імкнецца дзейнічаць у сваіх інтарэсах, незалежна ад таго, як гэта паўплывае на іншых. Падобны спосаб дапушчэння канфлікту, што суправаджаецца ўзнікненнем сітуацыі «перамога – паражэнне», выкарыстаннем спаборніцтва і гульні з пазіцыі сілы для дасягнення сваіх мэт, зводзіцца да падпарадкавання аднаго боку іншаму.

2. Супрацоўніцтва (“давайце вырашым гэта разам”) – актыўны, накіраваны на супрацоўніцтва стыль. У дадзенай сітуацыі абодва бакі кан-

флікту імкнуцца да дасягнення сваіх мэт. Падобная манера паводзін характарызуецца імкненнем вырашыць праблему, высветліць разыходжанні, абмяняцца інфармацыяй. Удзельнікі бачаць у канфлікце стымул да канструктыўных рашэнняў, якія выходзяць за межы дадзенай канфліктнай сітуацыі. Паколькі выхадам з канфлікту лічыцца пошук рашэння, выгаднага абодвум бакам, такая стратэгія часта называецца падыходам "перамога – перамога".

3. Сыход ад канфлікту ("пакіньце мяне ў спакоі") – пасіўны, не накіраваны на супрацоўніцтва стыль. Адзін з бакоў можа прызнаваць, што канфлікт мае месца, але выбірае манеру паводзін, якая пазбягае канфлікту або заглушае яго. Удзельнікі канфлікту спадзяюцца, што ён вырашыцца сам па сабе, таму відавочнасць канфліктнай сітуацыі ўвесь час вуалюецца, выкарыстоўваюцца розныя паўмеры, каб заглушыць канфлікт, або схаваныя меры для таго, каб пазбегнуць больш моцнай канфрантацыі.

4. Падатлівасць ("толькі пасля вас") – пасіўны, накіраваны на супрацоўніцтва стыль. У асобных выпадках адзін з бакоў канфлікту можа паспрабаваць улагодзіць іншы бок і паставіць яго інтарэсы вышэй за ўласныя. Падобнае імкненне супакоіць іншага прадугледжвае падатлівасць, падпарадкаванне і згоду.

5. Кампраміс ("давайце пойдзем адзін аднаму насустрач") – пры гэтай манеры паводзін абодва бакі канфлікту ідуць на ўзаемныя саступкі, часткова адмаўляючыся ад сваіх патрабаванняў. У гэтым выпадку ніхто не перамагае і ніхто не прайграе. Падобнаму выхаду з канфлікту папярэднічаюць перамовы, пошукі варыянтаў і шляхоў да ўзаемавыгаднага пагаднення.

Як і любы іншы аспект міжкультурнай камунікацыі, стыль вырашэння канфліктаў вызначаецца асаблівасцямі культур іх удзельнікаў. Так, адной з галоўных норм дзелавога супрацоўніцтва ў Японіі з'яўляецца практыка перамоў пры вырашэнні розных складаных пытанняў. Многія віды дзелавога супрацоўніцтва ажыццяўляюцца ў гэтай краіне на аснове вуснай дамоўленасці. Амерыканцы ж не ўяўляюць, як можна сесці за стол і спакойна размаўляць з партнёрамі, якія не выконваюць сваіх абавязкаў. Значныя культурныя адрозненні можна назіраць у метадах вырашэння канфлікту паміж брытанскімі і кітайскімі менеджарамі: кітайцы аддаюць перавагу больш пасіўнаму стылю паводзін (кампраміс або падатлівасць), а брытанцам больш уласцівы актыўны стыль (супрацоўніцтва або спаборніцтва). Паводзіны кітайцаў тлумачацца іх імкненнем да гармоніі, узаемаадносіны людзей у кітайскім грамадстве грунтуюцца на ўсведамленні, што чалавек існуе выключна як частка сям'і ці клана. Гэта патрабуе ад індывіда павагі да грамадскай іерархіі. Неабходнасць пашаны да старэйшых арыентуе кітайцаў на

падпарадкаванне ўладзе і стрымліванне агрэсіі. Ідэя гармоніі падштурхоўвае іх заўсёды шукаць залатую сярэдзіну і вучыць дасягаць раўнавагу з дапамогай кантролю эмоцый.

Сапраўдныя міжкультурныя зносіны магчымы толькі пры ўмове ўсведамлення адрозненняў і захавання не толькі сваіх, але і іншакультурных адметнасцяў і асаблівасцяў. Такім чынам, рэаліі апошняга часу сведчаць пра неабходнасць асэнсавання ролі міжкультурнай камунікацыі ў працэсе глабалізацыі сучаснага свету. Сапраўдныя міжкультурныя зносіны магчымы толькі пры ўмове ўсведамлення адрозненняў і захавання не толькі сваіх, але і іншакультурных адметнасцяў і асаблівасцяў. Такім чынам, новая парадыгма адукацыі заклікана садзейнічаць асобе ў асэнсаванні сябе ў сацыяльнай агульнасці, фарміраванню ўласнага культарнага вобраза і вобліку, адэкватных і дастатковых ведаў пра карціну свету, індывідуальных стратэгій і стратэгій у разуменні іншых, чаму садзейнічае навучанне міжкультурнай камунікацыі. Значэнне міжкультурнага навучання ў апошні час узрастае шматмерна. Чым больш поўнае і шматстайнае яно будзе, тым больш лёгка індывідуум зможа прыстасавацца да зменлівых умоў жыцця.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Тангалычева, Р. К. Теории и кейсы межкультурной коммуникации в условиях глобализации / Р. К. Тангалычева. – СПб. : Алетейя, 2012. – 247 с.

Hanna Basova (Minsk)

BARRIERS AND CONFLICTS IN INTERCULTURAL COMMUNICATION IN THE CONTEXT OF GLOBALIZATION

Summary. The real cross-cultural relations are possible only under condition of understanding the differences not only own, but also a different culture. It is important to develop the personality in the context of contemporary culture, to form ability to represent home country in terms of intercultural communication, to develop communicative culture, to comprehend the value of cross-cultural communication in the process of globalization of the modern world. Media play a major role in this process: they must be used for the development of global values and searching of the best relationships between different cultures.

Keywords: intercultural communication, globalization, barriers, conflicts, media, communicative culture, style of behavior.

К содержанию

УДК 801.81 + 811. 161.2

Т.П. Беценко (Сумы, Украина, СГПУ)

КАНОНИЧЕСКИЕ ТЕКСТОВО-ОБРАЗНЫЕ СТРУКТУРЫ КАК ФАКТЫ НАЦИОНАЛЬНОЙ ФОЛЬКЛОРНОЙ ТРАДИЦИИ В БЕЛОРУССКОМ НАРОДНОПЕСЕННОМ ТВОРЧЕСТВЕ

Ключевые слова: язык белорусского народного творчества, язык фольклора, канонические структуры народных песенных текстов, атрибутивные формулы, субстантивные конструкции, вербальные структуры, адвербиальные текстово-образные универсалии, предикативные текстово-образные единицы.

Аннотация. Статья посвящена рассмотрению понятия каноничности (формульности, универсальности) языкового текстообразования белорусского песенного фольклора. Канонические структуры осмысливаются как традиционные, закономерные единицы, которые формируют национально-песенный словесно-образный континуум. Представлена попытка в общих чертах, сжато проанализировать текстово-образные канонические структуры, характерные для белорусского народного творчества. Выделены атрибутивные, субстантивные, вербальные, адвербиальные, предикативные текстово-образные универсалии – формулы. Примеры рассматриваемых единиц приведены из первоисточников. Для сравнения предложен иллюстративный материал из украинского песенного фольклора. Резюмируется мысль о древности, самобытности белорусской народнопоэтической культуры песнетворчества, что подтверждается богатым и разнообразным языковым материалом, в частности, синтаксическими структурами – единицами наивысшего уровня языка.

Народнопоэтическое творчество является той языково-культурной средой, которая тесно взаимосвязана с народным мышлением, мировоззрением, бытовыми представлениями, т.е. со всеми сторонами жизнедеятельности этноса. Актуальность исследования состоит в том, чтобы убедительно засвидетельствовать языковые каноны народного песнетворчества, наблюдаемые в белорусском фольклорно-песенном континууме, которые служат доказательством самобытности, оригинальности словесно-образной песенной культуры белорусов на фоне восточнославянского единства.

Каноничность словесно-образной организации народнопесенных произведений рассматриваем как фольклорную категорию, свидетельствующую о сложившейся языковой традиции и вместе с тем – о своеобразии, самобытности, оригинальности отдельной культуры, в частности белорусской. Каноничность понимаем и как традиционность, формульность, универсальность. Без канонов текстообразования немыслимо существова-

ние народного творчества. Поэтому традиция – свидетельствование бытия этнической культурной реальности.

Наличие текстово-образных формул (универсалий) – показатель устойчивой, сформировавшейся по правилам и законам песенной традиции, закрепленность последней за отдельным национально-языковым континуумом. К сожалению, нам известна только одна работа, посвященная изучению формульного состава белорусского народного творчества, – статья Т.А. Ивахненко [5]. В исследовании глубоко и конкретно изложен материал, подтверждающий факт формульности народнопесенного белорусского творчества.

Наблюдения за текстово-образной организацией народнопесенной культуры белорусов дают возможность констатировать, что народное творчество (по параметрам художественности, языковой эстетики, языкового оформления, по форме и содержанию) – явление неповторяющееся, отличительное от других культур восточных славян – украинской и русской (хотя иногда и соприкасающееся, в частности, по нашим убеждениям, с украинской песенной традицией; но это соприкосновение независимое, тяготеющее к родственности, близости и вместе с тем – отчетливо самобытное, уникальное). Итак, формульность, т.е. текстово-образная универсальность – факт реальной языковой текстовой организации фольклорных произведений.

В белорусской народнопесенной традиции фиксируем характерные разновидности формул – текстово-образных универсалий. Канонические текстово-образные универсалии представлены атрибутивными, субстантивными, вербальными, адвербиальными, предикативными структурами.

Атрибутивные конструкции – структурные образования типа «прилагательное + существительное». Распространенные модели – контаминации прилагательного с семантикой цвета и существительного, обозначающего часть тела человека: *русае касы* [3, с. 40], *з белых плеч* [4, с. 81], *белыя ручкі* [3, с. 43]; прилагательного с цветовым признаком и существительного с семантикой ландшафта местности, рельефа: *зялёнымі лугамі* [3, с. 27], *зялёну дубраву* [3, с. 287]; прилагательного-цветообозначения и существительного – названия предмета: *белі ручнічкі* [3, с. 41], *чорны шоўк* [3, с. 53], *белы жэмчуг* [3, с. 53], *зялёную скрыню* [3, с. 281]; прилагательного-цветообозначения и существительного-флорономена: *сінія васілёчкі* [3, с. 41], *зялён явор* [3, с. 27]; прилагательного-цветообозначения и существительного-фаунонима: *вараны конік* [3, с. 296], *зязюльку шэрую* [3, с. 48], *барашачка чорненькі* [4, с. 415], *сізы голубы* [3, с. 53], *шэра вутачка* [4, с. 207], *белыя лябедкі* [3, с. 54]; прилагательного со значением размера и существительного – названия части тела, особенностей человека: *дробнія слезкі* [3, с. 9] и др.

В белорусском народном творчестве естественными являются универсальные для славянского фольклора формулы: *буйны ветры* [3, с. 37], *дробны дажджы* [3, с. 37], *маманька родная* [3, с. 51, *дзіўненькі сон* [3, с. 54], *ясен сокал* [3, с. 54], *холодная вада* [3, с. 290], *драмучымі лясамі* [3, с. 427], *цёмная ночачка* [3, с. 428], *ясен месяц* [3, с. 428], *луг зялёны* [4, с. 47], *быстрая рака* [4, с. 206], *быстра вода* [4, с. 80]. В украинской народнопесенной традиции фиксируем употребление аналогичных структур: *бистрі води* [6, с. 327, 333], *біле каміння* [6, с. 163, 183, 188, 197, 202], *білий камінь* [6, с. 109, 124, 125, 128, 312, 314, 315], *білі руки* [6, с. 145, 284], *буйні вітри* [6, с. 176, 291], *дрібен дощик* [6, с. 107, 108, 223, 254], *дрібні сльози* [6, с. 94, 96, 97, 182, 184, 193, 265], *зелені явори* [6, с. 161, 206], *зелена діброва* [6, с. 363, 378], *холодна вода* [6, с. 91, 92, 93, 94, 95, 97], *ясні соколи* [6, с. 103, 154], *ясне сонце* [6, с. 138, 182], *темная нічка* [6, с. 206, 208].

Только в белорусском фольклоре засвидетельствованы формульные структуры *зялёная ліпка* [4, с. 146], *ліпачка кудрявая* [4, с. 146], *бярозка белая* [4, с. 147], *белая бярозка караністая* [4, с. 402], *яленчанка зеляная* [4, с. 278], *зязюлечка баравая* [4, с. 223].

Универсальность подобных словосочетаний усматриваем в том, что, во-первых, это самые простые структуры и самые употребляемые в языке конструкции; во-вторых, это единицы, обладающие эстетической окраской, образностью, тропеические по своей сущности; в-третьих, национально обусловленные. Сравните, например, особенности функционирования атрибутивных единиц в украинских народных думах: *бистра куля* [6, с. 93], *бистра річка* [6, с. 276], *бистра супротивна хвиля* [6, с. 386, 388], *бистра хвиля* [6, с 98, 108, 110, 112, 395, 397, 398], *бистрі ріки-озера* [6, с. 300], *прудкі річки* [6, с. 332], *битий гординський шлях* [6, с. 74], *бідні невільники* [6, с. 13], *бідні козаки* [6, с. 95, 97, 126, 209], *запорозьке войско* [6, с. 149], *сизопірі орли* [6, с. 156], *превоздобне дерево* [6, с. 116], *православні християни* [6, с. 115, 165, 181].

Атрибутивные конструкции являются непосредственным отображением неязыковых фактов – картины мира этноса.

Субстантивные текстово-образные формулы – сочетания существительного с существительным. В белорусском народном творчестве – это сложные слова: *рута-мята* [3, с. 36], *зязюлька-кукушка* [3, с. 47], *мед-гарэланьку* [3, с. 50], *мед-віно* [3, с. 50], *мурагу-сена* [3, с. 287], *выно-мед* [3, с. 95], *паніч-королік* [3, с. 295], *сад-віноград* [3, с. 296], *званы-калаколы* [3, с. 382], *барі-сосна* [4, с. 81], *шчуцы-рыбаньцы* [4, с. 179], *каліна-маліна* [4, с. 222]. Подобные контаминированные единицы засвидетельствованы в украинских народных думах: *слава-рицарство* [6, с. 231, 232, 236], *сокіл-брат* [6, с. 114], *срібло-злото* [6, с. 100], *час-пора* [6, с. 305], *щастя-доля*

[6, с.127, 155, 201, 212, 361], *щука-риба* [6, с. 317], *шлях-дорога* [6, с. 367]. Можем с уверенностью утверждать, что в языке фольклора двух народов сложные существительные максимально идентичны.

Сложные слова составляют неотъемлемую часть народнопесенной словесной культуры славян. Природа сложного слова связана с представлениями в сознании человека о многоаспектности, разноуровневости, всеобъемлемости понятия, его разностороннего видения индивидом – носителем этнической культуры. Поэтому сложное слово в фольклоре понимаем как неоднозначное, разноаспектное поэтизирование реальных вещей, попытку образно обыграть их детали, признаки, характеристики, указать на взаимосвязь, подчеркнуть частное и общее как единое целое в понимании сущности предмета. Для фольклора сложная словесно-образная конструкция – речемыслительный способ реализации многоаспектности видения мира, сегментация и синтез описываемого явления, предмета.

Вербальные текстово-образные формулы-универсалии в белорусской фольклорной традиции также подчинены законам канонической внутренней архитектоники. К этим формулам принадлежат сложные глагольные конструкции типа *сячыце-рубайце* [3, с. 285], *стучыць-гручыць* [3, с. 297, 298], *лець-палець* [2, с. 570], *едзь-паедзь* [3, с. 370] и структуры, образованные по модели «глагол + глагол»: *не гнися*, *не ламайся* [3, с. 433], *хоць маем, хоць не маем* [4, с. 427], *не гніся, не ламіся* [3, с. 432], *хаджу, малачу* [4, с. 80]. Аналогичную картину словоупотребления наблюдаем в песенном народном украинском творчестве: *сікти-рубати* [6, с. 163, 164, 177], *бере-хапає* [6, с. 203, 205], *бити-карати* [6, с. 218], *бігти-доганяти* [6, с. 216], *грати-вигравати* [6, с. 98]. Как убеждаемся, принцип конструирования структур – тот же, компонентный состав близкий, сходный, но в большинстве случаев не одинаковый, не повторяющийся.

Интерес представляют адвербиальные текстово-образные универсалии. Предназначение этих структур – поэтизировать пространственные, временные и другие характеристики измерения бытия. Формульные структуры с семантикой места указывают на местоположение описываемого предмета, явления, события, на направление, движение к определенному предмету в пространстве и проч. Пространство в фольклоре, как и время, – реальное обобщенное бытие, мыслящееся в тесной связи с человеком. Для белорусского носителя культуры актуальным является макропространство: на *Русь, на Украіну* [3, с. 282], *на ціхім Дунаі* [3, с. 282], *за ціхім Дунаем* [3, с. 288], *на Украіну* [3, с. 282], *на Украіну* [3, с. 281], *на Русь* [3, с. 283], на *моры на сінюсенькым* [3, с. 37], *з поля* [3, с. 37], *па Дунаечку* [4, с. 126, 127], *на рыночку* [3, с. 36], *у луг, у бор* [3, с. 40], *у крыніцу* [3, с. 41], *у садзе* [3, с. 41], *па саду* [3, с. 42], *у садочку* [3, с 42], *да з гары на даліну* [3, с. 283], *пад круту гару* [3, с. 430],

да на моры, на моры, на сіненькім возеры [3, с. 283], *у бору* [3, с. 289], *у чыстым полі* [3, с. 299], *за лесам* [3, с. 302], па *чысту полю* [3, с. 302], *зарой, за гарой круценькай* [3, с. 392], *за гумном*, *за новенькім* [3, с. 289], *чэрэз тры лясы* [3, с. 303], *чэрэз тры сялы* [3, с. 303], *між гор, між даліны* [3, с. 292], *да й у чыстым у полі, да й на бітому шляху* [3, с. 430], а также и микропространство: *на камены на бялюсенькым* [3, с. 37], *у каморы* [3, с. 42], *у хаце* [3, с. 48], *по сянех* [3, с. 51], *на бярозах* [3, с. 50], *на дварэ* [3, с. 293], *каля коніка* [3, с. 287], на *коніку* [3, с. 55], *у новым калодзежы* [3, с. 281], *з-пад крыніцы* [3, с. 290], на *масту* [4, с. 427]. Сравните также употребление отдельных адвербиальных текстово-образных конструкций, характерных для украинских народных дум: з *чужої сторони* [6, с. 116], *із чистого поля* [6, с. 312], *з криниці Салтанки* [6, с. 94, 96], *із чужого дому* [6, с. 360], у *тихий Дунай* [6, с. 409], *в чисте поле, в широке роздолля* [6, с. 216], *через темні луги* [6, с. 328], *через високі ліси* [6, с. 338].

Поэтизацию пространства связываем с намерением песнетворцев зафиксировать местопребывание, местонахождение существенных для бытия реалий духовной и материальной жизни человека. Локус является частью этноса, составляющей мировоззрения индивидов, компонентом национальной (генетической) памяти. Для белорусов важными локативами считаем *лес, сад, поле, бор, гай, гора, дубрава, море* и др. Для украинцев – *степь, поле, лес, сад, бор, гора, дубрава, море* и др. Сходство пространственного обозначения действительности и в белорусском, и в украинском фольклоре очевидное.

Время в словесно-образном оформлении тоже является обязательным показателем национально-образного видения бытия. Для белорусского носителя языковой культуры характерным считаем время, которое определено словами *ранюсенько* [3, с 51], *з суботкі на нядзельку* [3, с. 5], у *суботу на нядзелю* [3, с. 52], з *суботкі на нядзельку* [3, с. 53], *у нядзелю рана* [3, с. 55], *у нядзелечку* [3, с. 56], з суботы на нядзелю [3, с. 56, 57], *у нядзелю да рана параненька* [3, с. 280], у *надзельку рана* [3, с. 280], *ой, рана, рана, на зарэ* [3, с. 429]. Для украинской фольклорной традиции характерны конструкции *ранньою зорею* [6, с. 325], *у святую неділеньку рано-пораненьку* [6, с. 190, 366, 367], *до схід сонця* [6, с. 359], *в неділю рано-пораненьку з світовою зорею* [6, с. 340, 341], *ясною зорею* [6, с. 206].

Текстово-образные предикативные конструкции-универсалии в белорусском народном творчестве – структуры, соотносительные с предложениями. Такие единицы достаточно активизированы. Например: *дробныя слезкі роніць* [3, с. 43], *дробны дажджы паліваюць* [3, с. 36], *коніка сядлае* [3, с. 47], *зязюлька кукавала* [3, с.48], *по сянех пахадзіла* [3, с. 51], *сон сасніла* [3, с. 53], *сон відзела* [3, с. 53], *на коніку сядзіць* [3, с. 55], *цякла рэчачка* [3, с. 56], *русая*

каса да да паяса [3, с. 280], *два конікі да ваду пілі* [3, с. 280], *коні поюць* [3, с. *289], вада ручаем цячэ* [3, с. *290], вада цячэ холодная* [3, с. 290], *вадзічка ручаем бяжыць* [3, с. 292], *быстра рэчка сячэ* [3, с. 294], *по чысту полю стралою імчыся* [3, с. 302], *не вей, вецер* [3, с. 431], *кала рэчанькі хадзіла*, *кала быстрае гуляла* [4, с. 390], *я над ракою стаяла, белыя ручкі умывала* [4, с. 391], *з адной гары вецер вее, з-пад другой гары павявае* [4, с. 279], *кукавала зязюля* [4, с. 222] и др. По своей сущности подобные текстово-образные универсалии, на наш взгляд, родственны эпическим формулам песен славянского фольклора. Ср. в украинских народных думах: *став з Дніпра тихий вітер повівати* [6, с. 388], *будуть козаки чистим полем гуляти* [6, с. 89], *дрібен дощик накрапає* [6, с. 254], *став буйний вітер повівати* [6, с.186], *не буйні вітри повівали* [6, с. 79].

Фольклорно-песенное творчество – осмысление в национально-культурном воплощении с помощью этнознаковых единиц, в которых кодируются представления этноса о бытии, сущности народно-культурной действительности. Доминанты этой действительности – концепты национальной культуры – тоже требуют пристального внимания и компаративных славянских студий, что важно для выяснения универсального и уникального, самобытного в народнопесенном творчестве белорусов.

Как видим, белорусское фольклорно-песенное творчество – формульное по своему составу. Рассмотренные формульные канонические структуры представлены лишь отдельными моделями, в общих чертах. Но даже на незначительных примерах можно наблюдать прочно сложившуюся языковую песенную традицию в белорусском фольклоре. Изучение фольклорно-песенных текстообразующих элементов фольклорного континуума белорусов очень важно. Подробная, детализированная классификация универсально-формульных образований даст возможность сравнить язык древней песенной традиции белорусов с языком народного творчества восточнославянских культур и пр. Подобные исследования призваны засвидетельствовать факт самобытного развития белорусского народного творчества.

Список использованной литературы

1. Беценко, Т. П. Мова українських народних дум : словник текстово-образних одиниць / Т. П. Беценко. – Суми, 2016. – 124 с.

2. Беценко, Т. П. Текстово-образні універсалії – системні одиниці / Т. П. Беценко // Карповские науч. чт. : сб. науч. ст : в 2 ч. – Вып. 6. – Ч. 1. – Минск, 2012. – С.12–25.

3. Вяселле. Песні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; склад., аўтар прадмовы Л. А. Малаш ; рэдкал. : А. С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – Кн. 1 / рэд. : М. Я. Грынблат, А. С. Фядосік ; уступ. артыкул А. С. Фядосіка. – 678 с.

4. Восеньскія і талочныя песні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; склад., аўтар уступ. арт. А. С. Ліс ; уклад. і каменц. талочных песень

С. Т. Асташэвіча ; рэд. тома А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 677 с.

5. Івахненка, Т. А. Славесныя формулы і кампазіцыйная схема каляндарна-абрадавых песенных тэкстаў / Т. А. Івахненка // Веснік Беларускага дзярж. ун-та. – 2004. – № 2. – С. 37–43.

6. Украинские народные думы / изд. подгот. : Б. П. Кирдан ; отв. ред.: В. М. Гацак ; АН СССР, Ин-т мировой лит. им. А.М. Горького. – М. : Наука, 1972. – 600 с.

Tatiana Betsenko (Sumy, Ukraine)

THE CANONICAL TEXT-SHAPED STRUCTURE AS FACTS OF NATIONAL FOLK TRADITION IN BELARUSIAN FOLK- SONG ART

Keywords: Language of Belarusian folk art, language of folklore, canonical structures of folk song texts, attributive formulas, substantive constructions, verbal structures, adverbial text-shaped universals, predicative text-shaped units.

Summary. The article discusses the concept of canonical (by formulas, universal) language education text Belarusian folk songs. Canonical structures are interpreted as traditional, regular units that form a national-song verbal-image continuum. An attempt is made in general to briefly analyze the text-shaped canonical structures characteristic of Belarusian folk art. Attributive, substantive, verbal, adverbial, predicative text-shaped universals – formulas are distinguished. Examples of the units considered are listed from the original sources. For comparison, the illustrative material from Ukrainian folklore is offered. The idea of the antiquity and originality of the Belorussian folk poetic culture of song production is summarized, which is confirmed by a rich and diverse language material, in particular – syntactic structures – units of the highest level of language.

К содержанию

УДК 808.26 – 541.2

С.Ф. Бут-Гусаім (Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна)

МЯНУШКА ЯК АЦЭНАЧНА-ХАРАКТАРЫСТЫЧНЫ СРОДАК У ТВОРАХ МІКОЛЫ СЯНКЕВІЧА І АНАТОЛЯ КРЭЙДЗІЧА

Ключавыя словы: онім, антрапонім, паэтонім, мянушка, індывідуальная мянушка, сямейна-родавая мянушка.

Анатацыя. У артыкуле прааналізаваны ўжытыя ў прозе берасцейскіх пісьменнікаў Анатоля Крэйдзіча і Мікалая Сянкевіча мянушкі як сродак ідэнтыфікацыі, характарыстыкі і ацэнкі персанажаў. Выдзелены тэматычныя групы індывідуальных мянушак. Вызначаны іх віды паводле ступені семантычнай актыўнасці. Разгледжаны генесіянімічныя мянушкі як сродак ідэнтыфікацыі прадстаўнікоў сям'і, роду.

А. Казлоў у прадмове да зборніка Анатоля Крэйдзіча "Палескі Напалеон" заўважае: "Пісьменніку ніколі нельга забываць, што чалавек – гэта цэлы свет. Бязмежны і супрацьлеглы, просты і парадаксальны, шчыры і хцівы, прамалінейны і завуаляваны, сур'ёзны і блазнаваты. Анатоль Крэйдзіч бачыць, разумее і надзяляе сваіх герояў не лялечным схематызмам, а ўсімі жывымі рысамі жывога жыцця. Менавіта ўсё гэта і стварае непаўторны свет аўтара" [1, с. 4]. З.П. Мельнікава адзначае: "Творы Міколы Сянкевіча – гэта сустрэча з цікавымі героямі, глыбокімі і мудрымі людскімі характарамі. Аўтар расказвае нам пра наша жыццё, углядаецца, услухоўваецца ў яго. За кожнай старонкай паўстаюць людскія лёсы, звычкі, уклад жыцця, наша народная мараль і этыка з заканамернасцямі і парадоксамі праяў беларускага нацыянальнага характару" [5, с. 6]. Сэнсава напоўненыя і канатацыйна насычаныя імёны, прозвішчы, мянушкі персанажаў з'яўляюцца інструментам стварэння запамінальных мастацкіх вобразаў у прозе берасцейскіх пісьменнікаў.

Яркім ацэначна-характарыстычным сродкам выступаюць мянушкі. Паводле прымет, якія становяцца асновай ацэначна-характарыстычнай намінацыі, можна выдзеліць наступныя тэматычныя групы мянушак, ужытых у творах М. Сянкевіча і А. Крэйдзіча.

Найчасцей ацэначна-характарыстычныя празванні герояў адмоўна акрэсліваюць рысы характару, маральныя ўласцівасці персанажаў. Так, паказчыкам іранічна-насмешлівага стаўлення да гераіні апавядання М. Сянкевіча "Хто чый…" з'яўляецца тое, што суседзі найчасцей называюць яе па мянушцы сабачкі, якому фактычна падпарадкавана жыццё

жанчыны: “*Цёця Ніна па некалькі разоў гуляе з* ***Тошыкам*** *у двары, пераносіць яго праз лужы, дакарае, калі той не слухаецца. А яшчэ яна злуецца на дзяцей, як толькі хто-небудзь з іх намерыцца зачапіць сабаку. Цёця Ніна кажа, што* ***Тошык*** *стары і яму патрэбен спакой. Наша суседка не проста цёця Ніна, а цёця* ***Ніна Тошыкава***” [4, с. 181]. Маленькі сусед слушна заўважае: “*У мяне жыве сабака* ***Тузік****. Мне вельмі падабаецца яго смешнае імя. А вось не хочацца чамусьці, каб нехта называў мяне* ***Мішам Тузікавым****. Можа, я нешта не разумею? А вы як лічыце?*” [4, с. 181]. Мянушкі маглі ўтрымліваць станоўчую ацэнку асобы. Так, вясковую старасту, дбайную гаспадыню, на якой трымалася сям’я і, напэўна, уся вёска, празываюць ***Ахмістрыня***. І жанчына не крыўдуе, а нават ганарыцца мянушкай: “*Ведаеце, як мяне на сяле клічуць.* ***Ахмістрыня****. Так за Польшаю называлі гаспадыню, якая вяла гаспадарку ў багатых дамах. Расказвалі старыя людзі, абы-каго не бралі. Трэба і распарадзіцца, і на людзях умець паказацца. Не крыўджуся на* ***Ахмістрыню****. Даў Бог мне гэта – пераканаць чалавека, ад улады нечага для яго дабіцца… У сельскім савеце мяне пабойваюцца нават. Думаю, што я і з міністрам магла б пагаварыць*” [4, с. 136–137]. Выкарыстанне мянушак – сродак апісання не толькі носьбітаў характарыстычных празванняў, але і спосаб ацэнкі таго, хто ўжывае гэтыя найменні. Так, сродкам характарыстыкі чэрствай, непрафесійнай, жорсткай настаўніцы з’яўляюцца формы звароту да вучняў: “*Якіх толькі мянушак не раздавала настаўніца сваім вучням, асабліва хлопчыкам. І “****недапечаныя****” былі ў кожным класе, і “****недаробленыя****”, не кажучы ўжо пра “****трутняў****”, “****боўдзілаў****” ды “****ёлупняў****”. Праўду сказаць, і тыя, хто рыхтаваўся да кожнага ўрока, асаблівай ласкі не мелі*” [4, с. 172].

Тем не менее в руководящих униатских и католических кругах Речи Посполитой возобладала жесткая линия, был взят курс на форсированный и принудительный перевод белорусского и украинского населения ВКЛ и Польши в униатскую веру. Это привело к резкому усилению недовольства православных из всех сословий, а в ряде случаев и к открытому неповиновению и сопротивлению политике насильственного насаждения униатской веры. В Беларуси одним из организаторов и проводников такой политики являлся религиозный ортодокс и фанатик полоцкий униатский архиепископ Иосафат Кунцевич. Сапега неоднократно предупреждал Кунцевича о неизбежных негативных последствиях такой политики. Эти возможные негативные последствия он указал в своем известном письме И. Кунцевичу, написанном в марте 1622 г.: усиление внутренних распрей, раздоров, ослабление силы и мощи Отечества, народные бунты и восстания. В конце концов сам И. Кунцевич стал жертвой своей недальновидной политики: был убит жителями г. Витебска в 1623 г.

Вышеназванное письмо Л. Сапеги интересно тем, что в нем содержатся все основные идеи автора относительно роли религии в личной и общественно-политической жизни: 1) свободный религиозный выбор является неотъемлемым правом человека; 2) религиозная толерантность – основание любого цивилизованного общества; 3) в обществе должны быть четко определены прерогативы светской и церковной властей при обеспечении приоритета светской власти; 4) без религиозной терпимости прочный социальный мир и политическая стабильность в государстве невозможны. Все эти идеи Льва Ивановича Сапеги характеризуют его как государственного деятеля, опередившего свое время, и делают его нашим современником.

Leonid Ermakovich (Brest)

RELIGIOUS DIMENSION IN LEV SAPIEHA'S POLITICS

Keywords: Grand Duchy of Lithuania, Lev Sapieha, policy, religion.

Summary. The article discusses the influence and importance of the religious factor and the personal religious beliefs of the outstanding statesman and thinker of the Grand Duchy of Lithuania Lev Ivanovich Sapieha on the activities carried out under his leadership of domestic and foreign policy of the Belarusian-Lithuanian state. It emphasizes the relevance of inherent views on the role of religion in public and political life.

К содержанию

УДК 372.882

Е.В. Исаева (Елец, ЕГУ имени И.А. Бунина)

ФОРМЫ МЕДИАОБРАЗОВАНИЯ НА УРОКАХ ЛИТЕРАТУРЫ В СОВРЕМЕННОЙ ШКОЛЕ

Ключевые слова: экранизация, методы и приемы, урок.

Аннотация. В статье описывается применение на уроках литературы форм медиаобразования, основное внимание уделено сопоставлению художественных текстов и их экранизаций как форм развития мышления и речи школьников.

Современное развитие образовательных технологий во многом облегчает жизнь школьников и педагогов при условии нормированного и грамотного использования тех или иных методов работы. Компьютеризация процесса образования коснулась всех учебных предметов, в том числе и литературы, которая в последние годы, к сожалению, занимает периферийное положение. Однако процесс технизации преподавания имеет и положительные стороны. Использование приемов медиаобразования дает большие возможности для организации интересных уроков литературы и развития познавательного интереса у обучающихся, а также способствует формированию грамотной и связной речи.

В «Российской педагогической энциклопедии» термин «медиаобразование» трактуется как производное от англ. media education от лат. media – ‘средства’, под ним понимается особое направление в педагогической науке, которое изучает закономерности средств массовой коммуникации [1]. В рамках медиаобразования возникает вопрос об образовательных возможностях различных средств информации. Вопросы отечественного медиаобразования в разное время освещались в работах Л.С. Зазнобиной, Г.К. Селевко, А.В. Федорова, А.В. Шарикова, И.В. Челышевой, С.Н. Пензина и др.

Под медиаобразованием мы понимаем использование различных средств передачи и хранения информации, в том числе кинофильмов, статей из газет, интернетпорталов, аудиокниг и пр., в целях получения знаний, совершенствования умений и навыков различного характера. На уроках литературы в современной школе важно уместно использовать различные источники информации и критически их осмысливать, что реализуется в медиатехнологии, отличительной особенностью которой является интерактивность: в диалоге с различными источниками информации ученику-реципиенту отводится особая роль, в том числе и непредвзятого критика.

В некоторых случаях использование медиаматериалов является необходимым для понимания обучающимися отдельных произведений, часто отстоящих от нашего времени на столетие или более: например, неоценимую помощь педагогу окажет аудиоспектакль, созданный творческим коллективом под эгидой «Радио России» по поэме А. Блока «Двенадцать». Так как в этом сложном для школьников произведении звучит множество голосов, именно актерская трактовка и исполнение позволяют понять, кто является участником этого своеобразного полилога, услышать «музыку революции», о которой писал поэт.

Один из важнейших принципов педагогики – наглядность. Общеизвестно, что человек в основном воспринимает информацию из окружающего мира через зрительный орган. В ходе занятия максимальное количество информации усваивается через зрительное восприятие (91 %), лишь 9 % – через слуховое. Поэтому использование визуальных материалов наряду с вербальным воздействием способствует лучшему пониманию и усвоению информации.

Одной из продуктивных форм работы на уроках литературы в условиях современной школы является сопоставление художественных текстов и их экранизаций как способ развития мышления и речи школьников. С. Пензин подчеркивал, что кинообразование является частью эстетического воспитания, следовательно, призвано развивать у учащихся эстетические взгляды, чувства, идеалы. Подобная работа позволяет, во-первых, стимулировать интерес обучающихся к первоисточнику – к тексту; во-вторых, дает возможность развивать критическое мышление; в-третьих, способствует развитию навыка ведения дискуссии и умения формулировать свое мнение; в-четвертых, расширяет культурный кругозор школьников. Данный вид деятельности дает педагогу возможность развивать аналитические способности учащихся, умение высказывать свое мнение; формировать навык составления рецензии, сопоставления произведений разных видов искусства; формировать эстетическую восприимчивость, воспитывать интерес к мировому искусству. Общеизвестно, что подобную деятельность должно предварять обязательное прочтение текста, но бывает, что интересная, оригинальная постановка заставляет нас взять в руки книгу, чтобы понять замысел автора и специфику интерпретации произведения средствами другого вида искусства.

Например, использование сопоставительного метода целесообразно при изучении трагедии У. Шекспира «Ромео и Джульетта» в 8 классе. Обычно школьникам тяжело дается понимание драматических произведений, а еще отдаленность времени создания текста от нашей эпохи усложняет восприятие материала. В этом случае именно обращение к различным

медиаисточникам – кино, мюзиклу, спектаклю – может помочь в освоении и пониманиии произведения.

В ходе урока отдельные фрагменты текста читают сами школьники, но наиболее сложные, драматически напряженные сцены мы предлагаем обучающимся посмотреть: например, привлекаем с этой целью фрагменты мюзикла Ж. Пресгурвик «Ромео и Джульетта», причем, выбираем французскую версию без подстрочного перевода (начало – противостояние Монтекки и Капулетти, драка, речь герцога, ария синьоры Капулеттии и синьоры Монтекки). Это делается для того, чтобы стимулировать высказывания школьников. Мы предлагаем им вопросы: Какими средствами режиссер передает тему вражды? Какого эпизода не было в трагедии Шекспира? О чем поют две женшины? Зачем постановщик добавил арию сеньоры Монтекки и сеньоры Капулетти? Эти задания проверяют знание текста, заставляют ребят задуматься о том, что в жанре мюзикла есть свои специфические возможности передачи информации (цвет, звук, движения), а также подводят к определению тематического содержания произведения, ведь в первых эпизодах и трагедии, и мюзикла звучит тема вражды и ненависти, из-за которой в конечном итоге и погибают юные герои. Зрительская реакция помогает школьникам подойти к пониманию сути конфликта произведения, а именно определение этой составляющей художественного текста часто вызывает трудности у школьников.

С целью развития речи и совершенствования умения высказывать свое мнение учащимся предварительно дается план для составления отзыва о произведении:

1. Когда, где, кем поставлен мюзикл (фильм)?
2. Что особенного в постановке, чем она отличается от первоисточника?
3. На чем концентрирует внимание автор мюзикла/фильма?
4. Что стоит отметить в качестве положительных находок режиссера?
5. Что вызывает споры, ваше несогласие?
6. Какое впечатление произвела на вас постановка?

Важно формировать у обучающихся навык интерпретационной деятельности медиатекстов (анализ медиатекста), а также навык проектной деятельности по созданию собственных медиапродуктов: это могут быть иллюстрации к произведениям, составление сценария школьного вечера с использованием фрагментов произведений, статья для школьного сайта или газеты, проект, посвященный сопоставительному анализу текста и фильма, мюзикла, спектакля.

При работе с сопоставлением произведений разных видов искусства важно закреплять навык выделения элементов сюжета, например, предлагаем ученикам задание: посмотрев фрагмент из фильма итальянского ре-

жиссера Ф. Дзеффирелли, определите, какой это элемент сюжета. Свое мнение обоснуйте. Как вы оцениваете эту постановку? Отвечают ли актеры вашим представлениям о героях Шекспира? Подобные задания формируют не только предметные навыки, но и метапредметные: умение сопоставлять данные, представленные в разных формах; читать и осмысливать культурные тексты различного уровня сложности с разными стилевыми и художественными особенностями.

Испытанный прием работы – устное словесное рисование – тоже может с успехом применяться на уроках по изучению драматического текста, поскольку каких-либо описаний внешности персонажей автор читателю не сообщает, за редким исключение в текстах могут быть упоминания особенностей портрета того или иного героя. Это прием успешно можно сочетать с творческой работой школьников – созданием иллюстраций к произведению – и с сопоставлением впечатлений учеников и воплощений образов в кинопостановке. Объясняя, уточняя свое мнение, описывая собственное представление о героях, школьники совершенствуют свою речь, учатся отстаивать собственную позицию и выслушивать мнение других.

Использование форм медиаобразования в современной школе способствует активизации познавательной и творческой активности учащихся, позволяет формировать критическое мышление, что чрезвычайно важно в условиях современного общества. Расширение культурного кругозора школьников, а также воспитание культуры чтения, восприятия произведений разных видов искусства, информации, представленной в различных средах, способствует решению основной задачи современного образования – умению работать с информацией.

Список использованной литературы

1. Медиаобразование // Российская педагогическая энциклопедия / гл. ред. В.В. Давыдов. – М. : Большая российская энциклопедия, 1993. – Т. 1. – С. 555.

Elena Isayeva (Yelets)

**FORMS OF MEDIA EDUCATION
AT LITERATURE LESSONS IN MODERN SCHOOL**

Keywords: adaptation, methods and techniques, lesson.

Summary. This article covers the use of literature forms of media in the classroom, focuses on comparing fiction texts and their adaptations as a form of students' thought and speech.

К содержанию

УДК 811.161.3’373.2

В.М. Касцючык (Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна)

АНАМАСТЫЧНАЯ ПРАСТОРА ТВОРАЎ УЛАДЗІМІРА ГЛУШАКОВА

Ключавыя словы: анамастычная прастора, онім, мікратапонім, айконім, гідронім.

Анатацыя. У артыкуле разглядаюцца онімы, ужытыя ў творах Уладзіміра Глушакова. Для аналізу адабраны ключавыя, тэкстаўтваральныя анамастычныя адзінкі, што сталі аб’ектам мастацкага адлюстравання ў аўтабіяграфічнай прозе і публіцыстыцы аўтара.

У аўтабіяграфічнай прозе і публіцыстыцы Уладзіміра Глушакова онімы займаюць асаблівае месца, вылучаюцца яе адметныя тэкстаўтваральныя і мастацка-выяўленчыя адзінкі. Побач з асноўнымі намінатыўнай і ідэнтыфікуючай функцыямі яны валодаюць яркімі канататыўнымі адценнямі і глыбокім канцэптуальным зместам.

Аўтар надзвычай уважліва і мэтанакіравана ставіцца да выбару онімаў. З мэтай перадаць сваю любоў да малой радзімы, Пагарыння, намаляваць яе вобраз найбольш дакладна, рэльефна пісьменнік выкарыстоўвае тапонімы як ключавыя тэкстаўтваральныя кампаненты, што “падкрэсліваюць рэгіянальнасць мастацкага твора, перадаюць спецыфічны каларыт” [3, с. 11]. Так, у кнігах прозы “Насенне”, “Расплата”, у аповесці-эсэ “Фрэскі Палесся” адной з асноўных моўных адзінак выступае айконім *Давыд-Гарадок,* які пад пяром мастака канкрэтызуецца, паэтызуецца, набывае выразную адметнасць і самакаштоўнасць: *Ужо доўга стаіш ты на светлай Гарыні-рацэ, слаўны гарадок, з часін мангольскіх, ужо шмат вады выцекла за доўгія вякі, несучы за сабою, як тайну, смутак і радасці людскія, а што змянілася ў тваім драўляным абліччы?.. Ці то міма прамчалі твае буры і навальніцы, ці то прамчацца яшчэ над табой? Быццам час застыў у табе з твае сівое пары, калі горда паўставалі зняважаныя драўлянскія людзі супраць княжацкага прыгнёту* [1, с. 57].

Горад паказваецца “праз прызму мастацкага асэнсавання ў часе пэўных падзей, з’яў, асоб” [2, с. 3]. Адна з частак аповесці-эсэ “Фрэскі Пагарыння” нават мае назву “Ода Гарадку Давыдаву”.

У творах У. Глушакова Давыд-Гарадок называецца апісальным спосабам, праз выкарыстанне антрапонімаў, гідраніма, іншых айконімаў: *горад над Гарынню, горад Давыдаў, пагарынскі гарадок, горад князя Давыда Ігаравіча, горад майстроў, старажытны беларускі пантэон, родны брат*

Турава, Кіева і Чарнігава. Пісьменнік ужывае трапныя эпітэты да назвы гарадка: *сівы драўляны горад, славуты пагарынскі гарадок, слынны, сівы, але па-ранейшаму малады душой Давыд-Гарадок.*

Айконім *Давыд-Гарадок* выступае сімвалам старажытнасці ўсяго Пагарыння. Падкрэсліваючы надзвычай даўняе заснаванне паселішча, аўтар спыняецца на многіх яго гістарычных атрыбутах: гэта рэчы эпохі бронзавага стагоддзя, раскапаная падземная вулка, забудаваная драўлянымі хаткамі, дзясяткі смалістых зрубаў з гнілабітнымі печамі, хлявамі і павецямі, кузнямі і слясарнымі майстэрнямі, вулічныя і дваровыя насцілы з бярвення, дзівосны Васкрэсенскі храм без ніводнага цвіка, магутны абарончы вал, шарападобная булава як сімвал княжацкай улады.

З летапісным Давыд-Гарадком звязвае пісьменніка *Царкоўная гара,* дзе жыла невядомая княжацкая сям'я. Згаданы мікратапонім напаўняецца глыбокім сэнсам, паколькі выступае адлікам існавання "сівога" палескага гарадка: *Стаю на аблюбаваным месцы – на краі пясчанай макаўкі Царкоўнай гары, далёкі нашчадак дрыгавічоў і драўлян, а ўнізе, як і тысячу гадоў назад, плывуць у рацэ воблакі* [2, с. 10].

Нямымі сведкамі старажытнага паходжання гарадка выступаюць таксама мікратапонімы *Замкавая гара* і *Татарскія горкі.* Спыняючыся на іх, аўтар вылучае такую іх рысу, як непадлегласць часу, вечнасць існавання: *Гэтак жа ляжыць пасярод Гарадка насыпаная Замкавая гара, у якой да вайны паспелі пакапацца палякі і нядаўна вось – археолагі з Кіева. Але археолагі прыязджаюць і ад'язджаюць, а гара ўсё стаіць сабе трывала і надзейна, як стаяць вакол яе вякамі – трывала і надзейна – прасторныя, прысадзістыя хаты* [1, с. 17]. *За Гарадком ляжаць Татарскія горкі, куды мы ездзім зімой катацца на лыжах і заўсёды ламаем іх там. Вельмі ўжо крутыя горкі! Старыя гарадчукі сцвярджаюць, што манголататары дайшлі толькі да гэтых мясцін. Тут іх сустрэлі і ўшчэнт разбілі войскі нейкага ордэна, пасля чаго рэшткі мангола-татар уцяклі і больш ніколі не з'яўляліся тут. Забітых стэпавікоў было столькі, што, калі мясцовыя жыхары засыпалі іх зямлёй, атрымаліся горкі* [1, с. 18].

Каб падкрэсліць старажытнае ўзнікненне паселішча, яго слыннасць, пісьменнік актыўна карыстаецца прыёмам параўнання Гарадка з іншымі, больш вядомымі гістарычнымі аб'ектамі – Масквой, Кіевам, Чарнігавам, Туравам: *Гарадок – Маскве белакаменнай равеснік, але мала што змянілася ў яго спрадвечным драўляным – з хат – абліччы…* [1, с. 17]. *Вольна стаіць сабе на стромах хуткаплыннай Гарыні драўляны горад князя Давыда Ігаравіча – родны брат Турава, Кіева і Чарнігава* [1, с. 384].

У абодвух змястоўных кантэкстах Гарадок старажытны паводле паходжання. Аднак першы з іх акцэнтуе ўвагу яшчэ і на розным лёсе гара-

доў: адны з іх страчваюць сваю былую веліч і славу, прыходзяць у заняпад, другія, наадварот, мацнеюць, набываюць вядомасць і сілу. Другі кантэкст таксама вельмі інфарматыўны: праз словы *родны брат* аўтар падкрэслівае роўнасць, аднолькавую вагу Давыд-Гарадка сярод іншых названых гарадоў. Больш таго, звяртаецца ўвага на цесную сувязь, пастаянныя кантакты паміж названымі геаграфічнымі і гістарычнымі аб'ектамі.

Яшчэ адна істотная характарыстыка старажытнага, славутага Гарадка – яго святасць. У адным з кантэкстаў У. Глушакоў зазначае: *Ад бабулі, Наталлі Мікітаўны, давялося некалі пачуць, што раней святочную літургію званоў тураўскіх падхоплівалі званы давыд-гарадоцкія і такая боская музыка напаўняла міжрэчча, што паветра ажно свяцілася святасцю і добрасцю…* [2, с. 45]. Характарыстыкай *'святы, асаблівы'* ахопліваецца і Давыд-Гарадок, і рака Гарынь: *Гарадок разбудзіць малінавы перазвон царкоўных званоў…* [1, с. 121]. *Гэтак жа ўрачыста плыў над старажытным Давыд-Гарадком малінавы перазвон – да вячэрні* [1, с. 195]. *Па святах і ў нядзельныя дні над Гарынню плыве вясёлы перазвон званоў* [1, с. 18].

Святасць месца вызначаецца таксама па мікратапонімах. Так, *Царкоўная гара,* урочышча *Царкоўнае* – гэта незвычайныя месцы ў геаграфічнай прасторы паселішча. Спыняе ўвагу такі аўтарскі кантэкст: *Зноў стаю з непакрытай галавой на макаўцы Царкоўнай гары – дзесяць стагоддзяў назад насыпаным старажытным замчышчы пасярод Давыд-Гарадка…* [1, с. 346]. Прыведзены мікратэкст выяўляе прыхаваную інфармацыю: гара параўноўваецца з царквой, дзе мужчыны стаяць толькі з непакрытай галавой.

Святасць урочышча *Царкоўнае* і прылеглай прасторы раскрываецца ў аповедзе дзеда Пятра на словы ўнука пра пачутыя званы: *– Чуў і я пра етыя звоны, унучку. Не да цэркі яны звонілі… Шчэ мой дзед Лаўрэн, які служыў белому цару ажно дваццаць пяць год, неяк у моцную суш бачыў над водой на озёрах золотыя вярхі храмоў, і звонілі одтуля звоны ўсю ліпеньскую ноч, унучку, ды так звонілі, шчо на ўсіх урочышчах чутно було, і ўся рака быттo освяцілася светом…* [1, с. 358].

Працягам гэтага займальнага аповеду стала даўняя гісторыя пра гібель на гэтым месцы вялікай колькасці людзей: *– А легенду етую выдумалі ў даўнія часы, кода полешука рабовалі і забівалі ў яго ж хаце, і лезло тых ворогоў у Погорынне процьма, як гругання ў незародны год, от і хаваліся людзі ў дрыгву, куды і звер ходу не ведаў, штат народу потонуло со своім скарбом і дзеткамі, казалі, сама зямля давала трэшчыну на шляху ворожом, знікала под яго ногамі, хаваючы ў своіх нетрах цэлыя вёскі з хатамі і храмамі православнымі…* [1, с. 359].

Другі Давыд-Гарадок – гэта асаблівае месца, квяцісты самабытны горад, дзе прайшлі дзяцінства і юнацтва пісьменніка. Галоўная характарыстычная рыса яго аблічча – “насенны гешэфт”, прадпрымальнасць яго жыхароў. Тым не менш і новы Давыд-Гарадок, як зазначае пісьменнік, “здолеў пранесці праз стагоддзі і захаваць не толькі свой самабытны, у нечым нават патрыярхальны лад жыцця, але й сваю непаўторную знешнасць, сваю, нарэшце, годнасць [2, с. 4].

Яшчэ адзін Давыд-Гарадок – сучасны, з жалезабетоннымі сценамі карпусоў электралямпавага завода, філіяла буйнейшага ў рэспубліцы Брэсцкага прадпрыемства, з высокімі шматкватэрнымі дамамі. Ён вырас за дзесяць гадоў на левым баку Гарыні. Менавіта гэты, забруджаны, не прымаецца душой, супрацьпастаўляецца аўтарам старому, адвечнаму, святому.

Яшчэ адно вымярэнне адносна старажытнага Давыд-Гарадка – Чарнобыль, атамны выбух над Прыпяццю, які размежаваў жыццё паселішча да і пасля аварыі.

У творах У. Глушакова даволі часта называюцца шматлікія адметныя давыд-гарадоцкія “мікрараёны”, што разнастайваюць прастору паселішча. Яны надзвычай запамінальныя, каларытныя. У некаторых выпадках аўтар карыстаецца прыёмам нанізвання згаданых найменняў: *Блакітнаватым лязом мяча рассякае рака Гарынь наш старажытны Давыд-Гарадок на дзве часткі. Паўночны бок – Мельнікі, Балота, паўднёвы – Радзічы, Навасселле, Выганы* [1, с. 17]. *А людзі ішлі і ішлі… З Радзічаў, дзе мама нарадзілася і расла ў вялікай рыбацкай сям’і да першага замужжа; з Балота, дзе пабудавалі з бацькам першую сваю хатку і дзе нарадзіліся мы з братам; з Каморы, Выгана, Аселіцы, Вайтаўшчыны, дзе жыла шматлікая радня і дзе проста яе ведалі…* [1, с. 502]. У першым кантэксце мікратапонімы падзелены на дзве групы, аснову чаго складае рака Гарынь, якая займае значнае месца ў прасторы паселішча. Другі мікратэкст выбудаваны праз вылучэнне асобных “мікрараёнаў”, што пакінулі прыкметны след у жыцці канкрэтнага персанажа, маці галоўнага героя.

Пісьменнік звяртаецца да катэгорыі дому як архетыпу, адвечнай каштоўнасці. Ён свядома насычае свае творы атрыбутамі роднага, кроўнага. У адным з кантэкстаў зазначае: *З усіх сістэмаў, якія выпрацавала чалавецтва, якімі атачыла сябе і якім падпарадкавала сябе, для гарадчука, дзе б і кім ён ні быў, заўсёды надзейней спрацоўвае адзіная – роднасная. Каранёвая* [2, с. 8].

Сувязь з малой радзімай адчуваецца гарадчукамі і праз не раз чутыя імі назвы “мікрараёнаў”. Нездарма аўтар гэтыя малыя тапанімічныя аб’екты азначае займеннікамі *мой, свой: А вось і ражок, ад якога ўніз да Сежкі бяжыць мая вуліца Горкага, якую местачкоўцы завуць яшчэ*

Лужком [1, с. 190]. *Маці з грушамі-саладоўкамі і слівамі таксама, відаць, на базары – ёй бліжэй дабірацца да свайго Лужка, чым каморскім ці навасельскім маладзіцам* [1, с. 190].

Асаблівыя, пяшчотныя адносіны пісьменніка да мікратапоніма *Лужок* заўважаюцца ў такім метафарызаваным кантэксце: *Зацемна, калі паўсонны Лужок яшчэ быў захінуты ў прахалодныя палатняныя прасціны туману, бацька, ужо абуты-апрануты, нецярпліва зрываў з цвіка ў сенцах гаспадарчую кірзавую сумку і хуценька праставаў, ці, як ён казаў, дубачыў, у "горад" – цэнтр мястэчка, – да хлебнай крамы* [1, с. 449].

Такім чынам, асэнсаванне айконіма *Давыд-Гарадок* і назваў яго "мікрараёнаў" праходзіць у творах У. Глушакова ў розных накірунках: гэта назва геаграфічнага аб'екта і месца жыхарства, носьбіт культурнай інфармацыі, свая прастора, персаніфікаваны, апаэтызаваны вобраз.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Глушакоў, У. Развітанне на пачатку вясны / У. Глушакоў. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 511 с.

2. Зборнік прозы / У. Глушакоў, А. Крэйдзіч. – Мінск : Беларусь, 2012. – 360 с.

3. Шур, В. Анамастычная лексіка ў беларускай мастацкай літаратуры / В. Шур. – Мінск : Тэхнапрынт, 2002. – 226 с.

Valentina Kostyuchik (Brest)

ONOMASTIC EXSPANCE OF VLADIMIR GLUSHAKOV'S CREATIVE WORKS

Key words: onomastic expance, onym, placename, anthroponym, hydronym.

Summary. The article explores onyms used in the works of Vladimir Glushakov. The keys, text-forming onomastic units that have been the object of artistic representation in autobiographical prose and journalism of the author were selected. In the works of Vladimir Glushakov onyms reflect the author's concept, genre, artistic method, features of the ethnocultural region. Onyms create national cultural background, transmit individual copyrights typical for the style of the writer. By onyms the author gains peaks of artistry, and the language of his works becomes harmonic, fresh and gets individual copyright specificity. Onyms have become the suitable manner, a tool with the help of which the image of a small motherland (David-Gorodok and Pogorinya) is embodied. In addition, they help convincingly and emotionally convey the main idea of his works.

К содержанию

УДК 070.1(476.7):821.161.1-92

С.С. Клундук, Н.Р. Якубук (Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна)

СПЕЦЫФІКА ПУБЛІЦЫСТЫЧНАГА ДЫСКУРСУ ДРУКАВАНЫХ СМІ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

Ключавыя словы: публіцыстычны дыскурс, медыятэкст, інтэртэкстуальнасць, прэцэдэнтны тэкст, персаніфікацыя ў журналісцкай дзейнасці.

Анатацыя. У артыкуле прадстаўлены некаторыя тэндэнцыі функцыянавання публіцыстычнага дыскурсу друкаваных СМІ Брэсцкай вобласці, у прыватнасці, разглядаюцца феномены інтэртэкстуальнасці і персаніфікацыі журналісцкага тэксту.

Публіцыстычны дыскурс сучасных СМІ існуе ў пэўнай сацыякультурнай сферы, абапіраецца на традыцыі грамадства, арыентуецца на пэўную аўдыторыю, падпадае пад уплыў сацыяльна-палітычных фактараў пачатку XXI ст. і рэагуе на любыя змены навакольнай рэчаіснасці. Сёння выяўляецца прэвалюючая накіраванасць публіцыстычнай камунікацыі на зваротную сувязь з аўдыторыяй (інтэрактыўнасць). У выніку назіраецца імкненне да ўзмацнення інфармацыйнасці, камунікацыйнай значнасці і агульнадаступнасці журналісцкіх тэкстаў [3, с. 27]. Сучасны публіцыстычны дыскурс усё больш апелюе да крытычнасці, ацэначнасці, а сам стыль журналісцкіх матэрыялаў становіцца надзвычай эмацыйным і вобразным. Гэта пакідае яскравы адбітак на функцыянаванні жанравай сістэмы, на прэзентацыі праблемна-тэматычнага поля, на спецыфіцы моўнага складніку журналісцкіх тэкстаў.

Аналіз матэрыялаў перыядычнага друку Брэсцкай вобласці, у прыватнасці, газет “Вячэрні Брэст” (далей – ВБ), “Брэсцкі кур’ер” (далей – БК), “Брэсцкі веснік” (далей – БВ), “Брэсцкая газета” (далей – БГ), “Заря”, дазволіў выявіць некаторыя тэндэнцыі функцыянавання публіцыстычнага дыскурсу рэгіянальных СМІ, асноўнымі з якіх з’яўляюцца інтэртэкстуальнасць, персаніфікацыя, рэпартажнасць і эсэізацыя аналітычных і мастацка-публіцыстычных тэкстаў. У дадзеным артыкуле звернем увагу на першыя дзве самыя істотныя ўласцівасці сучаснага публіцыстычнага дыскурсу друкаваных СМІ.

Інтэртэкстуальнасць у структуры журналісцкага тэксту. Яскравым феноменам, выяўленым у публіцыстычных тэкстах брэсцкіх друкаваных СМІ, з’яўляецца інтэртэкстуальнасць журналісцкага выказвання, якая

ўказвае на адкрытасць – важную катэгорыю сучаснага медыятэксту. “Адным з эфектыўных і да апошняга часу найбольш распаўсюджаных эмацыянальна-вобразных сродкаў пабудовы публіцыстычнага тэксту была яго татальная інтэртэкстуалізацыя: увядзенне ў аўтарскі твор “чужога” тэксту або яго часткі, экспліцытная або імпліцытная спасылка на твор іншага аўтара, згадванне шырока вядомых чытацкай аўдыторыі (прэцэдэнтных) імёнаў, гістарычных дат і сітуацый, выкарыстанне табуіраваных, абсцэнных, жаргонных і іншых лексем абмежаванага ўжытку [1, с. 35].

Як вядома, набор інтэртэкстуальных прыёмаў трактуецца вучонымі па-рознаму. Некаторыя даследчыкі, кіруючыся тым, што ў цэлым інтэртэкстуальнасць (“тэкст у тэксце”) – гэта адносіны тэксту з яго фрагментамі з іншых тэкстаў, непасрэднае суіснаванне двух або больш тэкстаў у адным, да інтэртэкстуальных прыёмаў адносяць, напрыклад, прамое цытаванне, пераклад, плагіят, перайманне, пародыю, інсцэніроўку, экранізацыю, выкарыстанне эпіграфа і інш. Мы, услед за некаторымі вучонымі [2], раздзелім прыёмы інтэртэкстуалізацыі на два тыпы.

Першы тып прыёмаў складаюць выпадкі прамога цытавання выказванняў з указаннем крыніц інфармацыі. Як правіла, “чужое слова” ўводзіцца з дапамогай пабочных адзінак, якія ўказваюць на крыніцу аўтарства выказвання, або далучальных канструкцый са значэннем тлумачэння, заўвагі (*як стала вядома, як пісалі ў газеце, па словах, на іх погляд, як лічыць, на думку, кажуць, па неправераных звестках*, *напрыклад, у прыватнасці, у адпаведнасці з, згодна з, паводле* і інш.). “Чужое” меркаванне і пазіцыя могуць прадстаўляцца ў выглядзе прамой, першапачатковай, або трансфармаванай цытаты (*Однако, как заверил корреспондента “Вечёрки” директор рынка Александр Ивашкевич, в руки несовершеннолетних даже такое оружие непосредственно от продавца не попадает* (ВБ, 01.02.17); *По информации Национального статистического комитета, на начало 2017 г. в Брестской области сохранилась неплохая ситуация с выплатой заработной платы*). Менавіта такія цытаты і спасылкі часцей выкарыстоўваюцца ў тэкстах інфармацыйных і інфармацыйна-аналітычных жанраў і выконваюць функцыю дакументавання і падмены адказнасці [2]. Адзначым, што далёка не ўсе вучоныя адносяць такое цытаванне да прыёмаў інтэртэкстуалізацыі.

Другі тып прыёмаў інтэртэкстуалізацыі ў публіцыстычным дыскурсе ўключае выкарыстанне ўласна інтэртэкстуальных адзінак – слоў, выразаў, цытат, якія валодаюць лінгвакультуралагічнай каштоўнасцю і фарміруюць эмацыйна-экспрэсіўную ацэнку (зместава-канцэптуальную інфармацыю). Такія прыёмы называюць “прэцэдэнтнымі феноменамі”, якія падзяляюцца на “прэцэдэнтны тэкст”, “прэцэдэнтнае выказванне”, “прэцэдэнтнае імя”,

“прэцэдэнтную сітуацыю”. Трэба адзначыць, што не заўсёды можна выявіць выразнае адрозненне паміж названымі відамі прэцэдэнтных феноменаў. Між тым старонкі рэгіянальных выданняў, асабліва гарадскіх газет, у апошні час стракацяць наяўнасцю інтэртэкстуальных адзінак такога кшталту.

Як паказвае аналіз, прэцэдэнтныя феномены прэзентуюцца ва ўсіх структурных кампанентах сучаснага медыятэксту, у прыватнасці, у назвах рубрык, у загалоўках, падзагалоўках, унутраных загалоўках, у лідзе і ва ўласна тэксце. Даволі яскрава яны прадстаўлены ў загалоўках – важным структурным складніку публіцыстычнага тэксту (*Налог платежом крашен* (ВБ, 22.01.16); *Мороз по коже* (БК, 06.01.16); *Нагружать всё больше нас…* (БГ, 27.01.17); *С миру по нитке* (БВ, 26.01.17); *Не все пути ведут в столицу* (БК, 27.01.16); *Третий лишний* (БГ, 24.02.17)). Менавіта з загалоўкам найперш сутыкаецца чытач, таму гэты структурны элемент публікацыі павінен быць не толькі інфармацыйным, лёгкаўспрымальным, але і прыцягальна-інтрыгуючым. Якраз гэтаму і спрыяе ў журналісцкай творчасці выкарыстанне прэцэдэнтных феноменаў, якія дапамагаюць стварыць яркія і запамінальныя загалоўкі і адпаведна выклікаюць цікавасць у чытача да ўсяго газетнага тэксту (*Раздеваться и работать* (ВБ, 01.02.17); *Куда навострим лыжи* (ВБ, 22.01.16); *Петух раздора* (Заря, 31.01.17); *Кто не успел – не опоздал* (ВБ, 22.01.16); *Как тарифы ЖКУ ударили по кошельку* (БГ, 24.02.17); *Переписку пустили по кругу* (БГ, 24.02.17)).

Распаўсюджаны прэцэдэнтныя феномены і ў складзе ўнутраных загалоўкаў (*И покатились беззакония как снежный ком* (БГ, 17.02.17); *Гусь – стола голова* (БГ, 23.12.16); *Своя рука – владыка?* (БГ, 13.01.17); *Эх, раз, еще раз, еще много-много раз!* (БГ, 13.01.17); *Не по принципу “что упало, то пропало”* (БГ, 13.01.17); *Вбил клин в оппозиционном поле* (БГ, 10.02.17); *Кормят обещаниями* (БГ, 24.02.17). У некаторых рэгіянальных выданнях прэцэдэнтныя феномены актыўна прэзентуюцца ў назвах рубрык (*Кроме шуток* (БВ, 26.01.17); *Роман с продолженьем* (ВБ, 18.01.17)) і ў назвах тэматычных палос (*Свежая лента о главном* (ВБ, 01.02.17); *Кримобоз* (БГ, 17.02.17); *Но об этом говорят* (ВБ, 11.01.17); *Хлеба и зрелищ* (БГ, 17.02.17). Зрэдчас прэцэдэнтныя адзінкі прадстаўлены ў падзагалоўках (*Не положено. Человек отдал 19 лет армии и остался на бобах* (БГ, 17.02.17)).

Даследаванне фактычнага матэрыялу сведчыць пра разнастайнасць сфер-крыніц прэцэдэнтнасці, якія прадстаўляюць вобласць мастацтва, вобласць рэлігіі, вобласць навукі і сацыяльную вобласць. У асноўным крыніцай цытавання на газетных палосах брэсцкіх выданняў з’яўляецца вобласць мастацтва, у прыватнасці, фальклор, літаратура, музыка, кіно, тэатр, жывапіс (*Остановите самолёт – я выхожу* (Заря, 31.01.17); *Голь на выдумку хитра* (ВБ, 20.01.16); *Да гори “Рено” огнем* (БГ, 24.02.17);

“Клюквенника” – на чистую воду (ВБ, 27.01.16)). Асновай прэцэдэнтнасці ў матэрыялах прааналізаваных газет з’яўляюцца ўстойлівыя адзінкі, назвы мастацкіх твораў, песень, кінаперадач, фільмаў, а таксама цытаты з твораў. Журналісты брэсцкіх выданняў выкарыстоўваюць прэцэдэнтныя канструкцыі, звязаныя з вядомымі для беларускай сацыяпрасторы з’явамі, што, як правіла, не выклікае ў чытача цяжкасцяў у разуменні і дэкадзіраванні асноўнага тэксту. Прэцэдэнтныя элементы, асабліва загаловачныя, арыентаваны найперш на ўспрыманне, станоўча ці адмоўна ўздзейнічаюць на рэцыпіента, яскрава перадаюць пазіцыю аўтара, і таму з’яўляюцца актыўным сродкам персаніфікацыі журналіста.

Як паказвае кантэнт-аналіз, прэцэдэнтныя феномены асабліва распаўсюджаны ў газеце “Вячэрні Брэст” і мала выкарыстальныя ў абласным выданні “Заря”. Зразумела, што гэта найперш звязана з характарам аўдыторыі, яе сацыяльным станам, адукацыяй і нават узростам моўнай асобы.

На інтэртэкстуальнасць у структуры журналісцкага тэксту ўказвае і выкарыстанне журналістамі эмацыйна афарбаваных моўных адзінак абмежаванай сферы выкарыстання, ці, па словах С.В. Зелянко, *інтэрлексем* (жарганізмаў, аргатызмаў, ненарматыўна-лаянкавых і субстандартна-абсцэнных лексем), якія ўжываюцца замест агульнапрынятых для адлюстравання ў медыятэксце пэўнай рэальнай сітуацыі, і *інтэрстылёвых украпін* – лексічных адзінак аднаго стылю, якія ўключаюцца ў медыятэкст з мэтамі стварэння пэўнага каларыту і спараджэння ў чытацкай аўдыторыі адпаведных спецыфіцы публікацыі асацыяцый [1, с. 61]: *Подгузник, который “**фонил**”* (ВБ, 01.02.17); *РКС “Погонь” пыталась **огрызаться** редкими **контрами**; но вновь “**нефарт**”: на 53-й минуте БГК остался без одного из своих козырей – Николы Манойловича”* (ВБ, 15.01.16); *Или дестабилизатор, или **лох*** (БГ, 17.02.17); *Правда, такие перспективы вынуждают студентов “**подзабить**” на учебу* (ВБ, 31.1016); *“**Дозняк**” – мой враг* (ВБ, 15.11.16). Такія інтэртэкстуальныя адзінкі дапамагаюць журналісту наладзіць камунікацыю, кантакт з аўдыторыяй, паколькі яны актыўна прыцягваюць увагу чытача, ствараюць эфект непасрэднасці і служаць хуткаму дэкадзіраванню прадстаўленай інфармацыі (*И “ЦРУшников” в Вашингтоне, очевидно, не меньше во власти, и “ФБРовцы” в “**фаворе**”?* (ВБ, 14.07.16); *Нет в социуме таких мелких и крупных конфликтов, к которым нельзя было бы “**припахать**” милиционера* (ВБ, 01.03.16)).

Такім чынам, медыятэксты рэгіянальных друкаваных СМІ характарызуюцца інтэртэкстуальнасцю – спецыфічнай уласцівасцю сучаснага публіцыстычнага дыскурсу. Журналісты брэсцкага рэгіёна актыўна чэрпаюць інфармацыю з сучаснага жыцця, цытуючы папярэднія выказванні палітыкаў, грамадскіх дзеячаў, адсылаюць да меркаванняў экспертаў

і прафесіяналаў, указваюць на крыніцы інфармацыі, звяртаюцца да прэцэдэнтнасці, часам выкарыстоўваюць спецыфічную лексіку – адзінкі абмежаванай сферы выкарыстання.

Персаніфікацыя журналісцкага тэксту. Адным з феноменаў, які актыўна прадстаўляецца ў сродках масавай інфармацыі, з'яўляецца персаніфікацыя журналісцкай дзейнасці. Па словах В.М. Самусевіч, феномен персаніфікацыі выяўляецца ў некалькіх кірунках: пераход ад традыцыйных СМІ да сродкаў персаніфікаванай (індывідуальнай) інфармацыі, г.зн. *персаніфікацыя інфармацыі*; змяненне статусу адрасата, г.зн. *персаналізацыя аўдыторыі*; змена статусу і пазіцыі аўтара, г.зн. *персаніфікацыя журналіста* [4, с. 137].

У сучасных тэкстах брэсцкіх газет яскрава праяўляюцца як персаніфікацыя інфармацыі і журналіста, так і персаналізацыя аўдыторыі. Персаналізацыя аўдыторыі – гэта скіраванасць кантэнту медыятэкстаў на задавальненне запытаў канкрэтнага рэцыпіента, на пэўную, вузкую аўдыторыю. Часцей за ўсё гэты феномен спрацоўвае ў тэкстах камерцыйнага характару. Так, напрыклад, рэкламныя матэрыялы апелююць да інтарэсаў адрасата, г.зн. абавязкова звернуты да якога-небудзь адрасата ці прызначаны для пэўнага кола асоб, а значыць і маркіруюцца адпаведным чынам.

Персаналізацыя аўдыторыі найперш праяўляецца ў загалоўках, падзагалоўках і ўнутраных загалоўках. Загаловак павінен зачапіць адрасата, прыцягнуць яго ўвагу і прымусіць чытаць увесь тэкст. Таму журналісты выкарыстоўваюць мноства прыёмаў зацікаўлення канкрэтнай аўдыторыі да свайго тэксту. Маркерамі могуць служыць указанні на прафесійную скіраванасць аўдыторыі, на адукацыю, на ўзрост, на гендарныя размежаванні, на геаграфічныя паказчыкі, на ўзровень прыбытку, на агульнасць праблемы, на жыццёвыя зацікаўленні і інш. Так, напрыклад, загалоўкі тыпу ***Тунеядцы*** *пишут в горисполком* (БГ, 17.02.17); *Доказали, что зря в* ***тунеядцы*** *записали* (БГ, 17.02.17); *Не* ***тунядзец****? Дакажы!* (БГ, 23.12.16); ***Тунеядец*** *доказал в суде, что он не* ***тунеядец*** (БГ, 24.02.17); ***Иждивенцев*** *подсчитали* (БГ, 24.02.17); ***Пенсия*** *вне закона* (БГ, 17.02.17) маркіраваны лексемамі, якія ўказваць на яркія з'явы сучаснага жыцця Беларусі і якія звужаюць мэтавую аўдыторыю па агульнасці канкрэтнай праблемы. У структуры загалоўкаў *Минчане бесплатно, брестчане – по справке* (БГ, 23.12.16); *Более 500* ***брестчан*** *хотят знать, куда идет транспортный налог* (БГ, 16.12.16); ***Белорусы*** *рассердились* (БГ, 24.02.17) ёсць яўнае ўказанне на геаграфічную характарыстыку чытача, што пэўным чынам персаналізуе аўдыторыю. Загалоўкі *Летите,* ***туристы****, летите* (БГ, 20.01.17); *В "****Орлёнок****" на отдых* (ВБ, 15.02.17); *Открыть для себя* ***Индию*** (БВ, 26.01.17); *"Час пік" для* ***модниц*** (ВБ, 11.01.17) персаналізуюць аўдыторыю

па агульнасці зацікаўленняў, а назвы матэрыялаў *Идеи для* ***вундеркиндов*** (ВБ, 18.01.17); *Я в* ***медсёстры*** *бы пошла, пусть меня научат* (БГ, 27.01.17) абмяжоўваюць мэтавага адрасата па праблеме адукацыі, характары прафесійнай дзейнасці.

Для ажыццяўлення даступнасці тэкстаў канкрэтнай аўдыторыі журналісты брэсцкіх СМІ імкнуцца персаналізаваць прэзентаваныя матэрыялы. Журналісцкія маркеры персаналізацыі аўдыторыі дапамагаюць адрасату фільтраваць інфармацыю згодна са сваімі запатрабаваннямі, зацікаўленнямі, спрыяюць эфектыўнаму мэтанакіраванаму дыялогу паміж камунікантамі.

Такім чынам, глабальныя змены ў журналістыцы прыводзяць да трансфармацыі традыцыйнай структуры тэксту, да пошуку новых метадаў, прыёмаў, сродкаў уздзеяння на адрасата. З'явы інтэртэкстульнасці і персаналізацыі сталі спецыфічнымі прыкметамі сучаснага публіцыстычнага дыскурсу як прадукту аўтарскай творчасці.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Зелянко, С. В. Інтэртэкст у публіцыстычным маўленні / С. В. Зелянко ; навук. рэд. В. І. Іўчанкаў. – Мінск : БДУ, 2012. – 195 с.

2. Негрышев, А. А. Прагматика интертекстуальности в новостном дискурсе СМИ (на материале информационных заметок) [Электронный ресурс] / А. А. Негрышев // Режим доступа: http://www.my-luni.ru/journal/clauses/110. – Дата доступа: 14.02.2017.

3. Орехов, А. В. Функционирование интертекстуальности в современном публицистическом дискурсе. Трансформация прецедентных феноменов [Электронный ресурс] / А. В. Орехов. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/funktsionirovanie-intertekstualnostiv-sovremennom-publitsisticheskom-diskurse-transformatsiya-pretsedentnyh-fenomenov. – Дата доступа: 14.02.2017.

4. Самусевич, О. М. Персонификация в журналистском тексте [Электронный ресурс] / О. М. Самусевич. – Режим доступа: http://sn-philol.cfuv.ru/wp-content/uploads/2016/12/samusevich.pdf. – Дата доступа: 26.02.2017.

Sviatlana Klunduk, Natallia Yakubuk (Brest)

THE SPECIFICS OF JOURNALISTIC DISCOURSE OF PRINT MEDIA IN BREST REGION

Keywords: journalistic discourse, mediatext, intertextuality, precedent text, personification in journalism.

Summary. The article presents some trends in the functioning of journalistic discourse of printed media in Brest region, in particular, the phenomena of intertextuality and the personification of journalistic text.

К содержанию

УДК 821.161.3.09:81’42:008

О.Н. Ковальчук (Брест, БрГУ имени А.С. Пушкина)

ОБЩЕКУЛЬТУРНЫЙ ДИСКУРС В «ЖУРАВЛИНОМ КРИКЕ» В. БЫКОВА

Ключевые слова: Вторая мировая война в литературе, проза, внелитературный контекст, В. Быков.

Аннотация. Исследование посвящено проблеме использования внелитературного контекста для характеристики литературного героя. В частности, В. Быков упоминает известного скульптора Бенвенуто Челлини, чье произведение «Жизнь Бенвенуто Челлини, флорентийца, написанная им самим» создает общекультурный дискурс, помогающий понять специфику характера одного из героев «Журавлиного крика», Фишера.

Повесть В. Быкова «Журавлиный крик» в целом глубоко исследована в плане идейно-художественного содержания, однако рассмотрение особенностей конструирования ее сюжетного материала дает возможность открыть новые грани замечательного образца отечественной прозы.

Уже в начале произведения во время обрисовки одного из персонажей, Бориса Фишера, автор обращается к его профессии, упоминая, что перед читателем ученый. Одним из характерных предметов, несущих в себе смыслообразующий потенциал, оказывается книжица с черной обложкой, которую Фишер всегда носит с собой и постоянно перечитывает. Это «Біяграфія Чэліні» [1, с. 25]. О том, насколько она важна для ученого, говорит и потрепанность страниц, и способность героя полностью погрузиться в мир произведения, при этом не обращать внимание на то, что происходит в мире реальном. На самом деле, именно эта книга является для Бориса связующим звеном между искусством, которое в прошлом было всей его жизнью, и фронтовой действительностью, составляющей теперь реалии его существования. Такой металитературный контекст расширяет образность произведения, придавая ему многомерность и отсылая читателя к общекультурным сведениям.

Раскрытие их происходит в том числе через противопоставление двух героев, бойца Фишера и старшины Карпенко. Они олицетворяют два мира: интеллектуальный, эстетический, возвышенный, с одной стороны, и обывательский, утилитарный, приземленный – с другой. Для Карпенко известный «Давид» Микеланджело, увиденный на фото в книге ученого – это «нейкі голы з валасатай галавой чалавек», который «пазіраючы ўбок,

хмурыў бровы» [1, с. 25]. У командира не просто отсутствуют представления об этом произведении, текст не предполагает даже самых общих его ассоциаций со скульптурой.

Слова «кандидат искусствоведения» старшина соотносит с простым определением, в котором он все же не уверен: «Па карцінках спец, ці як?» [1, с. 26]. Сам Фишер, конечно, не использовал бы для произведений искусства слово «картинка», но в этом случае он не обращает явного внимания на характер лексики, поскольку гораздо более важным ему представляется уточнение сферы своих научных интересов, возможность которого, бесспорно, старшина не предполагал: «І па карцінах, але я галоўным чынам па скульптуры эпохі Адраджэння. У прыватнасці, спецыялізаваўся па італьянскай скульптуры» [1, с. 26].

Фишеру кажется, что он прояснил некоторые детали, но на самом деле ни название эпохи, ни специфика скульптуры как вида искусства не понятны Карпенко, о чем читатель узнает из дальнейшего разговора героев. Старшина задает резонный, по его мнению, вопрос: «А што ён, гэты голы, з гіпсу злеплены, ці як?» [1, с. 26]. Фишер в ответе снова опирается на историю культуры, но дополняет свои слова сведениями, более понятными старшине, указывая размер скульптуры и использованный для ее изготовления материал: «Гэтая пяціметровая фігура Давіда высечана з крыцкага мармуру. Наогул гіпс як матэрыял для манументальнай скульптуры ў старажытнасць і ў часы Рэнесансу амаль не ўжываўся. Гэта ўжо атрыбут новага часу» [1, с. 26]. И все же у Карпенко по-прежнему нет представления, что такое «Возрождение», когда проходит «Ренессанс» и отличается ли он от «нового времени». Его следующий вопрос снова может быть отнесен скорее к современности: «А чым жа ён такую аграмадзіну высек? Можа, якой машынай?» [1, с. 26]. Фишер удивляется такому предположению, но не потому, что улавливает дезориентацию Карпенко во времени, а потому, что для него немыслимо соотносить такого рода произведения искусства с машинной обработкой: «Хіба можна машынай? Толькі рукамі, вядома» [1, с. 26]. Пиитет, который он испытывает к «Давиду» как культурному достоянию, совершенно не свойственен старшине, но крестьянский сын в полной мере способен оценить труд человеческих рук, поэтому он искренне заинтересован тем, что ему близко: «Ого! Гэта ж колькі часу трэба было дзяўбці?» [1, с. 26]. Фишер отвечает не только о сроке работы, но и о том, как это оценивается в искусстве: «Два гады, з памочнікамі, вядома. Трэба сказаць, што ў мастацтве гэта яшчэ не вялікі тэрмін. Рускі мастак Аляксандр Іванаў, напрыклад, працаваў над сваім “Месіяй” амаль 22 гады, француз Энгр пісаў “Крыніцу” 40 год» [1, с. 26–27]. Старшина не представляет, о каких произведениях идет речь, а вот «Давида» он уже

увидел на фотографии в книге, потому герой снова возвращается в разговоре к нему: «Глядзі ты! Відаць, трудна. А ён хто такі, што зрабіў гэтага Давыда?» [1, с. 27]. Ученый с готовностью поясняет: «Ён італьянец, ураджэнец Фларэнцыі» [1, с. 27]. После этого очевидной становится все та же дезориентация Карпенко в истории культуры, он говорит о том, что понятно ему, что он знает об Италии: «Што – мусалінец?» [1, с. 27]. Конечно, время жизни диктатора более чем очевидно, поэтому вопрос соотнесенности эпох наконец должен быть прояснен: «Ды не. Ён жыў даўно. Гэта славуты мастак Адраджэння. Найвялікшы з вялікіх» [1, с. 27]. Фишер снова говорит об эпохе Возрождения так, как будто она если не в своей сути, то по крайней мере в своей временной характеристике должна быть известна каждому. Он не может абстрагироваться от мира искусствоведения и в полной мере осознать, что слово «давно» сказало старшине гораздо больше, чем упоминание Ренессанса.

Быков, упомянув в начале разговора двух героев биографию Челлини, через их диалог разворачивает для читателя гораздо более широкую общекультурную панораму, показывая и смену эпох, и характерные черты отдельных видов искусства, и значимые примеры произведений и их авторов. Сама книжица с биографией становится лейтмотивной характеристикой Фишера, однако этим тема искусства в повести не исчерпывается. Она развивается автором и в размышлениях Карпенко, неожиданно для себя ощутившего уважение к искусствоведу, и в воспоминаниях Фишера, который пытается осмыслить правильность своего жизненного выбора и дальнейшей судьбы.

Герой рассуждает о своем прошлом и впервые задумывается над тем, стоило ли оно потраченных лет жизни: «Ён ужо быў не надта малады – нядаўна мінуў чалавеку трэці дзясятак, і за ўсе пражытыя гады ні на адзін момант не з’явілася ў яго сумненне ў спрадвечнай сіле мастацтва. Усё самае цудоўнае, самае вечнае бачыў ён у найвышэйшым праяўленні чалавечага духу – у мастацтве» [1, с. 70–71].

Быков использует широкий общекультурный дискурс для характеристики персонажа и вместе с тем расширения нарратива повести, перечисляя мировые шедевры изобразительного искусства по названиям произведений («Блудный сын», «Джоконда», «Мессия», «Вирсавия»), описанию изображенного (катастрофа Помпеи) или упоминанию авторов (Иванов, Рубенс, Микеланджело, Вазари, др.). Идеалы прекрасного, ценностные жизненные ориентиры были заложены в Фишере именно восхищавшим его искусством. Вероятно, потому он мало интересовался повседневной жизнью, предпочитая современности давние эпохи. Неспроста брат дает герою такую характеристику: «Адстаў ты, Барыс, ад часу. Занафталініўся ў старажытнасці»

[1, с. 72–73]. Этот же аспект подчеркнут Быковым в проанализированном выше диалоге с Карпенко. Из-за своеобразного несовпадения внутренней хронологической устремленности Фишеру не совсем понятно, отчего старшина задает такие странные вопросы, ответы на которые кажутся ему ясными. Ученый как будто живет тем, что прошлое дало настоящему. Карпенко – тем, что в настоящем определяет ближайшее будущее. Эти два героя не тождественны культурно-эмпирически, но созвучны друг другу ценностно-этически. И один, и другой являются носителями схожего идеала – необходимо трудиться во благо других, для пользы общества.

Война вносит коррективы в осознание своего предназначения Фишером, заставляя его задуматься не только о правильности выбора жизненного пути, но и вообще о роли искусства. После разговора со старшиной и ночи в окопе герой начинает сомневаться в том, что искусство действительно является достойным жизненным ориентиром.

Наступившее утро было решающим для Бориса, который увидел колонну немецких мотоциклистов и понял, что необходимо ее остановить. В этой критической ситуации герой осознает близость жизненных идеалов Карпенко. Однако немного позже автор дает понять, что эти идеалы в своей сути изначально были не так чужды ученому, как могло показаться: «А ўвогуле яму было нялёгка, і ён намагаўся падбадзёрыць сябе, суцешыць тым, што і тыя геніі, якія стваралі мастацтва вечнага – і Мікеланджэла, і Чэліні, і Верашчагін, і Грэкаў – у свой час браліся за шпагу, мушкетон ці вінтоўку і выступалі на ворагаў. Відаць, барацьба за права жыць была важней за мастацтва, і ёй, пэўна, суджана перажыць яго. Гэты нечаканы вывад трохі супакоіў Фішара, і баец адчуў ужо болей сілы ў сабе» [1, с. 80]. Развязка этой ситуации показывает, что борьба за право жить не важнее искусства, а созвучна искусству, способному создать в человеке определенный моральный стержень, выковать идеал, без которого продолжение жизни невозможно в принципе. Фишер убивает фашистского офицера и почти сразу же погибает от вражеской пули сам. Финал его жизни обрисован автором символически. Гитлеровец пинает ногой сумку погибшего солдата, и оттуда вылетают «кавалак счарсцвелага хлеба, некалькі абоймаў патронаў і пашкуматаная старая кніжка ў чорнай вокладцы – “Жыццё Бенвенуто Чэліні, фларэнційца, напісанае ім самім”. Адляцеўшы ў іржышча, яна расхінулася, і ранішні вецер, які пачаў ужо разганяць туман, паціху заварушыў яе зачытаныя, пашкуматаныя старонкі...» [1, с. 81–82]. Быков как будто показывает три пласта времени – мирное прошлое, военное настоящее и вечное время искусства. И именно последнее продолжает жить, даже когда человек умирает. Страницы книжицы все еще перелистываются, а значит – есть надежда на новое созидательное начало.

Summary. The article deals with genre and stylistic peculiarities of the lyric novel form on the data of the novel «Alien Sky» by Barys Sachanka. Specific features of artistic time, narrative type, revealing of psychological characteristics of the human being are considered. The lyric novel possesses autobiographic fiction, usage of the elements of literary confession, affirmation of the world significance of the subjective vision of the relationship between man and society.

К содержанию

УДК 070:005(476)

Д.А. Нікановіч (Мінск, Інстытут журналістыкі БДУ)

КАНКУРЭНТНЫЯ ПЕРАВАГІ КАНТЭНТУ ПРЫНТ-МЕДЫЯ

Ключавыя словы: менеджмент СМІ, менеджмент кантэнту, друкаваныя медыя, прынт-платформа, канкурэнтнае медыяасяроддзе, медыяспажыванне.

Анатацыя. Артыкул прысвечаны якасным характарыстыкам кантэнту друкаванага медыя, якія забяспечваюць яму канкурэнтныя перавагі на сучасным інфармацыйным рынку. Аналізуюцца сацыякультурныя фактары ўтварэння «недружалюбнага» фону для медыяспажывання. Аўтар спрабуе вылучыць стратэгіі і тактыкі, якія забяспечваюць прынт-платформе прывабнасць у вачах чытача.

Актуальнасць заяўленай тэмы звязана з усё больш актыўным зваротам медыядаследчыкаў да пытанняў пра будучыню журналістыкі як прафесіі, а таксама да палемікі наконт «смерці» папяровай газеты. Цікава, што А. Мірашнічэнка, публіцыст, ідэйны натхняльнік папулярнай тэорыі аб сыходзе прынт-газеты ў «лепшы (лічбавы) свет», пачынаў з супрацьлеглага меркавання – пра «бяссмерце» друкаваных СМІ: «*…мне здавалася, што лёс газет залежыць ад супрацьстаяння прэсы з інтэрнэтам. <...> І ў інтэрнэту я бачыў шмат недахопаў – прастата і дэмакратычнасць аўтарства, лёгкасць доступу, лішак шуму. Усё гэта зніжала значнасць слова ў інтэрнэце і, думаў я, захоўвала значнасць слова ў класічнай газеце. А значыць, грамадская каштоўнасць слова ў газеце была па-за канкурэнцыяй, таму што забяспечвалася менавіта фізічным абмежаваннем газет-най плошчы, газетнага тыражу. Таму газеты бессмяротныя*…» [2, с. 12–13]. Пасля Мірашнічэнка прызнаецца, што памыляўся, бо аператыўнасць інтэрнэт-медыя не адзіная прычына, якая абумоўлівае цяжкае становішча прынт-газеты. Аўтар тэорыі вылучае вырашальныя для папяровых газет фактары.

1. *Новыя звычкі медыяспажывання на фоне змены пакаленняў*. Спыняецца сямейная традыцыя выпісваць газету. Сённяшнія студэнты могуць назіраць функцыянаванне газет, выпадкова чытаць іх, але «не ўмеюць» іх набываць. Прадстаўнікі апошняга газетнага пакалення нарадзіліся ў 1980-м г.

2. *Феномен «віруснага рэдактара»*. Яго сутнасць у тым, што з дапамогай шматлікіх мікрарэдактур кантэнту ў інтэрнэце (нават рэпостаў) «вірусны рэдактар» – нейкая абстрактная сукупнасць карыстальнікаў – здольны фарміраваць павестку ў маштабах вялізных суполак, чым можа замяшчаць класічныя медыя. Традыцыйныя рэдакцыі ўпраўляюцца воляй,

а «вірусны рэдактар» волі не мае. Ён стварае праблемы ўладзе і бізнесу, калі інтарэсы эліт ідуць насуперак са свабоднымі рэакцыямі мас у інтэрнэце. Грамадская значнасць пэўнай інфармацыі, паводле А. Мірашнічэнкі, сёння ў прынцыпе можа дэтэрмінавацца атрыманнем водгуку ад як мага большай колькасці «юзераў».

3. *Верагодны крызіс інфраструктуры распаўсюджвання*. Прынт-медыя, з'яўляючыся рознічным масавым таварам, маюць патрэбу ў разгалінаванай і дарагой сістэме дыстрыбуцыі. Такая сістэма будзе існаваць толькі ў тым выпадку, калі захавае парогавае напаўненне асартыментам. Калі цікавасць чытачоў упадзе ніжэй за парогавае значэнне, сетка распаўсюджвання проста не зможа працаваць – нават пры ўмове, што пэўная колькасць спажыўцоў з «газетнага пакалення» яшчэ выкажа жаданне набываць прынт-прадукцыю (рэдакцыі, страціўшы адпаведную інфраструктуру, проста не змогуць даставіць газеты) [2, с. 13–16].

У якасці ўдакладнення да нашага тэзіснага выкладу канцэпцыі А. Мірашнічэнкі можна дадаць меркаванне Б. ван дэр Хаак, М. Паркса і М. Кастэльса наконт таго, чаму друкаваныя СМІ перажываюць крызіс, а новыя медыя, наадварот, набіраюць папулярнасць. Даследчыкі адзначаюць: гэта тлумачыцца спецыфікай бізнес-мадэлі традыцыйных СМІ, якая пабудавана на платнай падпісцы альбо фіксаванай рознічнай цане. Паколькі медыякарыстальнік цяпер можа атрымліваць інфармацыю з мноства бясплатных крыніц, яго жаданне і гатоўнасць заплаціць за навінавую павестку памяншаецца. Таму некаторыя аўдыторныя групы сёння ўсё радзей абіраюць газеты і часопісы як крыніцу інфармацыі, а следам за чытачамі ў інтэрнэт сыходзяць і рэкламадаўцы [3]. Пагаршае сітуацыю з эканамічнай прывабнасцю прынт-медыя і дарагавізна паперы.

Такім чынам, журналісты і менеджары друкаваных СМІ сутыкнуліся з выклікамі часу, якія патрабуюць ад іх нагамаганняў у пошуку перспектыўных спажыўцоў у канкурэнтным медыяасяроддзі. Мяркуем, прывабнасць прынт-медыя становіцца больш відавочнай у працэсе выяўлення сацыякультурных фактараў, якія ствараюць «недружалюбны» фон для сучаснага медыяспажывання. Пералічым некаторыя з іх.

1. *Інфармацыйны шум – інфармацыйная стомленасць.* Інтэрнэт забяспечыў новы ўзровень доступу да ведаў, якія былі назапашаны чалавецтвам за ўсю гісторыю. Са з'яўленнем інтэрнэт-журналістыкі традыцыйныя СМІ страцілі манаполію на фарміраванне інфапавесткі. Цяпер моцную канкурэнцыю як газетам і часопісам, так і навінавым вэб-сайтам складаюць сацыяльныя сеткі, якія характарызуюцца звышвысокай актыўнасцю карыстальнікаў. Атрымліваецца, што кожныя суткі традыцыйныя медыя вырабляюць вялікую колькасць разнастайнага кантэнту, якому ўсё больш

складана прабіцца праз заслону інфармацыйнага шуму, генеруемага новымі і «найноўшымі» медыя.

2. *Кагнітыўны шум – абмежаваны рэсурс увагі*. Сёння абмежаваную здольнасць чалавечага мозга да канцэнтрацыі даследчыкі называюць галоўнай праблемай сучаснага грамадства, а значыць, і журналістыкі. Пераканаўча выглядае тэорыя, што феномен кагнітыўнага шуму з'яўляецца наступствам «інфармацыйнага выбуху» і невыпадкова фарміруецца ў «стагоддзе інфармацыйнай перагрузкі».

3. Уздзейнічае на псіхалогію медыякарыстальніка і *тэхнічны шум*. Віртуальная прастора, у якой фунцыянуюць інтэрнэт-выданні, напоўнена раздражняльнымі фактарамі: увагу чалавека адцягваюць месэнджары, апавяшчэнні сацыяльных сетак, электроннай пошты, таргетынгавая, кантэксная рэклама і інш. – дачытаць пэўны тэкст да канца становіцца ўсё больш складана [1, с. 7–9].

У гэтай сувязі варта падкрэсліць, што якасныя друкаваныя СМІ – патэнцыйна добрыя «фільтры» любога шуму. Чытач можа звяртацца да кантэнту, які ўяўляе сабой гатовую, прафесійна адаптаваную навінавую падборку. Адносна нізкая аператыўнасць прынт-выдання гэта не толькі не праблема, а нават яго прывілегія: сама тэхналогія вытворчасці ў сучасных варунках «выракае» газету на верыфікацыю інфармацыі і, як следства, каментаванне навін, аналітыку, нармаванасць маўлення, узважанасць ацэнак, спакойны тон і пад. Тым больш мадэль спажывання прадукцыі друкаванага СМІ прадугледжвае поўную ўключанасць чытача ва ўтвораным «канале сувязі» і яго сфакусіраванасць на прапанаваным кантэнце.

Актуальнасць апісаных вышэй «шумоў» сведчыць, на наш погляд, пра відавочную заканамернасць: чым больш каналаў і фарматаў камунікацыі, тым вышэйшы ўзровень раз'яднанасці ў соцыуме. У гэтых умовах абсалютна прагназуемым з'яўляецца попыт на камунікатыўныя аўтарытэты.

Праціўнікаў тэорыі «смерці» газет А. Мірашнічэнкі, як правіла, падзяляюць на два лагеры. Першыя нібыта адстойваюць будучыню толькі самога носьбіта – паперы (і абгрунтоўваюць гэта эмацыйна: «*так чытаць зручна, звычна, прыемна, зразумела*…»). Другія ў сваю чаргу прызнаюць друкаваныя СМІ апалагетамі журналісцкай прафесіі (г.зн. шануюць стандарты якасці газетнага кантэнту). Мяркуючы па ўсім, рацыю маюць абодва ўмоўныя лагеры, бо існуе непарыўная сувязь паміж носьбітам і кантэнтам. Менавіта папера як носьбіт забяспечыла газетнаму напаўненню неабходны ўзровень якасці. Гэта адбываецца па трох тэхнічных прычынах:

1. **Памер тэксту ў газеце лімітаваны** (плошчай і колькасцю старонак), і гэта абмежаванне (фізічнае) спараджае больш строгі, чым у інтэрнэце, адбор матэрыялаў. Канешне, якасныя тэксты сустракаюцца і на вэб-

платформе, а некаторыя прынт-выданні зусім не адпавядаюць прафесійным патрабаванням, аднак відавочна, што ўяўленне чытача пра прастату пападання пэўнага тэксту ў інтэрнэт працуе на карысць кантэнту з прынту.

2. **Кантэнт прынт-медыя нельга змяніць пасля публікацыі**: выправіць памылкі (фактычныя і стылістычныя), палітычна падкарэкціраваць меркаванні, выдаліць пэўны фрагмент, які можа справакаваць незадаволенасць аўдыторыі. У той самы час гэта можа практыкавацца ў інтэрнэце (і нават калі не практыкуецца асобнымі медыя, магчымасць такой заганнай практыкі застаецца). Сітуацыя вынікуе больш высокую адказнасць аўтараў прынт-медыя, якую адчувае і чытач. Таму каштоўнасць слова ў друку становіцца вышэйшай за слова ў анлайне, бо кантэнт прынт-медыя больш вывяраецца, а значыць, пасля падмацоўваецца даверам з боку грамадства.

3. **Прынт-платформа ўскладняе магчымасць плагіяту**. Феномен капіпасту небяспечны не толькі крадзяжом кантэнту, але і крадзяжом аўтарства. Захаванне кантэнту толькі на прынце абараняе яго эксклюзіўнасць.

Такім чынам, газетны кантэнт валодае ўнікальным статусам значнасці, што забяспечваюць яму тэхнічныя характарыстыкі носьбіта. Грамадскае ўспрыняцце інфармацыі ў інтэрнэт-прасторы, якая не мае фізічных абмежаванняў і захоўвае магчымасць маніпуляцый з тэкстам, пакуль застаецца менш высокім. **Газетны тэкст прэтэндуе на значнасць ужо фактам сваёй публікацыі**, бо этап адбору завершаны: рэдактар вылучыў, ранжыраваў ключавыя медыяпадзеі – і чытач звяртаецца да прынт-выдання за кампетэнтным «адсячэннем лішняга». Інтэрнэт-тэкст набывае патэнцыял значнасці пасля апублікавання, аднак яго яшчэ неабходна выявіць самім юзерам: кантэнту трэба дасягнуць умоўнай колькасці праглядаў, рэпостаў, водгукаў. Доля інтэрнэт-тэкстаў, якія могуць лічыцца значнымі, не сувымерная з масівам апублікаванага ў глабальнай сетцы.

Падсумоўваючы, яшчэ раз адзначым: папера як носьбіт надзяліла кантэнт прынт-медыя канкурэнтнымі перавагамі. І таму ўсё большым парадоксам падаецца тое, што менавіта паперу называюць прычынай гібелі газет. Аднак нават калі здзейсняцца прагнозы наконт эканамічнай безгрунтоўнасці прынт-медыя з-за высокай цаны на сыравіну і тыпаграфскія паслугі, наконт «адмірання» навыку гартаць старонкі і жадання за гэта плаціць, газеты, несумненна, выпрацавалі стандарты якасці кантэнту, якія будуць каціравацца яшчэ доўга. Ключавыя з іх: **павышаная значнасць** (у сілу кампетэнтнага ранжыравання, фільтрацыі шумоў); **дакладнасць** (дзякуючы скрупулёзнай праверцы, якая ажыццяўляецца ва ўмовах адносна нізкай аператыўнасці); **нармаванасць** маўлення; **аналітычнасць, экспертнасць, каментарыйнасць, ацэначнасць** (з прычыны высокай эксклюзіўнасці, унікальнасці аўтарства).

Усе пералічаныя характарыстыкі кантэнту (яго канкурэнтныя перавагі) склаліся гістарычна, ствараюць аўтарытэтнасць друкаванай газеце, забяспечваюць ёй высокую ступень даверу. Таму і канчатковай адмовы ад асобных тыпаў прынт-медыя не адбудзецца, пакуль застанецца попыт аўдыторыі на якасны і спецыфічны кантэнт. Так, перспектыўнымі для паперы лічацца дзелавыя, спецыялізаваныя выданні, якія ўзмацняюць прэстыжнасць і элітарнасць мэтавай аўдыторыі выдання, бо захоўваюць манаполію на пэўную інфармацыю, звесткі, веды. І нават калі крызіс паперы ўсё ж такі мае фатальнасць, тым не менш, рана гаварыць пра смерць журналістыкі: інтэрнэт-медыя накіраваліся за набыццём (пераняццем) тых жа пераваг кантэнту, што выпрацаваліся ў друкаваных медыя. Асабліва гэта праяўляецца ў іх арыентацыі на карыстальніка-інтэлектуала, дасведчанага, вопытнага, спакушанага чытача. Відаць, прынт-газеты не апошнія заступнікі прафесіі.

Такім чынам, канкурэнтныя перавагі кантэнту якасных прынт-медыя разглядаюцца сёння як прафесійныя стандарты, маюць здольнасць праецыравацца на іншыя медыяплатформы, аднак у сваім архаічным выглядзе пакуль яшчэ забяспечваюць друкаваным СМІ ўплывовасць і з высокай доляй верагоднасці дазволяць гэтую ўплывовасць захаваць.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Как новые медиа изменили журналистику. 2012–2016 / А. Амзин, А. Галустян, В. Гатов [и др.] ; под науч. ред. С. Балмаевой и М. Лукиной. – Екатеринбург : Гуманитарный ун-т, 2016. – 304 с.

2. Мирошниченко, А. Когда умрут газеты? / А. Мирошниченко. – М. : Книжный мир, 2011. – 224 с.

3. Смирнова, О. Печатные медиа в эпоху цифровых технологий [Электронный ресурс] / О. Смирнова. – Режим доступа: https://istina.msu.ru/publications/article/5832709/. – Дата доступа: 28.02.2017.

Dzmitry Nikanovich (Minsk)

COMPETITIVE ADVANTAGES OF THE PRINT MEDIA CONTENT

Keywords: mass media management, content management, print media, print platform, competitive media environment, media consumption.

Summary. The article is devoted to the qualitative characteristics of the print media content, that provide it a competitive advantage in today's information market. The social and cultural factors of formation of the «unfriendly» background for media consumption are analyzed here. The author tries to highlight the strategies and tactics that make the print platform appealing to the reader.

К содержанию

УДК 004.77; 316.77

О.В. Новоселова (Тверь, ТГСХА)

ФАКТОРЫ КОММУНИКАТИВНОЙ СПРАВЕДЛИВОСТИ МЕДИЙНЫХ СООБЩЕНИЙ

Ключевые слова: коммуникативная справедливость, дискурс, прагматика.

Аннотация. Статья посвящена описанию прагматического воздействия медийных сообщений на массового адресата с позиций категории коммуникативной справедливости. Автор предлагает ряд факторов, комплексный учет которых способствует оценке медийных сообщений как коммуникативно справедливых. Медийные коммуникативно справедливые сообщения формируют коммуникативно справедливый медийный дискурс, который занимает особое место в интерактивном пространстве в связи с его тематическим разнообразием и специфическими целями.

В настоящее время, характеризующееся процессом глобализации и трансформированием системы морально нравственных норм, в средствах массовой информации важное значение придается таким ценностям современной культуры, как толерантность, искренность, правдивость, вежливость, тактичность, словесный этикет, речевое милосердие, справедливость. Данные ценности занимают особое место в пространстве медийного дискурса, так как их соблюдение или несоблюдение ежедневно становится тематикой различных медийных сообщений, выпусков новостей или телепередач.

Это подтверждается тем, что в современном международном медийном пространстве актуальна проблематика, связанная с освещением вопросов установления отношений между представителями различных государств, служб, организаций (например, ажиотаж по поводу прогнозов о будущих российско-американских отношениях). Характерно, что журналисты особое внимание уделяют нравственной стороне взаимоотношений государств и их граждан, акцентируя свое внимание на следующих неоднозначных вопросах: *справедливо ли отвечать агрессией на агрессию; толерантно ли оказывать гуманитарную помощь представителям других государств; тактично ли отвечать вежливостью на агрессию?*

Другими словами, современный массовый адресат медийного дискурса находится в *тематически разнородном* интерактивном пространстве, содержащем противоположные точки зрения на одни и те же явления, события, факты, что во многом затрудняет процесс оценивания и интерпретации медийных сообщений. Кроме того, имея возможность получать информа-

цию из различных источников, массовая аудитория зачастую оказывается под влиянием сформированных национальных и культурных стереотипов (например, запуск в интернет-пространстве хештега #Russiansdidit).

Осложняет ситуацию оценивания медийных сообщений массовым адресатом и то, что каждое такое сообщение проходит через личностные или субъективные, «без рационального фильтра» представления о жизненном порядке и получает определенные оценки. В частности, одно и то же медийное сообщение получает оценку тематического содержания и оценку его прагматического воздействия на адресата, т.е. оно подвергается субъективной оценке адресата по принципу «нравится»/«не нравится» тема, содержание, авторский стиль изложения материала, а также оно оценивается с точки зрения его уместности в дискурсивном пространстве, его прагматического воздействия на массового адресата или, точнее говоря, с позиции его коммуникативной справедливости.

По этой причине представляется актуальным обратить внимание на прагматическую оценку медийных сообщений с позиций категории коммуникативной справедливости [1; 2]. Действительно, использование тех или иных языковых средств для маркирования иллокутивного намерения в пространстве медийного дискурса может расцениваться массовым адресатом как коммуникативно справедливое или несправедливое воздействие. Очевидно, что современный медийный дискурс представлен двумя прагматическими разновидностями: коммуникативно справедливый и коммуникативно несправедливый.

При этом принципиально важно не отождествлять категорию коммуникативной справедливости с категориальной сущностью справедливости в ряде других гуманитарных наук – философии, политологии и социологии, так как коммуникативная справедливость представляет собой универсальную коммуникативную категорию, маркируемую системой речевых действий, а не категорию, связанную с процессом обмена какими-либо ценностями. Так, коммуникативная справедливость медийных сообщений основана на учете адресантом следующего комплекса факторов.

Во-первых, для оценки медийного сообщения как коммуникативно справедливого необходим учет адресантом организации коммуникативного воздействия – таких функционально-семантических условий реализации медийных дискурсивных практик, как своевременность, уместность в ситуации, нацеленность на фокусную группу получателей. Кроме того, такое сообщение не должно опережать ситуацию предварительными поспешными выводами, а также не опаздывать (по сравнению с другими изданиями) в освещении актуальной проблематики.

Во-вторых, немаловажную роль в оценке прагматического воздействия медийных сообщений играют их иллокутивные характеристики, несмотря на то, что медийное пространство не ограничено каким-либо набором (архивом) иллокутивных действий. Тем не менее доминирование какого-либо одного иллокутивного типа высказываний в медийном дискурсе также не будет способствовать оценке таких высказываний как коммуникативно справедливых. Так, многократное и единообразное построение медийного дискурса по типу «обвинение» перестает оказывать прагматическое воздействие на массового адресата (например, обвинения в адрес России по поводу агрессии в ряде стран, а также вмешательство в предвыборные кампании ряда стран).

В-третьих, напомним, что только по языковой репрезентации коммуникативного намерения определить коммуникативную справедливость не представляется возможным. Однако нельзя утверждать, что средства поверхностной манифестации медийных сообщений не оказывают влияния на их прагматическую оценку, к тому же яркий заголовок материала быстрее привлечет внимание адресата. В связи с этим важно отметить, что для эффективности воздействия медийных сообщений на фокусную группу средства их языковой репрезентации должны быть понятны адресату, не содержать большого количества иностранных слов, неоднозначных терминов и определений.

В-четвертых, для оценки прагматического воздействия медийных сообщений важно отметить, что категория коммуникативной справедливости базируется на пресуппозиционных параметрах сообщений, которые известны массовому адресату или могут быть им проверены. Поэтому соответствие медийного сообщения этому фактору способствует обоснованному изложению материала с опорой на общеизвестные факты или на неопровержимые (непротиворечивые) доказательства. Ярким примером коммуникативно несправедливого медийного дискурса являются утверждения об атаках русских хакеров, которые не подкреплены доказательствами.

В-пятых, коммуникативно справедливым можно назвать такое медийное сообщение, которое ориентировано на массового адресата, т.е. на людей с разными точками зрения, и которое не содержит готовых однозначных выводов, а предоставляет возможность массовому адресату самостоятельно проанализировать обращенное к нему сообщение и сделать выводы относительно его прагматической направленности. Так, при наличии у адресанта медийного сообщения цели обвинить кого-либо в совершении противоправных действий достаточно перечислить проступки, дав возможность массовому адресату оценить иллокутивную цель сообщений.

Таким образом, медийное коммуникативно справедливое сообщение представляет собой такую естественно-языковую практику, в которой адресант учитывает указанные выше факторы и преднамеренно не изменяет содержание и интенциональную направленность своего сообщения с целью оказать манипулятивное воздействие на массового адресата, но выгодное для адресанта. Примечательно, что оценка коммуникативной справедливости медийного сообщения основана на комплексном учете перечисленных выше факторов и во многом зависит от коммуникативно-социальных условий его реализации.

Важно отметить и то, что медийные коммуникативно справедливые сообщения формируют коммуникативно справедливый медийный дискурс, который занимает особое место в интерактивном пространстве в связи с его тематическим разнообразием, специфическими целями и применимостью в различных сферах деятельности человека. Кроме того, основная функция медийных коммуникативно справедливых сообщений заключается в создании такого интерактивного пространства в медийном дискурсе, в котором массовый адресат сможет оценить все сообщения как коммуникативно справедливые.

Список использованной литературы

1. Новоселова, О. В. Феномен «справедливого слова», или О прагматической категории коммуникативной справедливости [Электронный ресурс] / О. В. Новоселова // Мир лингвистики и коммуникации. – 2016. – № 1. – С. 62–71. – Режим доступа: http://tverlingua.ru/archive/043/07_043.pdf. – Дата доступа: 02.10.2017.

2. Романов, А. А. Коммуникативная справедливость: прагматический подход / А. А. Романов, О. В. Новоселова // Межкультурная коммуникация: теория и практика: сб. науч. трудов XV Междунар. науч.-практ. конф. – Томск : Изд-во Томского политех. ун-та, 2016. – С. 146–151.

Olga Novoselova (Tver)

COMMUNICATIVE FAIRNESS FACTORS OF MEDIA MESSAGES

Keywords: communicative fairness, discourse, pragmatics.

Summary. The article describes the pragmatic effect of mass media messages from the position of their communicative fairness. The author proposes a complex of factors which contribute to the evaluation of media messages as communicative fair. Media communicative fair messages form communicative fair media discourse which has a special place in the interactive space due to its thematic diversity and specific aims.

К содержанию

УДК 070(476)(043.3)

А.Г. Петроченко (Брест, БрГУ имени А.С. Пушкина)

КОММУНИКАЦИОННОЕ ИЗМЕРЕНИЕ ИННОВАЦИОННОГО ПРОЕКТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ: РЕГИОНАЛЬНЫЙ АСПЕКТ

Ключевые слова: инновация, информационная коммуникация, потенциал СМИ, регион, медиацентр.

Аннотация: Государственная программа инновационного развития Республики Беларусь, являясь одним из флагманов социально-экономического развития страны, для повышения эффективности реализации нуждается в детализации взаимодействия СМИ с субъектами инновационного комплекса. Региональные центры трансфера технологий обладают большим информационным потенциалом и способны увеличить долю инновационных сообщений в СМИ. В связи с этим автор статьи вводит понятие новой институциональной единицы – медиацентр.

Региональные массмедиа являются особым сегментом в национальной системе СМИ и в национальной инновационной системе, создавая реальную детальную информационную картину в конкретном экономико-административном регионе. Для поддержания здорового инновационного информационного климата на региональном уровне требуется освоение новых коммуникационных механизмов для интеграции ресурсов научных открытий, технических разработок из сферы внедрения и массового производства через СМИ гражданам, которым адресован продукт инновационной деятельности. Рассмотрим динамику сотрудничества медиа с иными участниками регионального уровня национальной инновационной системы на примере обобщенной модели взаимодействия вовлеченных в создание инновационного продукта звеньев, выделив рамочные блоки: государство (органы власти, институты), инноватор (совокупность инвестора, производственного предпринимателя и носителя идеи) и потребитель инновации (граждане). СМИ – коммуникатор между взаимодействующими блоками.

Государство выступает как инициатор, регулятор создания, продавец, заказчик и потребитель инновационного продукта. Конкретизация функций, ролей, механизмов воздействия и взаимодействия, задач и стратегий происходит в контексте формирования основополагающих направлений экономического развития, исходя из которых инновационный путь является определяющим. Блок «государство» является наиболее предсказуемым компонентом в данной коммуникационной модели: деятельность регламентируется

нормативными актами. Государство обладает способностью масштабно (а не локально) влиять на развитие национального инновационного проекта. Включив в национальную инновационную стратегию понятия «журналистика инноваций», «сотрудник внимания» и «инновационная коммуникационная система», государство создаст дополнительные стимулы для участников процесса в развитии себя и своих отношений друг с другом.

Блок *«инноватор»* представлен совокупностью участников инновационной инфраструктуры, сопровождающих производство инновации (до стадии коммерциализации – новшества). К субъектам инновационной инфраструктуры относятся: технопарки, центры трансфера технологий, венчурные организации, организации по финансированию и страхованию инноваций, иные юридические лица в случаях, предусмотренных законодательными актами.

Следует понимать разницу между инновационным маркетингом и инновационной коммуникацией. Задача инновационного маркетинга заключается в оптимизации введения на рынок и, следовательно, распространения и внедрения новых продуктов среди клиентов, партнеров и конкурентов [5, с. 5]. Цель инновационной коммуникации – в обеспечении благоприятных условий для инновационного цикла на протяжении всего инновационного процесса во избежание потенциальной оппозиции со стороны других участников.

Блок «инноватор» формирует технически ориентированный информационный компонент в инновационной коммуникационной парадигме, где новая технология имеет, по крайней мере, одну из следующих пяти характеристик: *еще развивается технологическая база* (основная технология быстро развивается и открывает новые возможности для прогресса); *по-прежнему растет проникновение на рынок* (наиболее общие области применения еще не достигли насыщения даже в самых предполагаемых пользовательских группах); *по-прежнему расширяется сфера применения* (новые виды использования технологии по-прежнему изобретаются часто); *до сих пор отсутствует представление товара* (основные технологические идеи не до конца понятны широкой общественностью); *чувство нового* [2, с. 22].

Блок «*потребитель инновации»* представляет вариантный образ, отдельное лицо или группу, рассматриваемые как реципиент инновационного продукта, как участник реализации государственного инновационного заказа, как носитель инновационных идей, коррелятор и транслятор внутренних и внешних факторов инновационного процесса. На протяжении инновационного цикла отмечается неравномерность коммуникационного процесса и различная степень потребности в привлечении СМИ для оптимизации реализации инновационной задачи.

На этапе «*государство – инноватор*» коммуникации присуща изолированность в доступе третьим лицам, определенная закрытость для СМИ (ввиду незавершенности научно-исследовательской и/или опытно-конструкторской разработки либо коммерческой или другого вида тайны). Речь идет о внутреннем уровне инновационной коммуникации, где процесс отвечает за регулирование системы взаимоадаптации и взаимосоответствия элементов инфраструктуры инновационной системы.

В фазе «*государство – потребитель инновации*», где СМИ по-прежнему придерживаются задачи оптимизации инновационного процесса, реализация видится как планомерное всестороннее информирование граждан об основах государственной инновационной политики, что приводит к постепенному формированию особого общественного мышления, открытого к инновационной деятельности, а значит, содействующего расширению спроса на инновации, увеличению креаторов инноваций, развитию предпринимательства в научно-технической сфере.

Важным звеном является формирование системы интересов, побуждающих к инновациям [3]. Когда интересы людей совпадают с интересами государственной социально-экономической стратегии развития, человеческие ресурсы получают эффективную аккумуляцию и распределение по областям идеологических интересов государства. Этот феномен объясняется тем, что общественное сознание является информационным отражением явлений, происходящих в социальной системе. СМИ – это и поставщик сообщений об инновациях, и база данных о потребностях населения в них.

Роль информационной коммуникации значительно усиливается на стадии кооперации «*инноватор – потребитель инновации*», когда инновационный цикл выходит на завершающую стадию создания новшества, которой сопутствует тиражирование специализированной информации (каталоги высокотехнологичных товаров, инновационных проектов и разработок, бюллетени регистрации разработок, информационно-аналитические издания).

Центр трансфера технологий (ЦТТ) оказывает услуги по информационному продвижению новшеств и/или продукции, технологий, услуг, организационно-технических решений, созданных на основе новшеств, посредством организации участия субъектов инновационной деятельности в проведении выставок, ярмарок, конференций и других мероприятий, изготовления рекламно-информационной продукции [1]. Инициаторами коммуникации являются структуры, нацеленные информировать стратегически выгодный сегмент рынка, характер коммуникации формируется посредством запросов потенциальных потребителей товара, где в образе потребителей, как правило, выступают субъекты хозяйствования, государственные структуры, промышленные предприятия, а не физические лица. Трансфер информации

в массмедиа через ЦТТ является открытым каналом [4; 6], но часто направлен на тематическую аудиторию, содержит специфическую лексику. Трудности у журналистов вызывает научный стиль изложения, что препятствует переработке материала для создания адаптированного для широкой общественности публицистического текста. Кроме того, инновации зачастую весьма сложны для описания из-за высокой степени абстракции, что приводит к нежеланию представителей СМИ освещать направление.

В связи с мультипрофильностью выполняемых задач (организация мероприятий, поиск партнеров, диффузия информации, выпуск рекламно-буклетной продукции, образовательные мероприятия и др.) целесообразно иметь отдельную институциональную единицу (*медиацентр*), задачи которой сведутся к предоставлению качественного контента для дальнейшего тиражирования в массмедиа. Данное нововведение видится актуальным по той причине, что в региональном контексте блок инновационной по содержанию информации для массовой аудитории формируют в основном (исключение составляют сообщения информационных агентств) специализированные сайты со слабой системой продвижения в интернет-среде. Производство силами медиацентра уникальной ленты новостей (доступный язык изложения, указание контактной информации, сопутствующая историческая справка, иллюстрации, инновационные подходы в презентации информации и оформлении материала) должно способствовать увеличению интенсивности инновационных сообщений в региональных массмедиа. Процесс трансфера информации из ЦТТ в социум через СМИ видится более продуктивным, если подключить к работе уже существующие ресурсы ЦТТ с максимальным использованием их информационного потенциала (рис. 1):

Рисунок 1 – Информационные потоки в инновационной инфраструктуре

Отсутствие детализированного механизма взаимодействия СМИ с субъектами инновационного комплекса в нормативно-правовом простран-

стве Беларуси не умаляет роли данного института в реализации национальной инновационной программы. СМИ на микро- и макроуровнях выступают общественным механизмом легитимаций инновационных задач государства. Региональные ЦТТ обладают большим информационным потенциалом, который можно использовать для увеличения доли инновационных сообщений в СМИ. Работа новой институциональной единицы в системе ЦТТ будет способствовать утверждению трансфера инновационно активной информации из блоков «инноватор» и «государство» обществу.

Список использованной литературы

1. Владимиров, П. Трансфер технологий: белорусский вариант / П. Владимиров // Директор. – 2009. – № 12. – С.59–62.

2. Kauhanen, E. Innovation, Journalism and Future. Final report of the research project «Innovation Journalism in Finland» / E. Kauhanen, E. Noppari. – Finland : Tekes. – 2007. – 92 p.

3. Kawasaki, G. The art of the start. The time-tested, battle-hardened guide for anyone starting anything / G. Kawasaki. – USA : Portfolio. – 2004. – 226 p.

4. Линчевская, О. С. Оценка коммерческого трансфера технологий в Беларуси: современные тенденции / О. С. Линчевская // Экономический бюллетень НИЭИ Министерства экономики Республики Беларусь. – 2007. – № 10. – С. 4–16.

5. Maisch, B. Innovation Communication in Virtual Worlds: A Mullitple Case Study Analysis in Second Life / B. Maisch, K. Tobies // Innovation Journalism. – 2010. – Vol. 7, № 9. – P. 1–21.

6. Шульгин, Д. Б. Проблемы и опыт трансфера технологий / Д. Б. Шульгин // Наука и инновации. – 2008. – № 12. – С. 63–65.

Hanna Petrachenka (Brest)

COMMUNICATION MEASUREMENT OF THE REPUBLIC OF BELARUS' INNOVATION PROJECT: REGIONAL ASPECT

Keywords: innovation, information communication, mass media potential, region, media centre.

Summary. The State Innovation Development Program of the Republic of Belarus, being one of the flagships of the socio-economic development, requires detailed media interaction with the subjects of innovation complex in order to improve the efficiency of its implementation. Regional technology transfer centers have great information potential and are able to increase the share of innovation communications in media. In this regard, the author introduces the concept of the new institutional unit – a media centre.

К содержанию

УДК 070.32(091) “1921/1939”

П.С. Рамановіч (Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна)

НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЭМАКРАТЫЧНЫ ДРУК У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

Ключавыя словы: друкаваныя выданні, Заходняя Беларусь, нацыянальна-дэмакратычны друк.

Анатацыя. У артыкуле разглядаюцца асноўныя друкаваныя выданні нацыянальна-дэмакратычнага руху у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Беларускія выданні шырока асвятлялі пытанні грамадска-культурнага, палітычнага, рэлігійнага жыцця насельніцтва Заходняй Беларусі. Нацыянальна-дэмакратычны друк садзейнічаў захаванню нацыянальна-культурных каштоўнасцей, развіццю барацьбы беларусаў за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

Мірны дагавор, які быў падпісаны 18 сакавіка 1921 г. у Рызе прадстаўнікамі Польшчы, РСФСР і УССР, абвяшчаў: стан вайны паміж імі спынены. Паводле Рыжскага дагавора частка заходнебеларускіх зямель (Гродненская губернія, усходнія раёны Віленскай і заходнія раёны Мінскай губерній) адышла ва ўладанне польскай дзяржавы. На тэрыторыі Заходняй Беларусі (больш за 100 тыс. кв. км) пражывала звыш 4 млн. чалавек, у тым ліку беларусы складалі 67 %, палякі – 12–13 %, яўрэі – 9 %, украінцы – 5–6 %, літоўцы – 3 %, рускія – 2 % [3, с. 221].

Прававы статус нацыянальна-культурнага жыцця этнічных супольнасцей у межах польскай дзяржавы вызначаўся як Версальскім 1919 г., так і Рыжскім 1921 г. дагаворамі. У артыкуле VII Рыжскага мірнага дагавора сцвярджалася, што “Польшча прадстаўляе асобам рускай, украінскай і беларускай нацыянальнасцей на аснове раўнапраўя нацыянальнасцей усе правы, што забяспечваюць свабоднае развіццё культуры, мовы і выканання рэлігійных абрадаў” [2, с. 626–627]. Абавязкі адносна аховы інтарэсаў жыхароў Польшчы былі прадубліраваны ў артыкулах польскай канстытуцыі 1921, 1935 гг.

Палітыка кіраўнікоў польскай дзяржавы на тэрыторыі Заходняй Беларусі мела вялікадзяржаўны, шавіністычны, каланізацыйны накірунак. Беларусы разглядаліся як этнаграфічная група, яны не маглі займаць не толькі кіруючых пасад, але і працаваць на дзяржаўнай службе. У дзяржаўных установах не дазвалялася карыстацца беларускай мовай, культурнае жыццё беларускага народа пастаянна абмяжоўвалася

і падаўлялася. У паланізацыі беларускага насельніцтва значную ролю адыгрывала каталіцкая царква. Да лета 1929 г. у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне больш за 1300 праваслаўных храмаў былі пераўтвораны ў касцёлы [1, с. 89]. Нацыянальная палітыка польскага ўрада ставіла мэту фарміраваць у літоўцаў, беларусаў, украінцаў польскую грамадзянскую свядомасць, пераконваць іх, што Другая Рэч Паспалітая з'яўляецца іх Айчынай. Польскія ўлады праводзілі асіміляцыю беларускага насельніцтва праз друк, школу, каталіцкую царкву.

У такіх умовах у Заходняй Беларусі фарміруецца дэмакратычны лагер, які акцэнтаваў сваю дзейнасць у абарону палітычных, сацыяльных і нацыянальных інтарэсаў беларусаў. Беларускі нацыянальна-дэмакратычны рух (КПЗБ, БСРГ, БПК, Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя, сялянска-рабочы клуб "Змаганне") знайшоў сабе вялікае кола прыхільнікаў сярод розных навуковых, гаспадарчых, культурна-асветніцкіх арганізацый (ТБШ, Народны Хаўрус "За Бацькаўшчыну", Беларуская хрысціянская дэмакратыя, беларускія эсэры і інш.).

Разам з дэмакратычным рухам фарміруецца нацыянальна-дэмакратычны друк. У 1923–1924 гг. у Вільні на беларускай мове выдавалася газета беларускага нацыянальна-вызваленчага руху "Змаганне" (выйшаў 31 нумар) (арт. "Апетыты банкрутаў", "Беларуская школьная справа", "Небяспечны культ", "Ад канстытуцыі да паліцыі" і інш.). Значную ўвагу газета аддавала палітычным працэсам у Польшчы і за яе межамі, асвятляла дзейнасць эмігранцкага ўрада Беларускай народнай рэспублікі (БНР), пісала пра здабыткі беларускай культуры ў БССР. Існаваўшая ў 1927–1930 гг. легальная рэвалюцыйна-дэмакратычная арганізацыя працоўных Заходняй Беларусі "Змаганне" выдавала газеты нацыянальнага кірунку "На варце", "Свет", "Світанак", "Да працы", "Праца" і інш. [4, с. 450].

Газета "Голас беларуса", дэмакратычнага кірунку, выдавалася ў Вільні ў 1924 г. на беларускай мове, выйшаў 21 нумар. Крытычна аналізавала палітычнае і эканамічнае становішча ў Польшчы, шмат увагі аддавала задачам беларускага вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі (арт. "Рашучая часіна", "Беларускае пытанне за граніцай", "Рэалізацыя ідэі незалежнасці" і інш.), пісала пра парушэнне правоў нацыянальных меншасцей, пра злоўжыванні польскай адміністрацыі і паліцыі да насельніцтва Заходняй Беларусі.

Газета "Беларуская доля" – грамадска-палітычны орган Беларускага пасольскага клуба (БПК), выдавалася на беларускай мове ў 1925 г. Вялікую ўвагу газета надавала пытанням нацыянальна-вызваленчага руху, садзейнічала развіццю палітычнай свядомасці народа, уздымала аграрнае

пытанне (арт. “Сельскі пралетарыят”, “Асадніцтва і абшарнікі” і інш.), друкавала выступленні ў сейме беларускіх дэпутатаў П. Валошына, Б. Тарашкевіч і інш. Дэпутаты БПК у 1925 г. наладзілі выданне ў Варшаве беларускамоўнага рэлігійнага часопіса “Праваслаўны беларус”, на старонках якога змяшчаліся матэрыялы па грамадска-палітычным і рэлігійным жыцці ў Заходняй Беларусі.

Праваслаўнае беларускае палітычнае аб’яднанне (узнікла ў 1927 г.) наладзіла ў Вільні выданне царкоўна-грамадскага часопіса “Беларуская зарніца”, у публікацыях якога адлюстроўваўся стан хрысціянскай царквы, гісторыя праваслаўнай канфесіі ў Беларусі.

Галоўная ўправа ТБШ выдавала “Бюлетэнь ТБШ”, газету “Шлях”, часопіс “Летапіс ТБШ”. Навукова-папулярныя публікацыі па гісторыі Беларусі, краязнаўстве, аб зберажэнні культурнай спадчыны, аб канцэпцыях паходжання беларусаў друкаваліся ў часопісах “Шлях моладзі” (1929–1939), “Студэнцкая думка” (1924–1929, 1928–1930), “Калоссе” (1935–1939). На старонках часопіса “Беларускі летапіс”, у выданні якога прымалі ўдзел дзеячы забароненага ТБШ, прапагандавалася самаадукацыя на беларускай мове. “Беларуская думка”, штотыднёвы грамадскі, літаратурны і сельскагаспадарчы часопіс, які выдаваўся ў Гродне ў 1930–1932 гг. на беларускай мове, асвятляў беларускі грамадскі рух на Гродзеншчыне, пісаў пра падзеі ў Польшчы, СССР і БССР, друкаваў матэрыялы па пытаннях рэлігіі, права, сельскай гаспадаркі.

“Беларуская газета” легальна выдавалася ў Вільні на беларускай мове ў 1933–1934 гг. (забаронена на 17 нумары). Прапагандавала ўз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР, выступала супраць нацыянальнага ўціску, абараняла інтарэсы працоўных Заходняй Беларусі. Намаганнямі беларускіх паэтаў і пісьменнікаў у 1933 г. у газеце была надрукавана дэкларацыя з’езда (снежань 1933 г.) заходнебеларускіх пісьменнікаў, якая заклікала ўсіх пісьменнікаў гуртавацца дзеля творчай работы “для народа і разам з народам” [4, с. 424].

“Сялянская праўда”, газета прагрэсіўнага кірунку, выдавалася ў Вільні ў 1924 г. на беларускай мове 3 разы на тыдзень (выйшлі 34 нумары). Выкрывала палітыку польскага ўрада ў дачыненні да нацыянальных меншасцей краіны, актывізавала грамадскую думку ў змаганні за беларускую школу, асвету.

Беларускія выдавецтвы (Беларускае выдавецкае таварыства, Выдавецтва ТБШ, Выдавецтва Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Выдавецтва Б.А. Клецкінай і інш.) у большасці размяшчаліся ў Вільні. У выданні беларускіх газет і часопісаў удзельнічалі прадстаўнікі

беларускай інтэлігенцыі М. Танк (Я. Скурко), П. Пестрак, В. Таўлай, М. Засім, Л. Родзевіч, публіцысты А. Альшэўскі, А. Луцкевіч, А. Станкевіч, навукоўцы Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, У. Дварчанін. Заходнебеларускае насельніцтва станоўча ўспрымала іх публікацыі.

У пачатку 1930-х гг. рэжым "санацыі" ажжыццявіў захады "Закон аб сходах" (1932 г.) па абмежаванні грамадскіх правоў, а ў 1936–1937 гг. кіруючыя колы Польшчы прыступілі да ліквідацыі беларускіх школ, арганізацый, газет. Забарона польскімі ўладамі дзейнасці заходнебеларускіх культурна-асветніцкіх і нацыянальна-дэмакратычных арганізацый адмоўна паўплывала на становішча нацыянальнага друку ў Заходняй Беларусі. Беларускі друк жорстка праследаваўся з боку ўлад і паліцыі. Беларускія газеты і часопісы забараняліся, канфіскоўваліся, штрафаваліся друкарні, у якіх яны выдаваліся. З-за рэпрэсій назвы газет часта мяняліся. Калі ў 1927 г. легальна выдаваліся 23 беларускія газеты і часопісы, то ў 1930 г. іх стала 12, а ў 1932 г. – 8 [4, с. 423].

Такім чынам, пад уплывам нацыянальна-дэмакратычнага друку заходнебеларускае грамадства ўцягвалася ў культурна-асветніцкі, палітычны рух у абарону сваіх правоў.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыцце Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч.– Брэст : БрДУ, 2008. – 319 с.

2. Документы внешней политики СССР. 1 июля 1920 – 18 марта 1921 г. – М. : Политиздат, 1959. – Т. 3. – 722 с.

3. Касцюк, М. П. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2-х ч. / М. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш. – Мінск : Беларусь, 1995. – Ч. 2. – 560 с.

4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т.; рэдкал. : Г. П. Пашкоў (галоўн. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996. – Т. 3. – 527 с.

Pavel Romanovich (Brest)

NATIONAL-DEMOCRATIC PRESS IN WESTERN BELARUS (1921–1939)

Keywords: printing issues, Western Belarus, national-democratic press.

Summary. The article considers the main printing issues of national-democratic movement in Western Belarus during inter-war period. Belarusian publications widely highlighted the problems of public-cultural, political, social-economic, religious life of the population of Western Belarus. National-democratic press contributed to the preservation of national-cultural values, the development of struggle of the Belarusians for social and national freedom.

К содержанию

УДК 821.111 Трэверс.09-343.4

В.А. Рогалев (Гомель, ГГУ имени Ф. Скорины)

ПОНЯТИЙНЫЙ МИР ЧЕЛОВЕКА В ПРОИЗВЕДЕНИЯХ ПАМЕЛЫ ТРЭВЕРС О МЭРИ ПОППИНС

Ключевые слова: картина мира, концепт, сказка, Памела Трэверс, тематические группы слов, идея, образ, мифология, семантика

Аннотация. Рассматривается специфика сказочной картины мира, анализируются некоторые концепты из произведений всемирно известной писательницы Памелы Трэверс.

Идеи сказочных повестей Памелы Трэверс «Мэри Поппинс» и «Мэри Поппинс возвращается» сфокусированы на человеке, его мировосприятии и миропонимании и полнятся назидательным философским смыслом, реализованным в аллегорической форме на примере образов детей.

В главе «Тяжелый день» из сказочной повести «Мэри Поппинс возвращается» Джейн оказалась в далеком прошлом, возможно, в одной из предшествовавших своих жизней. Произошло это после того, как девочка раскапризничалась, начала выражать недовольство буквально всем, что ее окружало, и особенно своим положением старшего ребенка в семье, к которому предъявляются повышенные требования. Вывод из случившегося с Джейн очевиден: человек должен довольствоваться тем, что имеет; настоящая его жизнь – обязанность; она предопределена прошлым жизненным опытом; отказываясь от настоящего, человек не имеет будущего, время поворачивается вспять.

Этим эпизодом – невероятным путешествием во времени в прошлое – Памела Трэверс подчеркивает также относительность бытия, которое всегда только миг между прошлым и будущим. Время «консервируется» и как бы останавливается лишь в старинных предметах – наподобие того фарфорового блюда с изображенными на нем тремя мальчиками, бегающими по круглому зеленому лугу, где могла навсегда остаться капризная Джейн.

Поскольку у каждого человека своя судьба, каждый идет по своей жизненной дороге и выполняет предначертанную ему миссию, но в то же время имеет свободу воли, что позволяет достигать тех или иных целей наиболее короткими путями. Аллегорически эта мысль выражена Памелой Трэверс следующим образом.

Дети были в парке со своей няней и встретили там Старушку, продававшую надувные шарики. Всем досталось по шарику, а когда их надували, на шариках вырисовывалось имя его обладателя. Затем шарики взлетали, а вместе с ними – Майкл, Джейн, Джон, Барби и Мэри Поппинс с малышкой Аннабел на руках. Вскоре в воздухе оказались и другие люди – знакомые по сюжету повестей и незнакомые. Впереди всех летела Мэри Поппинс. Каждый из летевших держал в руках шарик со своим именем.

«Шарик шарику рознь, – говорила Старушка. – Для каждого человека на свете есть подходящий шарик, – лишь бы он сумел его выбрать! Выбирайте, не спешите! Иной возьмет не тот шарик – и вся жизнь у него пойдет кувырком!»

На примере Джейн и Майкла в сказочной повести «Мэри Поппинс» реализуется концепт **«дети»**. Эти герои Памелы Трэверс воспринимают всё то, что происходит по воле их няни или с ее участием, как реальность, без свойственного взрослым скептицизма и недоверия. Это согласуется с мнением ученых о том, что детям в большей степени, чем взрослым, свойственны восприятие духовно-энергетических миров и способность вступать в контакт с их обитателями.

Концепт «дети» органично дополняется близким по смыслу концептом **«близнецы»**. Близнецам Джону и Барбаре (Барби) посвящена одна из глав сказочной повести «Мэри Поппинс» – «История близнецов». Эти младенцы в интерпретации Памелы Трэверс понимают то, что говорит Скворец, разговаривают с солнечным лучом, но как только им исполняется год, утрачивают такую способность.

Согласно эзотерическому учению, которое было известно Памеле Трэверс, человек непосредственно после рождения некоторое время находится на границе между земной материальной и высшей идеальной реальностью, а затем теряет непосредственную связь с духовно-энергетическими мирами и постепенно на протяжении периода детства «погружается в материю».

Вот характерный в плане этих рассуждений фрагмент текста, который следует после того, как Мэри Поппинс сказала близнецам, что они вскоре забудут, что понимали язык Скворца, деревьев, солнечных лучей и звезд (русский перевод Бориса Пастернака):

«Скворец насмешливо засвистел.

– Будьте покойны, все забудете! – повторил он. – Вы не виноваты, конечно, – добавил он мягче. – Просто тут ничего не поделаешь. Нет ни одного человека, который бы помнил после того, как ему стукнет самое большее год. За исключением, конечно, ее. – Он указал клювом на Мэри Поппинс.

– А почему она может помнить, а мы нет? – сказал Джон.

– А-а-а! Она не такая, как все. Она – редкое исключение. Она вне конкуренции! – сказал Скворец, ухмыляясь.

Джон и Барби молчали.

Скворец продолжал объяснения:

– Она – единственная в своем роде…»

Концепты «дети» и «близнецы», таким образом, являются реализациями более общих концептов **«человек»** и **«внутренний мир человека»**, которые в первой повести о Мэри Поппинс облечены в форму развернутой аллегории при изложении необычайной истории Рыжей Коровы.

Долгие годы жила Рыжая Корова на лугу спокойной, размеренной жизнью и твердо была уверена в том, что лучшей жизни, чем у нее, быть не может. Мир Рыжей Коровы был ограничен одним лугом, и она ничего не знала о землях, которые лежали за пределами её луга.

Жизнь Рыжей Коровы резко изменилась, когда она подхватила на рога Падучую звезду. Теперь она уже не паслась на лугу и не жевала жвачку, а беспрестанно танцевала.

Современные драматурги не обходят вниманием и многогранность современной жизни. Молодежь сегодня ищет ответы в первую очередь на вопросы современной жизни. Герой, близкий по возрасту и по социальному статусу, находит большее сопереживание и у читателя, и у зрителя. Так, мелодрама «Ким» А. Дударева повествует о сложностях современной жизни в материальном и духовном планах. Произведение построено на противопоставлении добра и зла, альтруизма и корыстолюбия. Молодые герои мелодрамы выживают не только физически, но и морально, при этом спасают еще и «заблудшую душу». Это драматическое произведение имеет огромный гуманистический потенциал, так как демонстрирует молодежи возможность духовно противостоять обществу потребления.

Георгий Марчук в драме «Письма солдату» показывает будни современной белорусской армии. Эта пьеса разрабатывает совсем новую для отечественной драматургии тему, но чрезвычайно важную для юношей, которым предстоит служба в армии. Драматург скрупулезно раскрывает духовный, чувственный мир героев, для которых преодоление трудностей армейской жизни становится основой формирования характера.

Социально-психологическая драма Елены Поповой «Домой» рассказывает читателю о перипетиях современной жизни молодых людей в Германии. Главные герои – эмигранты, которые ищут себя в новых условиях жизни. Тема, поднятая Е. Поповой, сегодня является чрезвычайно актуальной для молодежи, которая стремится любыми способами достичь материального благополучия, нередко ищет его далеко от родного дома.

Современная белорусская драматургия стремится сохранить накопленное народом и продвигать новое, популярное в молодежной среде. Белорусские драматурги способствуют сбережению традиций народной культуры, созданию условий для ее саморазвития, что является неотъемлемой частью государственной политики в области культуры.

Современная белорусская драма совершенствует жанрово-тематическое поле произведений, при этом активно развивает националь-

ные драматургические традиции. Это дает возможность драматургам реконструировать всю полноту человеческого бытия и создавать для молодежи социально-культурные ориентиры.

Valiantsin Smal (Brest)

**GENRE AND THEMATIC SPECIFICS
OF THE YOUNG PEOPLE`S BELARUSIAN PLAY**

Keywords: dramaturgy, play, genre, subject, classification.

Summary. In publication you can find the genre-themed classification of the modern Belarusian dramatic composition for the youth. There are some characteristics of genre features and thematic priorities of modern plays. You can make a conclusion that the most popular in drama plays for the young readers are historical plays and plays about modern life of our society.

К содержанию

УДК_821.161.1 – 92:165.742

В.Н. Смаль (Брест, БрГУ имени А.С. Пушкина)

ЛИТЕРАТУРА КАК СРЕДСТВО ВОСПИТАНИЯ ГУМАНИСТИЧЕСКИХ ИДЕАЛОВ (НА ПРИМЕРЕ КНИГИ А.М. ЮДИЦКОГО «БЕСЕДА. “ВСТРЕЧИ” И “ЛИЦА”: АВТОГРАФЫ»)

Ключевые слова: публицистика, мировоззрение, периодика, автор, публикация.

Аннотация. В публикации определены основные социально-культурные ориентиры в книге А.М. Юдицкого «Беседа. “Встречи” и “Лица”: Автографы»). Выявлена взаимосвязь мировоззрения молодого человека с изменением общественной и культурной ситуации в стране. Автором книги проанализирован жизненный опыт разных поколений публицистов и писателей, в котором определяются мировоззренческие установки современного молодого человека.

История периодической печати Брестской области сегодня еще недостаточно изучена не только в хронологическом аспекте, но и в личностно-творческом ракурсе. На протяжении вековой истории периодики Брестчины со страниц газет с читателями общались не просто журналисты, но и талантливые мастера слова. О тех, кто проявил талант в публицистике и художественном слове, рассказывает Александр Юдицкий в книге «Беседа. “Встречи” и “Лица”: Автографы» (2015). Это книга о целой плеяде талантливых брестских журналистов старшего поколения (П. Сутько, А. Иванов, С. Иваненко, Г. Томашевич) и их не менее талантливых преемниках (А. Логвинович, В. Туров, А. Крейдич, Е. Гармель).

В современной журналистике активно пропагандируется постулат «факт важнее комментария», который, по сути, тормозит развитие творческого начала в среде журналистов, но автор вышеназванной книги открывает читателю грани именно творческого таланта работников СМИ.

Документально-художественная проза является одним из источников формирования гуманистических идеалов молодежи. Документальный материал часто более убедителен для молодых людей, которые сопереживают реальным героям книги. Именно к молодому поколению преимущественно обращены основные идеи автора.

Александр Юдицкий обобщил публицистику и художественное слово самых талантливых авторов газетных публикаций, у которых ярко прослеживается гуманистическая позиция. Автор не скрывает своей гражданской и по-

литической позиции, главный принцип в которой– искренность и самоотверженность в служении обществу и человеку. Именно этой морально-нравственной доминанте подчинены публицистические и художественные произведения, включенные в книгу «Беседа. “Встречи” и “Лица”: Автографы»: «Реликвии» П. Сутько, «Ангел мой, будь со мной» Е. Гармель, «Воспоминания о том апреле» С. Иваненко и др.

Публицистический труд А. Юдицкого является, по сути, пособием по творческому мастерству журналиста, где можно найти образцы творческого становления личности журналиста: «Александр Курашов: “Как я Брежнева… удалил!”» А. Логвиновича, «Читать училась по “Заре”» Е. Гармель и др. Эти истории – яркий пример честности по отношению к людям и к тому делу, которому отдаешься без остатка.

Положительной особенностью публицистического труда Александра Юдицкого является то, что журналистика не выделяется как нечто особенное, как вид деятельности по сбору, обработке и распространению информации; журналистику автор видит как часть жизни, даже как саму жизнь. Именно поэтому в поле его зрения не только журналисты, но и выдающиеся люди, состоявшиеся в разных профессиях: западнобелорусский подпольщик, партизан, историк и писатель Василий Ласкович, художники Петр Данелия и Натали Шайон, патофизиолог и общественный деятель Александр Богомолец и др. Выбор личностей для сборника предопределила нравственная позиция автора: «Но есть люди, для которых потребление – не главное, сохранившие убеждение, что жизнь должна строиться по законам совести и справедливости. Надо трудиться. Растить детей. Строить свою страну» [1, с. 8].

На первом плане в публицистике Александра Юдицкого – исследование человеческой души, раскрытие морально-нравственного потенциала каждой близкой по духу автору личности. В предисловии к книге «Лица» Анатолий Крейдич точно подметил особенности прозы Александра Юдицкого: «Книга как цельное произведение полностью выдерживает заданную магистральную этическую направленность и вполне отражает идейно-эмоциональный потенциал писателя, хотя в основу повествования заложен конкретный фактический материал» [1, с. 14]. Верность данному творческому кредо прослеживается и в этом публицистическом труде. А. Юдицкий проводит своеобразный психоанализ в единстве с историко-культурным срезом общества. Автор книги «Беседа. “Встречи” и “Лица”: Автографы» не скрывает своих политических убеждений, которые могут кому-то и не понравиться, но неизменно вызовут уважение в их отстаивании. Александр Логвинович в публицистике Юдицкого отмечает как одно из главных качеств искренность: «Автор искренен не только с персо-

нажами, а посредством их и с читателями, но и, что очень важно для писателя, с самим собой – с собственными воспоминаниями, убеждениями. Он не играет ими, не подстраивает их под определенные жизненные ситуации или в угоду политическим веяниям» [1, с. 10–11]. Именно искренность становится мерилом высокой оценки творческого труда А. Юдицкого не только читателями, но и коллегами по цеху.

Очень важной идейно-стилевой особенностью книги «Беседа. “Встречи” и “Лица”: Автографы» является понимание автором творческой задачи каждого подобранного текста, как своего, так и других творческих людей. В каждом произведении проявляется авторская позиция – поэтизировать действительность, наполнить духовным смыслом человеческую жизнь. Литературное творчество для автора – неотъемлемая часть духовного наполнения общественной жизни. Именно по этой причине подобраны очень тонкие, проникновенные стихотворения В. Турова и Г. Томашевича, раскрыта уникальность коллективной монографии «Литературная карта Берестейщины», отмечен феномен поэтического фестиваля «Лунинецкая осень».

Автор сборника через всю книгу проводит идею о сути человеческой жизни – быть порядочным в любых ситуациях. Именно по этому принципу и отобраны лучшие творческие работы брестских журналистов. Так, не может оставить равнодушным читателя проблемный очерк Петра Сутько «Реликвии». В основу этого произведения положена история семейной драмы Василия Андреевича – ветерана Великой Отечественной войны и труда. У человека, который с честью шел по жизни, вырос сын-подонок. Автор «Реликвии» заставляет задуматься в первую очередь тех, кто ищет легкие пути в жизни, забывая при этом о морально-нравственных принципах.

Для А. Юдицкого люди, о которых он пишет, в первую очередь личности, на которых можно и нужно равняться. Тексты, выбранные для примера, ярко иллюстрируют жизненное кредо каждого из представленных героев «Беседы…». Александр Моисеевич подчеркивает мудрость своих коллег по цеху. У Александра Иванова в материале «Приглашаем к разговору» публицист выделяет умение точно и правильно расставлять акценты: «Но история – дама сама себе на уме. У нее не только вчера, но есть и сегодня. И это еще надо подумать, что важнее. Вчерашних ошибок, согласитесь, не исправить. Главное – сегодня их как можно меньше сделать» [1, с. 39]. В интервью Александра Логвиновича со спортивным комментатором Александром Курашовым обращение к молодежи демонстрирует принцип профессионального становления не только журналиста, но и профессионала в любой области:

«– В своей профессии Вы, пожалуй, добились всех вершин. Как думаете, за счет чего?

– Талант и труд. Талант – это голос, которым я наделен от Бога. А все остальное – титанический труд. К каждому репортажу необходимо тщательно готовиться: халтуры зрители, слушатели не прощают» [1, с. 51].

Основная цель книги публицистики А. Юдицкого – передача молодежи жизненного опыта. В своих наблюдениях за событиями последних десятилетий автор предостерегает молодых людей от опрометчивых и ошибочных решений, учит восхищаться жизнью во всех ее проявлениях.

Список использованной литературы

1. Юдицкий, А. М. Беседа. Встречи и Лица: Автографы / А. М. Юдицкий. – Брест : Брестская типография, 2015. – 340 с.

Valiantsin Smal (Brest)

LITERATURE AS A WAY OF BRINGING UP THE HUMANISTIC IDEALS (AS AN EXAMPLE OF A.M.YUDICKI`S BOOK «CONVERSATION. MEETINGS. FACES. AUTOGRAPHS»)

Keywords: journalism, world view, periodicals, author.

Summary. In publication you can find the main social and cultural landmarks of the book. It determines the relationship between the world view of the young people and changes in public and cultural situation in the country. The author analyses the life experience of different generations of sociopolictal journalists and writers, in which he determines the world view points of modern young man.

К содержанию

УДК 821.161.3

Вяч.М. Смаль (Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна)

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫ ДЫСКУРС: ВЫТОКІ, СПЕЦЫФІКА, ТРАДЫЦЫІ

Ключавыя словы: аўтарская мадальнасць, суб'ектыўнасць, інтэрсуб'ектыўнасць, аўтарскія і чытацкія стратэгіі, рэцэпцыя, дыскурсіўныя стратэгіі, публіцыстычны дыскурс.

Анатацыя. У артыкуле разглядаецца спецыфіка мастацка-публіцыстычнага дыскурсу канца XX ст. у нацыянальнай літаратуры, прасочваецца абумоўленасць ідэйна-мастацкага зместу твораў, вызначаецца месца мастацкай публіцыстыкі ў беларускай літаратурнай традыцыі. Мастацкі тэкст асэнсоўваецца праз прызму праблемы рэцэпцыі, аналізуецца як прадукт узаемаадносін аўтара і адрасата. Вызначаецца своеасаблівасць публіцыстычнага дыскурсу ў структуры мастацкіх тэкстаў.

Уводзіны. З другой паловы XX ст. літаратура і публіцыстыка сталі па-сапраўднаму масавымі. Аднак нягледзячы на аднолькавае выкарыстанне імі шматлікіх прыёмаў аргументацыі, уздзеяння, пабуджэння, слоўнага майстэрства, менавіта мастацкая літаратура не змагла даць грамадству аператыўны, аб'ектыўны, поўны і праўдзівы адказ на актуальныя, у тым ліку «забароненыя» пытанні, і паказаць канкрэтныя шляхі іх вырашэння, зафіксаваць і спрагназаваць змены ў адносінах чалавека да свету. Гэтую ролю паспрабаваў узяць на сябе інтэграваны род слоўнага мастацтва – мастацкая публіцыстыка.

З'яўленне шэрагу твораў аўтабіяграфічнай, мемуарнай, дакументальнай публіцыстыкі супала з абуджэннем цікавасці чытацкай аўдыторыі да крытыкі, аналізу, праўды, дакументальнасці, гісторыі. Пашырэнне факталагічнага матэрыялу ў мастацкай літаратуры было абумоўлена пераломнымі зрухамі грамадскай свядомасці ў пасляваенны час, калі новы змест не мог заставацца ў межах гатовых, традыцыйных форм мастацкай творчасці, калі ў пэўным сэнсе дэмакратызаваная эпоха напоўніла вядомыя і раней жанры асаблівым зместам аб агульных гераізме, трагедыі, лёсах.

Літаратуразнаўцамі (Ю.М. Тынянаў, В.М. Жырмунскі, Л.Я. Гінзбург і інш.) была адзначана вядучая ў літаратуры тэндэнцыя трансфармацыі традыцыйнай жанравай сістэмы і нават адмірання жанравага мыслення, з'яўлення пазажанравых твораў, фарміравання кантэкстаў поліжанравага тыпу (цыклы, серыі, дыскурсы і інш.), успрыняцце якіх як мастацкага

адзінства было абумоўлена цэласнасцю дыялагічных адносінаў аўтара і чытача. З'яўленне новага тэрміналагічнага паняцця «дыскурс» не супала з адпаведнай яго інтэрпрэтацыяй, у выніку і сёння тэрмін «дыскурс» разглядаецца па-рознаму: як кола твораў, як творчасць групы мастакоў і нават як пэўная тэма і праблематыка.

Адпаведна са з'яўленнем твораў новага фармату пачала зменьвацца методыка іх прачытання і інтэрпрэтацыі: акцэнты тэкстуальнага аналізу ў шэрагу замежных навукоўцаў былі змешчаны ад аўтара і тэксту да чытача, узрасла цікавасць даследчыкаў да праблемы рэцэпцыі мастацкіх тэкстаў. У асяроддзі літаратуразнаўцаў, тэарэтыкаў літаратуры з'явіліся такія паняцці, як «адкрытасць твора» (У. Эко), «пластычнасць тэксту» (Х. Яўс), «патэнцыйнае мноства тэксту» (В. Ізэр), якія былі закліканы ілюстраваць ідэю існавання не адзінага, раз і назаўсёды створанага пэўнага тэксту, а тэксту ў неабмежаваным мноства сваіх прачытанняў. Кожнае прачытанне твора, паводле новага кірунку тэкстуальнага аналізу, разглядалася як новая рэцэпцыя.

Рэцэпцыя і аўтар мастацкага твора. Рэцэпцыя як успрыняцце, ацэнка, інтэрпрэтацыя ўяўляе сабой нейкі ўнікальны працэс, які ў канчатковым плане рэалізуецца ў пэўны вынік уплыву тэксту на асобу чытача, яго мысленне, светабачанне і ўспрыняцце наступных тэкстаў. Такім чынам у чытача складваецца пэўная карціна свету, якая праецыруецца на іншыя творы. Чытач у гэтым сэнсе не поўнасцю вольны ў сваёй рэцэпцыі твора, а знаходзіцца пад уплывам самога тэксту, які вызначае кірунак яго думкі. Паводле тэарэтыка рэцэптыўнай эстэтыкі Х.Р. Яўса, у рэцыпіента складваецца «гарызонт чакання», які ўяўляе сабой комплекс псіхалагічных, сацыяльна-палітычных, эстэтычных і іншых уяўленняў у адносінах аўтара да грамадства і чытача да твора. Спрабуючы прасачыць генезіс рэцэптыўнай прасторы мастацкага тэксту, А.І. Мемедулаева слушна адзначае, што «рэканструкцыя гарызонту чакання, у якім тэкст ствараўся ці ўспрымаўся ў мінулым, дапамагае ўзнавіць гісторыю рэцэпцыі дадзенага тэксту і ўпісаць яго ў гістарычны працэс эвалюцыі літаратуры» [3, с. 1].

Рэцэпцыя мастацкага твора – гэта заўсёды рэцэпцыя пэўнага мастака, аднак яго асоба ўспрымаецца чытачом як асоба пэўнай культурнай прасторы. Чытач стварае для сябе нейкую «зону даверу» шляхам прыняцця або непрыняцця, перагляду дыскурсу і суаднясення яго з уласным вопытам. Такім чынам, тэкст уяўляе сабой прадукт узаемадзеяння аўтара і адрасата, сродак выражэння канфлікту паміж інтэрсуб'ектыўнасцю як патрэбай дасягнення ўзаемапаразумення з субяседнікам і захаваннем уласнай ідэнтычнасці як патрэбы абмежаваць сябе і іншых, выказаць сваю самасць, індывідуальнасць. У сувязі з гэтым, паводле М.М. Бахціна, і аўтар, і адрасат знаходзяцца пад уплывам сваёй сацыяльнай і культурнай прасторы, а

любы мастацкі твор уяўляе сабой «бясконцы і незавершаны дыялог, у якім ні адзін сэнс не памірае» [4, с. 1]. У кожнага наступнага чытача, чарговага пакалення сэнсы, ідэі, праблемы, якія былі закрануты аўтарам у творы, «ажываюць» у адноўленым выглядзе, а найчасцей іх імпліцытны змест, іх аўтарскі модус можна спасцігнуць толькі праз асэнсаванне адпаведнай ім культурнай прасторы.

Французскі вучоны Р. Барт выступіў з пастулатам аб тым, што толькі чытач здольны даць сапраўдную ацэнку мастацкаму твору, пры гэтым адлучыўшы тэкст ад пісьменніка, вызваліўшы тэкст ад аўтарскай «тыраніі інтэрпрэтацыі» (Э. Ауэрбах). Сваю пазіцыю Р. Барт тлумачыў тым, што пісьменнік вядзе дыскурс з уяўным чытачом, а чытач – з рэальнай асобай аўтара. Пісьменнік, па-сутнасці, існуе для стварэння тэксту, а не для яго інтэрпрэтацыі і нараджаецца з яго ўзнікненнем. Прачытанне сутнасці тэксту залежыць ад уяўленняў адрасата, а не ад пазіцыі пісьменніка.

У процівагу такой пазіцыі выступіў шэраг даследчыкаў (Ю.І. Айхенвальд, І.Р. Гальперын, Н.С. Валгін, А.М. Рэмізаў, А.П. Скафтымаў і інш.), якія адмаўлялі антрапацэнтрычнасць чытача, адводзілі яму другасную пазіцыю ў камунікатыўным полі. Сапраўды, калі ў старажытнасці роля аўтара не мела такой статуснай важнасці, многія тэксты (казкі, апавяданні, быліны) прымаліся чытачом без пытання пра ідэнтычнасць аўтара, то ў сучаснай культурнай парадыгме літаратурны дыскурс патрабуе «абавязковага» аўтара, які вызначае цэласнасць успрыняцця твора, аўтарытэтнасць і каштоўнасць тэксту.

Чытацкае ўспрыманне твора амбівалентнае: з аднаго боку, чытач верыць аўтару і нават спрабуе спасцігнуць асобу мастака, яго творчую волю і супаставіць яе з уласнай духоўнай ініцыятывай; з іншага боку – чытач спрачаецца з аўтарам, не давярае яму або нават адвяргае творчую канцэпцыю аўтара, яго светапогляд. Чытач пры гэтым можа прысутнічаць у многіх тэкстах у канкрэтызаваным выглядзе.

У публіцыстычным дыскурсе пісьменнік часта разважае пра свайго чытача, вядзе з ім гутарку, «прагназуе» яго думкі і словы, спрабуе прадугадаць чытача-адрасата (кола моладзі, інтэлігенцыя, грамадска актыўныя колы) і гарызонт яго чаканняў, а разам з тым парушыць гэтыя чаканні, стварыўшы нешта новае, арыгінальнае, нечаканае, якое задаволіць прагу эстэтычнага насалоджання, пашырэння кругагляду, эмоцыйных перажыванняў, далучэння да свету рэальнага і фантастычнага, да духоўных каштоўнасцяў аўтара.

Вызначальную ролю аўтара ў камунікатыўнай прасторы пацвярджаюць і сучасныя замежныя пісьменнікі (напрыклад, С. Макбрайд), якія адзначаюць, што, нягледзячы на эпоху выдання твораў у інтэрнэце, попыт чытачоў

на прыватныя сустрэчы з пісьменнікам, на магчымасць падпісаць любімую кнігу не зніжаецца. Чытачам мала чытаць твор, ім важна весці непасрэдную маўленчую камунікацыю, дыялог з аўтарам.

Напрыканцы XX ст. змяніўся воблік аўтара публіцыстычных твораў нацыянальнай літаратуры, адпаведна трансфармавалася яго роля ў камунікатыўнай прасторы сучаснай культуры. Калі раней функцыя аўтара ў публіцыстычных творах зводзілася да тлумачэння дыскурсу, то з 1970–1990-х гг. XX ст. аўтар (А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік, Д. Гранін і інш.)пачынае выконваць псіхолага-прагнастычную ролю ў адносінах да чытача. Ён прагназуе чытацкую атрыбуцыю апісаных грамадскіх феноменаў, юрыдычную мяжу дазволенасці, ступень вербалізацыі схаваных сэнсаў, «недагаворанасці», узгодненасць з пазіцыяй іншых аўтараў і меркаваннямі чытачоў. У выніку, з аднаго боку, пашыраецца поліінтэрпрэтатыўнасць тэкстаў (дыялагічнасць, інтэртэкстуальнасць), павышаецца тэкстаўспрымальны і інтэрпрэтатыўны патэнцыял чытача, стымулюецца яго зацікаўленасць, а з другога – узмацняецца модус аўтарскай ацэнкі (антрапацэнтрычнасць). Аўтар акцэнтуе важнасць пэўных выказванняў іх паўторам, кампазіцыйнай пастаноўкай у пачатак і канец тэксту, рэплікамі і ўчынкамі персанажаў, сродкамі мастацкай выразнасці, што заўсёды прадугледжвае ўзаемадзеянне двух модусаў – аўтарскага і чытацкага. Дыялог аўтара і чытача становіцца асноватворным у дынамічнай сістэме сэнсаў публіцыстычнага твора.

Чытач (адрасат) у працэсе ўспрымання публіцыстычнага дыскурсу карэкціруе свае ўяўленні, супастаўляючы іх з пазіцыяй самога аўтара да закранутай праблемы. Мастак у сваю чаргу актывізуе цікавасць чытача, чакае з яго боку адваротнай рэакцыі на мэтавыя задумкі, выбірае пэўную дыскурсіўную стратэгію (камунікатыўную, сэнсаўтваральную, маўленчую), арганізуе ўзаемадачыненні тэксту і пазатэксту (кантэксту, інтэртэксту, падтэксту, гіпертэксту), выбірае тыя жанрава-стылёвыя дамінанты, якія найлепшым чынам садзейнічаюць камунікатыўнаму сумысленню, аналізу, дыскусіі аўдыторыі і пісьменніка. Аўтар імкнецца прытрымлівацца своеасаблівага «генетычнага рытуалу», суадносіць свае ўчынкі з уяўленнямі пра статус пісьменніка ў грамадстве (дае інтэрв'ю ці адмаўляе, акрэслівае жанравае вызначэнне твора ці пакідае гэта для чытача, супрацоўнічае з літаратурнымі аб'яднаннямі ці адвяргае іх, прадстаўляе твор для ацэнкі чытачам часопісаў ці не, працуе ў пэўных жанрах, піша прадмовы і інш.). Аўтар можа самастойна класіфікаваць свой твор («медытацыі», «эсэ», «фантазіі», «гісторыі», «думкі», «успаміны» і інш.) і тым самым здольны пашырыць сінгулярнасць чытацкага ўспрымання.

Такім чынам, сучасны публіцыстычны дыскурс дэтэрмінуе значнасць аўтарскага модуса, у якім суб'ектна-ацэначная пазіцыя аўтара дапамагае чытачу ў спасціжэнні імпліцытных сэнсаў тэкстаў. У публіцыстычным дыскурсе выяўляюцца спецыфічныя мадэлі ўзаемадачыненняў аўтара і чытача, якія ўлічваюць сістэму канцэптуальна-сэнсавых установак і суб'ектыўных уяўленняў рэпрэзентанта і асобасныя аспекты ментальнай прасторы інтэрпрэтатара. У выніку падобныя ўзаемадачыненні аўтара і чытача пашыраюць камунікатыўную прастору сучаснага публіцыстычнага дыскурсу, праецыруюць яго ў жыццё грамадства ў цэлым.

Своеасаблівасць літаратурнага дыскурсу ў структуры мастацка-публіцыстычнага твора. Праблема структурнага аналізу літаратурнага дыскурсу з'яўляецца ў літаратуразнаўстве супярэчлівай і да канца не вырашанай, у тым ліку і таму, што аналітыкі праблемы дыскурсу (П. Бурдзье, Н. Аруцюнава і інш.) не схільны размяжоўваць унутраны і знешні тэкст, а сам дыскурс разглядаюць як своеасаблівую прастору існавання шэрагу твораў. У гэтым сэнсе асаблівасці сюжэтна-кампазіцыйнай структуры, формы, жанру мастацка-публіцыстычнага твора мэтазгодна разглядаць праз прызму літаратурнай традыцыі.

Мастацкая публіцыстыка ў нацыянальнай літаратуры зарадзілася ў 70-х гг. XX ст. пасля выхаду ў свет твораў С. Смірнова «Брэсцкая крэпасць» (1956) і «Героі блока смерці» (1963), якія адкрылі новы накірунак ваеннай прозы, заснаванай на дакументальных успамінах жывых сведкаў падзей. Сёння пашыранай застаецца думка пра тое, што беларуская і савецкая ў цэлым літаратура перажывала ў гэты час пэўны крызіс. Сапраўды, пісьменнікамі (У. Гросман, Ю. Бондараў, Р. Бакланаў, Б. Васільеў, К. Сіманаў і інш.) было напісана мноства твораў пра Другую сусветную вайну, т.з. «аптымістычных трагедый», у якіх адлюстроўваўся адзінкавы або масавы гераізм людзей, эпапейны маштаб вайны.

Нягледзячы на супярэчлівыя грамадска-палітычныя абставіны і складаныя варункі літаратурнага жыцця ў 70-я гг., у эпоху т.з. застою, мастацтва слова не стаяла на месцы, а працягвала развівацца ў рэчышчы жанрава-стылёвых пошукаў (з'явіліся арыгінальныя аповесці-эсэ, раманы-эсэ, дакументальныя аповесці і інш.) і спараджала тыя тэндэнцыі, без якіх не магло быць як літаратуры 80–90-х гг. XX ст., так і тагачасных сацыяльна-палітычных перамен у грамадстве. Шэраг пісьменнікаў гэтага часу выявіў імкненне да «глабальнай рэфлексіі» наконт лёсу сучаснага чалавецтва, напрыклад, праз асэнсаванне старонак мінулага, апеляцыю да агульналюдскіх каштоўнасцей.

У рэчышчы падобных літаратурных пошукаў знаходзілася і постаць А. Адамовіча, які сваімі творамі «Хатынская аповесць» (1972), «Я з вогненнай вёскі» (1973), «Блакадная кніга» (1977–1981), «Карнікі» (1980) засведчыў значны мастацка-эстэтычны патэнцыял нацыянальнай публіцыстыкі, які змог рэалізавацца ва ўмовах сацыяльнай заангажаванасці і ідэалагічнай скіраванасці нацыянальнага мастацкага слова савецкай эпохі. Аўтар «Хатынскай аповесці» закрануў як сацыяльныя, так і прыватныя праблемы, якія раскрываліся пераважна праз прызму сацыяльнай пазіцыі. Спецыфіка яго творчай манеры заключалася ў перадачы чытачу гранічна насычанай сацыяльнай інфармацыі, што абумовіла зварот да своеасаблівага вобраза лірычнага героя – роздумнага, аналізуючага, паглыблена крытычнага. Пры гэтым пазіцыя аўтара да пэўных з'яў і фактаў сацыяльна-ацэначная, зразумелая і абгрунтаваная.

«Хатынская аповесць» – твор дзённікавага плану, у якім выразна прагледжваецца храналагічная занатоўка падзей 1943–1953 гг., асэнсаванне асабовага лёсу героя Фларыяна і сацыяльнага жыцця ў яго руху. Публіцыстычны дыскурс А. Адамовіча прэзентаваны як своеасаблівая сацыяльная рэфлексія з выразным выхаваўчым падтэкстам, які фарміруе светапоглядную пазіцыю, каштоўнасныя арыентацыі чытачоў. Аўтар «Хатынскай аповесці» імкнецца пераканаць, сфармаваць пэўную грамадскую пазіцыю лагічнасцю, аргументаванасцю, аб'ектыўнасцю, дакументальнасцю выкладу мастацкага матэрыялу. Гэта абумовіла дзве характэрныя рысы публіцыстычнага дыскурсу А. Адамовіча: з аднаго боку, філасофска-паглыблены аналітыка-рацыяналізм, з дугога – медытатыўна-спавядальная эмацыйнасць, якія пазней былі падхоплены і ўдасканалены прадаўжальнікамі (С. Грахоўскі, А. Алексіевіч і інш.) ў пэўныя тэндэнцыі мастацка-публіцыстычнага дыскурсу.

Паводзіны і ўчынкі герояў аўтар ацэньвае з філасофскага пункту гледжання, спрабуючы даць не проста стэрэатыпную ацэнку «добра», «хараша», «дрэнна», «некарысна», але і вынайсці першавытокі ўчынкаў, супаставіўшы іх з соцыумам, масавай свядомасцю грамадства. Аўтар пафілософску засяроджана інтэрпрэтуе абставіны, якія ўплывалі на падзеі ваеннага часу, імкнецца зразумець камунікатыўныя інтэнцыі агідлівай сутнасці чалавека: эгаізму, жорсткасці, палахлівасці, рабскай пакорлівасці, нечалавечага прыніжэння асобы, абыякавасці да чужога гора і сваёй смерці. Герой аповесці па сваёй натуры даволі супярэчлівы: ён наіўны, мяккі, далікатны, але разам з тым настойлівы, жорсткі і помслівы да нелюдзяў. Ён імкнецца зразумець станоўчае і адмоўнае ў чалавеку, які апынуўся ў антычалавечых умовах, асэнсоўвае глабальныя праблемы чалавецтва, асуджае любую вайну праз успаміны пра драматычныя падзеі

В’етнама. Аўтар «Хатынскай аповесці» звяртаецца да дыялога з чытачом своеасаблівага рытарычнага плану, як бы спадзеючыся на пэўную адукаванасць і дасведчанасць рэцыпіентаў, што абумовіла наяўнасць у тэксце адпаведных моўных канструкцый: «І справа не ў тым, каб доўга жыць, а ў тым, ці больш свабоднымі былі б яны, амаль бессмяротныя, ці яшчэ трэба памеркаваць-падумаць? Ці не рабскае гэта жаданне, прынамсі, на сённяшняй планеце, – жыць і жыць?» [1, с. 89]; «Ці не па другім вітку ідзём? Ці не той самы разумны рэфлекс падштурхоўвае, «падначвае» нас разбегчыся зноў, цяпер па ўсім Млечным Шляху?» [1, с. 109].

Творча-эстэтычная канцэпцыя Адамовіча выразна раскрываецца праз эмацыйныя карціны ваеннага быту, праз акцэнтацыю ўвагі на голад, холад, смерць родных, знішчэнне селішчаў, вымушаныя перасяленні, растанне з каханымі, хваробы і інваліднасць, стрэс і псіхічныя навантажанні людзей. Падкрэсленым згушчэннем трагедыйнасці і аўтарскай ацэнкай падзей мастак як бы будаваў мадэль абмежаванняў на альтэрнатыўнае прачытанне будучых тэкстаў падобнай тэматыкі і праблематыкі.

Сінкрэтызм формы, у якой аб’яднаны проза з дакументалістыкай, назіраецца і ў кнізе «Я з вогненнай вёскі» (1973), напісанай разам з Янкам Брылём і У. Калеснікам. У гэтым творы ўспаміны жыхароў спаленых вёсак, тых, хто перажыў жахі вайны, праз «іншы», дакументальны, тэкст стваралі своеасаблівую інтэртэкстуальнасць публіцыстычнага дыскурсу, уплывалі на яго інфарматыўнасць і сацыяльнае гучанне, актуалізавалі сувязь зместу з мінулым і абумоўленасць цяперашняга і будучага.

Аналітычна, псіхалагічна заглыблена, эмацыйна непасрэдна выкладзены рэальныя факты, сітуацыі, падзеі ваеннага часу і ў аповесці «Блакадная кніга» (1977–1981), напісанай сумесна з Д. Граніным. У гэтым творы аўтарамі былі выкарыстаны архіўныя матэрыялы, дзённікі, фотадакументы, мемуары, якія сталі асновай своеасаблівага жанру «дакументальна-збіральнай прозы», «рэпартажна-дакументальнай прозы», «эпічна-харавой прозы» [2, с. 40], паводле вызначэння А. Адамовіча. Арытмічны, парывісты сюжэтны выклад, уключэнне ў тканіну твора «чыстай» публіцыстыкі знарок прытарможвалі ход фабульнага развіцця і тым самым павялічвалі ўнутраны канфлікт, скіроўвалі чытача да аналітыкі. Сам пісьменнік спрабаваў вызначыць і адносіны мастака і адрасата публіцыстычнага дыскурсу, у якім аўтарам, на яго думку, з’яўляецца масавы стваральнік, а пісьменнік выступае ў ролі лінзы, якая факусуе найбольш актуальнае, важнае, значнае і перадае чытачу.

А. Адамовічам выразна выяўлена скіраванасць публіцыстычнага дыскурсу на чытача канца XX ст. – прынцыповага, адукаванага, прагматычнага, які давярае ў большай ступені рэальным, дакументальным фак-

там, чым мастакоўскім разважанням і фантазіям. У гэтым плане заканамерны яго зварот у творах да газетных заставак, айчынных і замежных архіўных дакументаў, успамінаў сведкаў трагедыі Другой сусветнай вайны, беларусаў, якія перажылі жудасныя падзеі мінулага.

Такім чынам, на прыкладзе творчасці А. Адамовіча, У. Калесніка, Янкі Брыля можна ўбачыць, што структура мастацка-публіцыстычнага твора характарызуецца шматузроўневасцю, утворанай сукупнасцю чытацкай і аўтарскай думак, аб'яднаннем у адной форме эматыўных, канататыўных і кагнітыўных сэнсаў твора, у якіх паяднаны аб'ектыўнае і суб'ектыўнае, рэальнае і выдумка, што спрыяе цэласнасці ўспрыняцця літаратурнага дыскурсу. У творчасці А. Адамовіча выразна выявілася адна з вядучых тэндэнцый публіцыстычнага дыскурсу канца XX ст. – шматузроўневасць структуры мастацкага твора, паступовае выкрышталізоўванне такіх жанравастуктурных дамінант, як насычанасць тэксту рэмінісцэнцыямі, алюзіямі, зваротам да дакументалістыкі і ўспамінаў рэальных людзей.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Адамович, А. Блокадная книга / А. Адамович, Д. Гранин. – Минск : Маст. літ., 2015. – 575 с.

2. Адамовіч, А. Хатынская аповесць. Публіцыстыка / А. Адамовіч. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 237 с.

3. История литературы как вызов теории литературы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://studopedia.ru/3_193582_istoriya-literaturi-kak-vizov-teorii-literaturi.html. – Дата доступа: 16.09.2017.

4. Словарь литературоведческих терминов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: slovar.lib.ru/dictionary/proizvedenije.htm. – Дата доступа: 16.09.2017.

Vyacheslav Smal (Brest)

NATIONAL LITERARY AND PUBLIC DISCOURSE: BEGINNIGS, SPECIFICATIONS, TRADITIONS

Keywords: author's modality, subjectivity, intersubjectivity, the strategy of the author and the reader's expectations, reception, discursive strategies, publicist discurs.

Summary. The given article considers the particular characteristics of publicistic discourse of the end of the XX century in the national literature. The dependance of the ideological and artistic content of publications, the place of literary publicism in the Belarusian literary tradition is regarded. The literary text is interpreted through the prism of the problem of reception, is analyzed as a product of the relationship between the author and the addressee, a feature of publicistic discourse in the structure of literary texts is defermined.

К содержанию

УДК 82 (091)

Вяч.М. Смаль (Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна)

ПРАБЛЕМА РЭЦЭПЦЫІ ТЭМЫ РЭПРЭСІЙ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Ключавыя словы: рэцэпцыя, дыскурсіўныя стратэгіі, публіцыстычны дыскурс.

Анатацыя. У артыкуле аналізуюцца дыскурсіўныя стратэгіі твораў беларускага пісьменніка С. Грахоўскага, у якіх у мастацкім і публіцыстычным планах асэнсавана тэма рэпрэсій.

У сучаснай культурнай прасторы выразна праявілася трансфармацыя топікі духоўнага, свет асабістага, інтымнага, душэўнага зліўся з грамадскім светам. Масавасць набылі раней адзінкавыя ідэі экзістэнцыйнай тугі, пакінутасці, адзіноты, трансцэндэнтнай памежнасці жыцця. Чалавек сучаснага грамадства перастаў адчуваць сябе абароненым у соцыуме, і грамадскае, нацыянальнае стала варожым для яго. Публічнае ў акалічнасцях новай культуры ўваходзіць у інтымную сферу (чалавека могуць знайсці ў любую хвіліну па тэлефоне, ён публічна выказвае свае пачуцці ў перыядычным друку, на тэлебачанні, у інтэрнэце), пачынае яе руйнаваць, а поспехамі ў прафесійнай, грамадскай сферах чалавек усё часцей спрабуе кампенсаваць разлад з самім сабою, імкнецца збегчы ад цяжару душэўных перажыванняў, сублімiравацца. У такіх умовах публіцыстычны дыскурс канца XX ст. становіцца своеасаблівым камертонам, які дапамагае настроіць парадыгму пачуццяў чытацкай аўдыторыі.

Ключавыя змены культурнай прасторы нашага грамадства напрыканцы XX ст. супалі з ростам цікавасці айчынных мастакоў слова да вострых грамадскіх праблем (Чарнобыльская трагедыя, Афганская вайна, сталінскія рэпрэсіі, старажытная гісторыя Беларусі, трансфармацыя спрадвечных маральных канонаў і інш.), што было звязана з паваротам мастацкіх арыенціраў да чытацкай асобы, якая патрабавала пераасэнсавання заданых ранейшымі мастацкімі тэкстамі культурна-гістарычных арыенціраў, сацыякультурных каштоўнасцяў, пошуку новых маральна-духоўных і эстэтычных ацэнак рэчаіснасці і адпаведных форм іх выражэння (споведзь, эсэ, дакументальная публіцыстыка і інш). У выніку ў нацыянальным слоўным мастацтве пачала фарміравацца новая агульная парадыгма рэцэпцыі і рэпрэзентацыі мастацкага твора ў прасторы “адноўленай” нацыянальнай культуры, ажывіўся дыскурс беларускіх пісьменнікаў як са

сваімі замежнымі калегамі, так і творамі сваіх папярэднікаў. Яркай рысай гэтага дыскурсу стала пашырэнне элементаў інтэртэкстуальнасці (цытаты, алюзіі, рэмінісцэнцыі, спасылкі на раней невядомыя архіўныя матэрыялы).

Важныя вектары дыскурсіўна-сэнсавай арганізацыі мастацкіх тэкстаў былі раскрыты “рэпрэсаванай” дакументалістыкай рускіх пісьменнікаў (Л.М. Гумілёў, С.А. Снегаў, А.М. Гары, Л.Я. Драбкіна, Д.М. Кугульцінаў, С.І. Шчаглоў, М.У. Супруненка, Р.С. Клімовіч, Ю.К. Таркоўскі і інш.), якія ўзнавілі аб’ектыўную карціну сталінскіх рэпрэсій, дакументальна дакладна адлюстравалі вонкавы план трагедыі (умовы, быт, прычыны гібелі асуджаных людзей). Асобныя пісьменнікі (В.Ц. Шаламаў, Р.М. Уладзімаў) сцвярджалі, што сталінскія лагеры рабілі з чалавека істоту, бесчалавечную жывёлу, культывавалі боязь і непаўнавартаснасць. Іншыя (А.І. Салжаніцын, А.Н. Рыбакоў) пераконвалі, што ў асобных выпадках лагернае жыццё было станоўчым, узвышала чалавека, дазваляла праявіцца лепшым яго якасцям.

Беларускія пісьменнікі канца XX ст. адлюстравалі маштаб дзяржаўнага тэрору, генацыд, духоўную веліч ахвяр, паказалі, што невыносныя кліматычныя ўмовы, голад і холад, лагерныя правілы, непасільная праца, паўсядзённая знявага не фарміравалі ў людзях амаральнасць, не гасілі дабро і не культывавалі зло. Найчасцей у складаных абставінах гіпертрафіравана праяўлялася тое, што было назапашана раней, сядзела глыбока ў душы і характары канкрэтнай асобы. Творчасць беларускіх пісьменнікаў паказала, што ў кожнай ахвяры сталінскага часу арганічна праяўляўся глыбокі ўнутраны свет, захоўваліся маральныя арыенціры, чалавечнасць і міласэрнасць, вера і надзея. Пры ўсім гэтым беларускімі мастакамі быў адзначаны нацыянальны аспект сталінскіх рэпрэсій, якія скіроўваліся супраць найбольш актыўнага насельніцтва, навуковай і пісьменніцкай інтэлігенцыі, моладзі, кіраўніцтва рэспублікі. І калі беларускім грамадствам, і ў тым ліку крытыкай, гэтыя тэксты былі ўспрыняты адпаведна, то ў расійскай чытацкай аўдыторыі праявіліся дыафанічныя дыскурсіўныя стратэгіі.

У дадзеным выпадку характар прачытання “рэпрэсаванай” прозы вызначаўся не самім тэкстам або творчымі здольнасцямі рэцыпіентаў, а іх этнапсіхалагічнымі асаблівацямі, грамадскімі кантэкстамі, нацыянальна-гістарычнымі праекцыямі і ўласнымі меркаваннямі і асацыяцыямі, сфарміраванымі сучаснымі нацыянальнымі СМІ. У гэтым плане паказальным з’яўляецца той факт, што ў апошнія дзесяцігоддзі ў расійскім грамадстве ўзмацняецца настальгія па сталінскім часе. Расійскім ваенна-гістарычным аб’яднаннем былі адкрыты дзясяткі музеяў, помнікаў і бюстаў Сталіну. Расійскім грамадствам аднаўляецца міф пра супердзяржаву, у якой панаваў лад, стабільнасць, эфектыўная эканоміка, пра неабходнасць

кіраўніка тыранічнага складу. Апытанне 1,6 тысячы рэспандэнтаў з 48 рэгіёнаў Расіі, праведзенае ў 2016 г. сацыялагічнай арганізацыяй “Левада-цэнтр” [3], паказала, што 34 % расіян ухваляе палітыку Сталіна, лічыць яго суровым, але неабходным для краіны кіраўніком. Была адзначана дынаміка грамадскай думкі: калі ў 2007 г. да асобы Сталіна адмоўна ставілася 29 % рэспандэнтаў, то ў 2016 г. ужо толькі 21 % апрошаных палічыў Сталіна “бесчалавечым тыранам”. У апошнія гады ў Расіі з’явіўся шэраг лжэгісторыкаў, якія маніпулятыўна скажаюць гістарычную праўду аб сталінскіх рэпрэсіях. Так, Я. Рачынскі, карыстаючыся прымітыўнымі рытарычнымі прыёмамі, зазначае: “Асуджаючы злачынства Сталіна, сённяшняе кіраўніцтва краіны аднаўляе многія механізмы сталінскай палітыкі” [1]. І нават умоўна прымаючы рэпрэсіі, асобныя “недагісторыкі” спрабуюць “адбяліць” імя Сталіна, зменшыць маштаб рэпрэсій або знайсці аргументы ў іх апраўданне. Напрыклад, навуковы супрацоўнік Інстытута расійскай гісторыі РАН Ю. Жукаў падкрэслівае: “Масавыя рэпрэсіі 1937–1938 гг. арганізаваў не Сталін, іх арганізавалі першыя сакратары, каб утрымацца пры ўладзе і не даць Сталіну правесці выбары на альтэрнатыўнай аснове, пры якіх яны б згубілі свае месцы. Яшчэ напрыканцы 30-х гг. народ называў гэтыя рэпрэсіі “яжоўшчынай”, выразна аддзяляючы таго, хто практычна займаўся гэтымі справамі” [4]. Палемізуючы з гістарычнымі фактамі, сучасны “публіцыст” Леа Сільвіа ў артыкуле “Ворагі народа і ахвяры рэпрэсій” сцвярджае: “Ворагі народа – гэта не ахвяры рэпрэсій, а справядліва асуджаныя і пакараныя” [1].

У многіх расійскіх аўтараў “рэпрэсаванай” прозы (А. Жыгуліна, У. Шаламава, Р. Уладзімава, А. Рыбакова, А. Салжаніцына і інш.) у большай ці меншай ступені можна знайсці апраўданне сталіншчыны, утапічны міф пра неабходнасць моцнай улады, якая культывуе ў людзей страх. Беларускія пісьменнікі (Янка Брыль, Л. Геніюш, С. Грахоўскі, Б. Мікуліч, А. Пальчэўскі і інш.), якія не маглі не ведаць творчасць сваіх расійскіх калег, суб’ектыўна перапрацоўвалі матывы, вобразы, сюжэты, аднаўляючы дыскурсіўную самарэцэпцыю, улічваючы нацыянальнага адрасата-рэцыпіента, узбагачаючы агульны дыскурс канца XX ст.

Важнымі для беларускіх аўтараў “рэпрэсаваных” тэкстаў з’яўляецца не проста аб’ектыўная перадача падзей і іх фіксацыя з улікам успрыняцця тэксту, адэкватнага прачытання і прыняцця яго чытачамі, але і яго глыбокае асэнсаванне, у выніку якога рэцыпіент змог бы ажыццявіць удумлівы дыялог, дыскурс з аўтарам, мог стаць актыўным сумоўцам.

Падобнае “правакаванне” палемічным зместам, фактамі і пытаннямі не столькі сваёй, колькі чытацкай прысутнасці ў тэксце, аўтарскі дазвол на мноства меркаванняў, пазіцый, пунктаў гледжання, дыскусій характэр-

ны для творчасці С. Грахоўскага, які сам прайшоў жудасныя выпрабаванні 1930–1940-х гг. У аповесці “Зона маўчання” пісьменнік задаецца рытарычнымі пытаннямі: “За што? Навошта? Каму гэта трэба?” [2, с. 72]; “Хто ж вінаваты ў гэтай бядзе? Хто давёў жанчыну да канібалізму, да страты памяці, да такога падзення? На Украіне, у Паволжы ў 1932–1933 гг. памерла ад голаду каля дзесяці мільёнаў няшчасных, дзяржава ў той жа неўрадлівы год прадала за мяжу дванаццаць мільёнаў цэнтнераў збожжа, а дарожкі елі сваіх дзяцей” [2, с. 183]. І нягледзячы на тое, што аповесць С. Грахоўскага не давала прамых адказаў на цэнтральныя пытанні, яна была станоўча ўспрынята крытыкай, атрымала характарыстыку “рэзка, адкрыта, паслядоўна” (Л. Гарэлік). Зразумела, шмат хто не мог пагадзіцца з адлюстраваным маштабам трагедыі, з перадачай жудаснага быту, апісаннем духоўнай прыгажосці і высакародных пачуццяў вязняў. Аднак ці было для аўтара галоўным прызнанне праўдзівасці пэўных дэталей? На працягу ўсяго твора пісьменнік акцэнтуе ўвагу на іншым: ён паказвае глыбокую выратавальную і ачышчальную сілу мастацтва, як людзі ў няволі маральна ўздымаліся пасля самадзейных канцэртаў, гісторый і вершаў, расказаных таленавітымі апавядальнікамі.

У аповесці “Зона маўчання” пісьменнік асэнсоўваў псіхалогію выжывання чалавека ў нялюдскіх умовах, імкнуўся вывесці чытача на развагі пра тое, што ратавала, давала сілы ахвярнікам: хітрасць, знаходлівасць, калектывізм, вера. “Лагернікі жылі тым, што ў нешта верылі, суцяшалі адзін аднаго хуткімі амністыямі, прыдумлялі неіснуючыя камісіі па пераглядзе спраў. Гэтыя чуткі падтрымлівалі веру і дух знясіленых і змардаваных” [2, с. 221]. А ці не галоўным для мастака слова было духоўна ачысціць чытачоў сваім творам, сфарміраваць пэўную сістэму ўспрыняцця трагедыі рэпрэсій?

С. Грахоўскі не проста адлюстроўвае закранутую праблему, а хутчэй вывучае яе, аналізуе яе сацыяльныя аспекты, шукае адказы на важныя сацыяльна-палітычныя пытанні, дзеліцца з чытачамі сваімі разважаннямі, аналізуе прычыны падзей і прагназуе сацыяльныя наступствы. Пазіцыя аўтара, па сутнасці, уяўляе сабой суб’ектыўную ацэнку падзей. Суб’ектыўнасць рухаецца ад сацыяльнага да прыватнага, спалучае ў адзінае цэлае чытацкае ўспрыманне з аўтарскай задумай, ствараючы, такім чынам, інтэрсуб’ектыўную прастору дыскурсу. Аўтар шукае ісціну, аднак не здольны пазбавіцца ад уплыву сацыяльных умоў. “Дзе ж тая праўда? Ці была яна, ці ёсць? Гэтыя пытанні б’юць і б’юць у мазгі, выкручваюць душу, ні ўдзень, ні ўначы не даюць спакою” [2, с. 16]. Разам з тым аўтар не толькі даносіць інфармацыю, але і імкнецца сфарміраваць пэўную пазіцыю ў чытачоў.

Аналізуючы складаныя першапрычыны тэрору, наступствы рэпрэсій для лёсаў іх удзельнікаў, пісьменнік не дае прамых адказаў, цураецца катэгарычных і безапеляцыйных меркаванняў, санкцыянуе дыскурсіўнае прачытанне тэксту рэцыпіентамі. Сярод членаў рэпрэсіўных органаў былі выпадкова трапіўшыя ў сістэму ГУЛАГ вайскоўцы і шукальнікі матэрыяльных выгод, былі “сумленныя людзі, якіх зацягнула ў сваё жэрла страшэнная машына тэрору, зрабіла ўдзельнікамі крывавых злачынстваў” [2, с. 209]; былі і тыя, якія “жывуць і ганарацца, што служылі ў органах, стаялі на варце “дзяржаўнага спакою і бяспекі” [2, с. 209]; былі і самі рэпрэсаваныя, “а некаторыя начальнікі з былых нявольнікаў, каб утрымацца на службе, станавіліся асабліва лютымі і няўмольнымі” [2, с. 195].

Пісьменнік палемізуе з распаўсюджаным меркаваннем пра рэпрэсіі як нацыянальны генацыд аднаго народа. Ён сведчыць, што сярод ахвяр сталінскага тэрору былі людзі з самых розных куточкаў савецкай дзяржавы, прадстаўнікі розных рэлігій і нацыянальнасцей: ленінградскія блакаднікі, ровенскія баптысты, крымскія грэкі, паволжскія сяляне і інш. “Колькі іх прыбывала на маёй памяці! Вялікія і малыя, грузінскія і малдаўскія, польскія і ўкраінскія, беларускія і маскоўскія, вайсковыя і цывільныя знікалі, як дым, як снег пад дажджом. Прыходзілі сваімі нагамі – вывозілі патаемна начамі шкілеты былых вучоных, чыгуначнікаў, ветэрынараў, паэтаў, карабелаў, непісьменных, у зрэбніках, «тракцыстаў», жонак «ворагаў народа»” [2, с. 170].

Гістарычна дакладна, дэталёва пісьменнік адлюстраваў храналогію рэпрэсій у Беларусі: злачынную дзейнасць “паслухмяных служак крывавага рэжыму” [2, с. 55] – органаў унутраных спраў у сумнавядомай мінскай “амерыканцы”, справы супраць выкладчыкаў Беларускага ўніверсітэта, Віцебскага і Магілёўскага педінстытутаў. Многія з апісаных мастаком падзей маюць прывязку да канкрэтных гістарычных фактаў: “Галодных жанок за жменьку каласкоў па ўказе ад 7 жніўня 1932 г. здавала на дзесяць гадоў, а іх дзетак выпраўляла жабраваць” [2, с. 163]; “З лета 1937 года ў турмы пайшлі чыгуначнікі, ад начальнікаў дарог да машыністаў і стрэлачнікаў” [2, с. 81]; “Каб трохі супакоіць народ і неяк апраўдаць свае злачынствы, у 1939 годзе даволі глуха загаварылі аб «перагібах у рабоце Наркамата ўнутраных спраў»” [2, с. 92]; “Пасля вызваленчага паходу Чырвонай Арміі на захад 1939 года наш лагер стаў інтэрнацыянальным. Увосень прыбыў этап з Польшчы” [2, с. 119]; “На пачатку 1942 года пайшлі этап за этапам мужчыны ў шынялях, без папруг і пятліц” [2, с. 173]; “Зімою 1942 года Берыя выдаў загад: нявыхад на работу без уважлівых прычын з’яляецца контррэвалюцыйным сабатажам” [2, с. 142].

Нягледзячы на тое, што любы мастацкі тэкст своеасабліва “закрывае” чытача ў сябе, сваіх схаваных, патаемных сэнсах, мастацка-

публіцыстычны тэкст С. Грахоўскага адрыты чытачам, акцэнтуе ўвагу рэцыпіентаў на зразумелай праблеме, выразна выражанай аўтарскай пазіцыі. У публіцыстычным дыскурсе С. Грахоўскага важнае месца займае даследаванне не толькі лёсу канкрэтных людзей (мастак аднавіў некаторыя факты з жыцця В. Шашалевіча, П. Галавача, Б. Мікуліча, У. Хадыкі, С. Баранавых, Р. Бярозкіна, І. Замоціна, М. Зарэцкага, Ц. Гартнага і інш.), а найперш прачытанне псіхалогіі выканаўцаў масавых рэпрэсій і іх ахвяр. Пісьменнік даводзіў, што рэпрэсіі – гэта бесчалавечныя здзекі адных і безвыходнасць іншых. На думку мастака, адных рэпрэсіі расплюшчылі, зламалі, дэмаралізавалі, знішчылі сістэму маральных арыенціраў, іншых – загартавалі, перайначылі і нават духоўна ўзвысілі: “«Перавыхаванне» ў лагеры мне расплюшчыла вочы, вучыла самастойна думаць, сумнявацца, пратэставаць у душы, але зацята маўчаць” [2, с. 173].

У аповесці “Зона маўчання” пісьменнікам адлюстравана страшэнная карціна духоўных і фізічных здзекаў: абраза, крыўда, прымус, фізічны гвалт, даносы, пабоі, якія не абміналі нават старых, цяжарных і дзяцей. Аўтар падводзіць чытачоў да разваг пра нацыянальныя рысы беларусаў, пра тое, як актыўным, нескароным, з абвостраным пачуццём годнасці беларусам штучна прышчэплівалася псіхалогія пакорнасці, ціхмянасці, памяркоўнасці: ва ўмовах рэпрэсій мільёны людзей “страцілі свае прозвішчы, забываліся абліччы бацькоў і мацярок, баяліся прызнацца, чые яны і адкуль. Так выхоўваўся страх і комплекс непаўнацэннасці” [2, с. 164].

У цэнтры дыскурсіўна-сэнсавага модусу С. Грахоўскага суб’ектыўныя ўяўленні аб свеце, у якіх пераплятліся розныя постмадэрнісцкія інварыянты карціны свету: і бытавыя замалёўкі, і філасофска-экзістэнцыйныя развагі, і лірыка-паэтычныя адступленні, і навуковыя дадзеныя аб хваробах, раслінах і патэнцыяле чалавечага арганізму. Аўтар прапануе чытачам самім вызначыць асноўныя вектары мастацкага тэксту: рэпрэсіі як апарат бескаштоўнай працоўнай сілы; рэпрэсіі як знішчэнне людзей, што не прымаюць сістэму; рэпрэсіі як неабходнае звяно станаўлення маладой дзяржавы; рэпрэсіі як машына матэрыяльнага рабавання і інш.

С. Грахоўскаму належыць прыкметнае месца ва ўзбагачэнні сучаснай культурнай матрыцы тэкстамі рэпрэсаванай дакументальнай публіцыстыкі. Ва ўмовах зніжэння напрыканцы XX ст. агульнага даверу грамадства да СМІ пісьменнік спрабаваў не толькі данесці інфармацыю пра нераскрытыя старонкі гісторыі, а найперш наладзіць кантакт з чытацкай аўдыторыяй, сфарміраваць у яе адказную грамадскую пазіцыю, сацыяльную свядомасць. У тагачасных варунках знікнення афіцыйнага, дадзенага “зверху” сцэнарыя інтэрпрэтацыі “рэпрэсаванай” прозы і трансфармацыі замацаваных стэрэатыпаў “чытацкага чакання”, зададзеных папярэднімі

творамі гэтай тэматыкі, творчасць С. Грахоўскага абумовіла ажыўленне разнапланавых рэцэптыўных стратэгій, інтэрпрэтацый мастацка-публіцыстычнага тэксту.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Враги народа и жертвы репрессий [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.chitalnya.ru/work/1591910/. – Дата доступа: 03.03.2017.

2. Грахоўскі, С.І. Зона маўчання : аповесць / С.І. Грахоўскі. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 238 с.

3. Россияне все лучше относятся к Сталину, но жить при нем не хотели бы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.levada.ru/2016/03/25/rossiyane-vse-luchshe-otnosyatsya-k-stalinu-no-zhit-pri-nem-ne-hoteli-by/. – Дата доступа: 03.03.2017.

4. Сталин и репрессии: меняется ли оценка общества и власти? [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://inforu.news/2016/03/11/stalin-i-repressii-menyaetsya-li-ocenka-obshhestva-i-vlasti. – Дата доступа: 03.03.2017.

Vyacheslav Smal (Brest)

THE PROBLEM OF THE REPRESSION TOPIC RECEPTION IN MODERN BELARUSIAN LITERATURE

Keywords: reception, discursive strategies, publicistic discourse**.**

Summary. The article deals with the discursive strategies of the works of Belarusian writer S. Grahovski, in which the problem of repressions is presented through artistic and publicist means.

К содержанию

УДК 316.3

